№ 6 (460) 10 лютага 2006 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы



## Давер Эўропы

Дыпляматычны наступ беларускай апазыцыі вачыма сусьветнай прэсы: Свабодная Беларусь займела твар і голас у Эўропе. Старонка 17.

## Спроба сілаў 2 сакавіка

Штаб А.Мілінкевіча на паседжаньні ў сераду ўхваліў графік сустрэчаў лідэра дэмакратычных сілаў на пэрыяд пасьля яго рэгістрацыі кандыдатам у прэзыдэнты. З апошняй дэкады лютага ён зноў будзе езьдзіць па Беларусі. Першыя гарады, куды ён мае накіравацца — Магілёў, Бабруйск, Горкі, Асіповічы.

А на 2 сакавіка штаб заплянаваў першую сустрэчу Аляксандра Мілінкевіча з выбаршчыкамі ў Менску. Яна мае адбыцца на плошчы Свабоды а 18-й гадзіне. Нагадаем, што 2 і 3 сакавіка ў Палацы Рэспублікі, што знаходзіцца ў 100 мэтрах ад плошчы Свабоды, будзе праходзіць трэці «ўсебеларускі народны сход». На ім з выбаршчыкамі сустрэнецца А.Лукашэнка.

## У НУМАРЫ

**Аршанскія нявольнікі ў Расеі**

Паехаў працаваць — стаў рабом у Калмыкіі. **Старонка 8.**

**Пытаньне з АЭС вырашана**

Коштам 2,5 мільярды, калі расейская, 5 мільярдаў, калі француская, яна пакрые чвэрць патрэбаў краіны ў энэргіі. **Старонка 6.**

**«Рок-каранацыя» вяртаецца**

28 лютага, пасьля двухгадовага перапынку. **Старонка 34.**

**Роздум інквізытара на руінах Акудовіча**

Філёзаф Пётра Рудкоўскі ОП адказаў на самы шумны мэтафізычны трактат 1990-х — «Мяне няма». **Старонка 42.**

## Замяталін зноў запатрабаваны

ў штабе Лукашэнкі. **Старонка 4.**

## КАЛІ Б...

...ЦВК змагаўся з карупцыяй. **Старонка 47.**



**Старонка 14.**

## Маці палітвязьняў



## Аловак запаволенага дзеяньня

Гісторыя з дацкімі карыкатурамі настолькі заблытаная, што, каб не заблытацца яшчэ больш, трэба адшукаць пачатак ніткі. Пачалося ўсё зь дзіцячай кніжкі. Корэ Блютген — самы пасьпяховы дзіцячы пісьменьнік Даніі. Народы так званага «трэцяга сьвету» — ягоная слабасьць… Піша Алесь Кудрыцкі з Бэрліна. **Старонка 19.**



# У нумары

## факты і камэнтары

Замяталін ізноў запатрабаваны ... 4
Казулін у «Обозревателе»: «Як навуковец, я цікаўлюся астралёгіяй» ... 4
«Наш стратэгічны плян — самазахавацца» ... 5
Вольга Іпатава: Хай гэта будзе на сумленьні Казуліна ... 5
Статкевіч: ня варта распыляць сілы па ўчастках ... 6
Дзяржкантроль: 10 570 прыцягнутых да адказнасьці за 2005-ты ... 6
Пытаньне з АЭС вырашана ... 6
У Менску паболее «ягуараў» і «лэндровэраў» 6
Стары, у прынцыпе, дзяркач ... 6
Златка, луста і хадун ... 7
Lingva-by: макарона бяз плушчу ... 7
Папаўненьне ў саборы ... 36

## пішуць чытачы

Народны блог 19 ... 8
Аршанскія нявольнікі ў Расеі ... 8
Магілёўцы адзначылі ўгодкі паўстаньня ... 8
Цяжкая спадчына Рэчы Паспалітай ... 26
Пошта Рэдакцыі ... 26
Андрэй Павач. Ар'ергард імпэрыі ... 27

## хроніка

У турму за графіці ... 11
Сьціслая хроніка рэпрэсій і супрацiву ... 12
Маці палітвязьняў ... 14
БРСМ — гэта БЛСМ ... 16

## мы самі

Шукаем падпісчыкаў «НН»!!! ... 10
Падзякі ахвярадаўцам ... 10

## з усіх старон

Свабодная Беларусь займела твар і голас ... 17
Аловак запаволенага дзеяньня ... 19

## культура

Падарожжа ў мінуўшчыну 30
«За Беларусь» ... 32
Насустрач сонцу ... 33
«Рок-каранацыя» вяртаецца ... 34
Хто першы, той лепшы ... 35
«Песьні свабоды» выйдуць за месяц да выбараў ... 43

## аўтарскія рубрыкі

Павал Севярынец. Лісты зь лесу: Лёгіка з чырвонай пэнтаграмай ... 12
Аляксандар Класкоўскі. Палітычная кухня: Іваноў заўжды гатоў ... 24
Лёлік Ушкін. Левым вокам: Бінга. Бінга. Бінга ... 25
Віталь Тарас. Іншымі словамі: Унукі ХХ зьезду 28

## стыль жыцьця

Капыткі ... 37
У Турын без «турыстаў» .. 45

## літаратура

Сяргей Харэўскі. Мэлядраматычны сэрыял, шпіёнскі раман і фільм жахаў ... 38
Сяргей Вітушка. Я грамадзянін Вялікага Княства Любові ... 39
Ева Вежнавец. Шлях дробнай сволачы ... 40
Пётра Рудкоўскі. Роздум інквізытара на руінах Акудовіча ... 42
Газэтка дзеткам: Сеў дракончык ... 43

## калі б...

Вясёлыя карцінкі ... 47

## АД РЭДАКЦЫІ

# Карані і мэта праекту "Казулін"

Палітычная рада Аб'яднаных дэмакратычных сілаў вырашыла спыніць перамовы з Казуліным. Адбылося гэта толькі 8 лютага, за 40 дзён да выбараў, хоць незалежная экспэртная супольнасьць даўно папярэджвала, што праект "Казулін" можа быць сьвядомым ашуканствам дэмакратычнага электарату. Прабірачным праектам, які мае на мэце пасеяць разгубленасьць і нявер'е.

Хто такі Казулін на самой справе і чаму да яго на шыю вешаецца частка беларускай інтэлігенцыі?

**Працяг на старонцы 26.**

# Дзякуй, фраў Мэркель!

Калі візыт Мілінкевіча ў Літву ды Польшчу можна было прадказаць, дык прарыў у Брусэль, Парыж і тым больш у Бэрлін — сапраўдная сэнсацыя. Нельга ўявіць сабе, каб Шродэр прымаў у сваім кабінэце палітыка, няўгоднага ягонаму «сябру Ўладзімеру». У адрозьненьне ад былога канцлера-«заходніка», Ангела Мэркель ня мае сантымэнтаў да трубаў. Яна вырасла ў ГДР, і сытуацыю ў Беларусі разумее без дадатковых тлумачэньняў. Тым цяжэй яе падмануць беларускаму рэжыму.

**Працяг на старонцы 26.**

# Калі хто мае знаёмых

якія раней чыталі незалежныя газэты, а цяпер ня маюць доступу да іх, калі ласка, раскажэце ім пра магчымасьць чытаць «Нашу Ніву», пра тое, як яна даходзіць, і дайце ім пабачыць газэту. Важна, каб шэрагі чытачоў расьлі.

**Каб гарантавана атрымліваць «Нашу Ніву»**

проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 9**.




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Што ні тыдзень, то новы палітвязень. 1 лютага быў арыштаваны Артур Фінькевіч. За надпіс на плоце "Мы хочам новага" яму пагражае турэмнае зьняволеньне. Цяпер ён на Валадарцы, і чакае суду. 8 лютага яму споўніўся 21 год. Сябры прынесьлі торт, падпісалі паштоўкі ды хацелі перадаць у камэру. У прыёмніку-разьмеркавальніку падарункі не прынялі, спаслаўшыся на санітарныя нормы. Падрабязнасьці — на старонцы 15.**

# Замяталін зноў запатрабаваны

Палкоўнік Уладзімер Замяталін цяпер працуе намесьнікам Віктара Шэймана — кіраўніка перадвыбарчага штабу А.Лукашэнкі. Такую інфармацыю «НН» атрымала адначасова з розных крыніцаў.

Прэс-сакратар штабу Лукашэнкі Зьміцер Косьцін пацьвердзіў, што Замяталін зьяўляецца ў штабе: «Ён прыходзіў, зь ім праводзіліся кансультацыі на прадмет таго, ці згодны ён працаваць. Аднак у яго няма працоўнага кабінэту, тэлефона. У зьвязку з гэтым я не магу пацьвердзіць, што ён працуе ў штабе».

Іншыя крыніцы кажуць, што працоўны кабінэт у Замяталіна ёсьць. І што ён — намесьнік Шэймана, адказны ў штабе за ідэалягічны кірунак. І што начальнік ізноў паклікаў яго яшчэ два месяцы таму.

У 1994 г. Замяталін працаваў у штабе Вячаслава Кебіча, з 1995-га па 2001-шы — пры Лукашэнку. Быў віцэ-прэм'ерам, першым намесьнікам кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта. Але 12 верасьня 2001 г., на трэці дзень пасьля прэзыдэнцкіх выбараў, быў зьняты з гэтай пасады. Пэўны час ён жыў у Маскве. І вось — чарговае вяртаньне. Што азначае яно?

Палітаглядальнік Андрэй Суздальцаў лічыць, што Замяталін — непераўзыдзены паліттэхноляг, вельмі прафэсійны, прычым «не навучаны, а таленавіты»: «Ён можа раскруціць усё — ад сельскагаспадарчай выставы да кандыдата ў прэзыдэнты. Ён зробіць гэта цынічна, ня лічачыся з рэпутацыяй і этыкай. Ён у 1996-м вынайшаў тэрмін «народны прэзыдэнт», яго праца дапамагла Лукашэнку абыграць усіх падчас лістападаўскага крызісу-96. Улада ўпершыню вымушана «купляць» прэзыдэнцкую кампанію, яна апэруе вонкавым рэсурсам — газам, сама кампанія ідзе няроўна. 2 млн подпісаў — сьведчаньне таго самага. Замяталін рыхтуе мабілізацыю народных масаў, старт якой будзе дадзены ўсебеларускім народным сходам, дзе будзе адбывацца перадача ўлады народам свайму прэзыдэнту. Вось гэты трыптых «прэзыдэнт—народ—дзяржава», стварэньне такога тыпу божышча, адзінага ў трох абліччах, — пэрсанальная справа Замяталіна». Улада ператвараецца ў рэлігію, і Замяталін тут незаменны піяршчык, мяркуе А.Суздальцаў.

**Зьміцер Дрыгайла**

# Казулін у «Обозревателе»: «Як навуковец, я цікаўлюся астралёгіяй»

Блізкая да лукашэнкаўцаў газэта «Обозреватель» надрукавала паласныя інтэрвію з «патэнцыйнымі кандыдатамі ў прэзыдэнты» Сяргеем Гайдукевічам і Аляксандрам Казуліным.

С.Гайдукевіч прафэсійна хваліць Лукашэнку і ганіць аб'яднаную апазыцыю. Ён прызнае, што прэзыдэнтам у 2006 годзе ён «ня стане», але сьцьвярджае, што «зарабіў права на парлямэнцкую трыбуну».

А.Казулін, у сваю чаргу, выражае гатоўнасьць «выступіць з дакладам на Ўсебеларускім народным сходзе». Таксама ён паведамляе, што ў выпадку абраньня прэзыдэнтам яго другі дэкрэт будзе пра тое, што «партрэты першага прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі могуць заставацца там, дзе яны сёньня вісяць».

Меркаваньне А.Казуліна пра А.Мілінкевіча, зь якім ён вядзе перамовы пра каардынацыю на выбарах: «ён выдаваў гранты» і «зьяўляецца вылучэнцам Партыі БНФ». Кажа: «Я лічу: тыя, хто змагаецца з рэжымам, насамрэч вельмі няблага зь ім зжыліся». І нарэшце: «Я супраць любога, нават супэрпразаходняга сцэнару, які нам навязваецца».

Журналістка «Обозревателя» спасылаецца на «дасьледаваньні астроляга», што друкаваліся ў мінулым нумары газэты, паводле якіх Казуліну «першага месца не відаць». Вось што на гэта адказвае А.Казулін:

«Што датычыць астралягічных прагнозаў, то я як навуковец сам цікаўлюся астралёгіяй і падтрымліваю сяброўскія адносіны з буйнымі спэцыялістамі ў гэтай галіне ведаў. Магу адзначыць, што сп.Лукашэнка карыстаецца паслугамі граматных астролягаў. І даты 9.09.2001 і 19.03.2006, нягледзячы на вонкавую нелягічнасьць іх прызначэньняў, спрыяльныя для яго». Але А.Казулін прадракае А.Лукашэнку праблемы падчас наступнага тэрміну, у выніку чаго той «абавязаны будзе кардынальна зьмяніць свае падыходы і знайсьці новых саюзьнікаў».

Газэта «Обозреватель» выдаецца бізнэсоўцам Сяргеем Атрошчанкам. У свой час хадзілі чуткі, што яна была створаная з згоды Рады бесьпякі.

**Яўген Васілеўскі**




**У чыіх руках сініцы Казуліна і Гайдукевіча?**

# «Наш стратэгічны плян — самазахавацца»

Аляксандар Казулін адкінуў прапановы Мілінкевіча.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Спадзевы на тое, што А.Казулін далучыцца да адзінага кандыдата ад дэмакратычных сілаў да рэгістрацыі прэтэндэнтаў Цэнтарвыбаркамам, ляснулі.

4 лютага Аляксандар Мілінкевіч прапанаваў А.Казуліну вырашыць пытаньне пра ўдзел у выбарчай кампаніі аднаго дэмкандыдата па пяці крытэрах:

— колькасны склад ініцыятыўнай групы;

— колькасьць сабраных подпісаў;

— колькасьць партыяў і грамадзкіх арганізацыяў, якія падтрымалі прэтэндэнта (шырыня кааліцыі);

— рэйтынг паводле дасьледаваньняў незалежных сацыёлягаў;

— публічная міжнародная падтрымка як на Захадзе, так і на Ўсходзе.

Адказ ад А.Казуліна прыйшоў імгненна — у панядзелак, 6 лютага. Ён адкінуў прапанову Мілінкевіча. У лідэра БСДП(Г) прапанова іншая: падпісаць дамоўленасьць, паводле якой у выпадку нерэгістрацыі аднаго з двух Аляксандраў, падтрымаць другога кандыдата.

Намесьнік кіраўніка штабу А.Мілінкевіча, Віктар Карняенка ў панядзелак сустрэўся з прадстаўнікамі штабу А.Казуліна. З В.Карняенкам размаўлялі намесьнікі кіраўніка БСДП(Г) Анатоль Ляўковіч ды Аляксей Кароль, і Іван Анташкевіч (які яшчэ летась быў сябром АГП). В.Карняенка пачуў наступнае: «Наш стратэгічны плян — самазахавацца як партыі яшчэ на пяць год. А для гэтага мы абралі новага лідэра, вядзём пошук фінансаў, будзем праводзіць раскрутку партыі. У нас супольныя мэты, а ня тыя супярэчнасьці, што ляжаць у падмурку вашай праамэрыканскай кааліцыі…»

Сп.Карняенка так пракамэнтаваў вынікі сустрэчы з казулінцамі: «Гэта абуральны й хамскі адказ. Камандзе Казуліна перапіска з намі патрэбная як PR-матэрыялы. Гэтыя пляны нічога супольнага з стратэгіяй перамогі на прэзыдэнцкіх выбарах ня маюць. Таму нам тэрмінова трэба скончыць гэты «перамоўны працэс», бо гэта толькі блытае людзей, дае ім дарэмную надзею на нейкі плён перамоваў».

Амаль адначасова выйшла газэта «Обозреватель» з інтэрвію кандыдата ад сацыял-дэмакратаў, дзе ён, мякка кажучы, не па-сяброўску выказваецца на адрас А.Мілінкевіча і дэмакратычных сілаў.

У дадатак на круглым стале ў Маскве 6 лютага А.Казулін заявіў на адрас дэлегацыі Дэмакратычных сілаў і А.Мілінкевіча: «Тут увогуле няма ніводнага сур’ёзнага чалавека», а калі ў залі зьявіўся прадстаўнік Адміністрацыі Пуціна, кінуў: «Ды БНФ вас, расейцаў, увогуле лічыць акупантамі».

З увагі на такія заявы А.Казуліна і ягонай каманды штаб А.Мілінкевіча 8 лютага прыняў рашэньне, што далейшыя размовы з А.Казуліным ня маюць сэнсу.

**Зьміцер Дрыгайла**

## Вольга Іпатава: Хай гэта будзе на сумленьні Казуліна

Пісьменьніца Вольга Іпатава даслала ліст, у якім яна заяўляе, што больш не падтрымлівае А.Казуліна.

«У перадачы радыё «Свабода» «Праскі акцэнт» двойчы падкрэсьлівалася, што я — у шэрагу людзей «вакол Казуліна». Хачу ў сувязі з гэтым удакладніць сваю пазыцыю.

Я сапраўды больш за год таму падпісала, сярод іншых, зварот да народу Беларусі грамадзкага аб’яднаньня, якое ўзначаліў Аляксандар Казулін. Але ў ягоную каманду ці партыю, тым болей з часоў ягонага кандыдацтва, я не ўваходзіла і не ўваходжу.

У час Кангрэсу дэмакратычных сілаў я галасавала за Мілінкевіча і цалкам падтрымліваю ягоную плятформу, а таксама вылучэньне адзінага кандыдата.

Але пры ўсім тым я ня стала б абвяргаць словы, што прагучалі ў «Праскім акцэнце» (урэшце, А.Казулін заяўляе пра сябе як пра дэмакрата), каб не ягоныя апошнія заявы, у прыватнасьці, пра тое, што нам не падыходзяць «празаходнія рэвалюцыі» і што Лукашэнка павінен застацца «станоўчым героем».

Я лічу, што сумленных людзей ужо ў працэсе вылучэньня дэмакратычных кандыдатаў загналі ў такія абцугі, што адзіным сродкам дамагацца праўды будуць менавіта вулічныя акцыі. А што тычыць станоўчага героя — то няхай гэта застаецца на сумленьні асабіста спадара Казуліна».

## Статкевіч: ня варта распыляць сілы па ўчастках

У Баранавічах адбылося паседжаньне Выканаўчага бюро Цэнтральнага аргкамітэту актывістаў былое Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная грамада). Гэтыя актывісты не прызналі абраньня А.Казуліна лідэрам партыі.

На паседжаньні сябры бюро абмеркавалі тактыку дзеяньняў аб’яднанай апазыцыі з мэтай абароны вынікаў галасаваньня 19 сакавіка. Усе яны лічаць, што прапанова паклікаць выбарцаў сабрацца ў дзень выбараў не на плошчы, а каля выбарчых участкаў непрымальная. «Гэта распыліць сілы й дэмабілізуе актыўных прыхільнікаў дэмакратыі. Такая прапанова можа сьведчыць пра недахоп рашучасьці ў яе аўтараў», — сказаў старшыня аргкамітэту БСДП (НГ) Мікола Статкевіч, што адбывае зараз пакараньне на «хіміі» ў Баранавічах.

**ЯВ**

# Дзяржкантроль: 10 570 прыцягнутых да адказнасьці за 2005-ты

Летась Камітэтам дзяржкантролю было праведзена 13,5 тыс. праверак, 10 570 чалавек прыцягнулі да адказнасьці, заведзена 447 крымінальных справаў. 1776 крымінальных справаў узбудзіў Дэпартамэнт фінансавых расьследаваньняў КДК. У прыбытак дзяржаве пайшло 121,6 млрд руб.

У 2004 г. у ходзе 13 тыс. праверак КДК да адміністрацыйнай адказнасьці было прыцягнута 11 256 чалавек. Тады выявілася, што 97% правераных арганізацый працавалі з парушэньнем заканадаўства. Сёлета гэтую статыстыку вырашана не агучваць.

**Яўген Васілеўскі**

# У Менску паболее «ягуараў» і «Лэндровэраў»

Аўтахолдынг «Атлянт-М» падпісаў дылерскія кантракты на продаж і сэрвіс у Беларусі ангельскіх *Land Rover*, *Jaguar* і карэйскай *KIA*. Пра гэта «НН» паведаміў памочнік гендырэктара холдынгу Ільля Прохараў.

«Гэта іміджавы праект, бо значных аб'ёмаў продажаў у Беларусі «лэндровэраў» і «ягуараў», якія не каштуюць менш за 50 тыс. даляраў, уявіць немагчыма. Аднак на попыт мы ўсё ж разьлічваем», — сказаў Прохараў.

У сытуацыі з маркай *KIA* матывацыя іншая. Апроч таго, што «Атлянт-М» стаў першым афіцыйным партнэрам у Беларусі, кампанія перасьледуе камэрцыйныя мэты, бо цэны на *KIA* дазваляюць спадзявацца на прыбытак.

**ЯВ**

**Холдынг «Атлянт-М»** складаецца з мноства гандлёвых і сэрвіс–прадпрыемтваў — як аўтамабільных («Лібэрці мотарз», «Холпі», «Траянда»), так і іншых («Менскі транзытны банк», «Атлянт тэлекам»).

# Пытаньне з АЭС вырашана

Станцыя коштам ад 2,5 да 5 млрд даляраў пакрые чвэрць патрэбаў Беларусі ў электраэнэргіі.

Пра тое, што ў Беларусі будзе пабудавана атамная электрастанцыя, паведаміў пры канцы мінулага тыдня старшыня НАН Беларусі Міхаіл Мясьніковіч на агульным сходзе навуковых супрацоўнікаў Акадэміі. Магутнасьць АЭС складзе 2 млн кіляват, што дазволіць забясьпечыць каля 25% патрэбаў краіны ў электраэнэргіі. У эксплюатацыю АЭС будзе ўведзеная ў 2015—2020 г.

У Беларусі да 2008 г. дзейнічае маратор на будаўніцтва АЭС. Аднак пра тое, што без будаўніцтва АЭС не абысьціся, гаварылася за апошнія гады шмат разоў. Цяпер больш за 85% энэрганосьбітаў, што спажывае Беларусь, імпартуюцца з Расеі, зь іх 70% — прыродны газ, кошт якога, хто б ні перамог на прэзыдэнцкіх выбарах, будзе падвышацца. 15% энэргіі — супольныя высілкі працы 27 беларускіх электрастанцыяў агульнай магутнасьцю 7807 МВт. Паколькі ядзернае паліва ў некалькі разоў таньнейшае за арганічнае, дык з пачаткам працы АЭС сабекошт выпрацаванай энэргасыстэмай электраэнэргіі зьнізіцца на 20%, мяркуюць спэцыялісты НАН.

Вядома таксама, што калі рэактары й усё начыньне будзе расейскім ці іранскім, — дык АЭС будзе каштаваць каля 2,5 млрд даляраў, калі францускім — каля 5 млрд.

**Зьміцер Дрыгайла**

# Стары, у прынцыпе, дзяркач

На беларускай тэлевізіі зьявілася сатырычная праграма.

Вось прафэсар вучыць сабачку адключаць лямпачку, чаму нраздольны навучыцца сам (мараль: «Сыходзячы, тушыце сьвятло!»); вось шкоднік не аддае наведвальніку кнігу скаргаў. Знаёмыя й даўно забытыя інтанацыі вяртаюцца на экран.

Героі «дзеркачовай» сатыры — «асобныя недахопы» шчасьлівага й стабільнага грамадзтва: дробныя шахраі, нядбайныя гаспадары, нявветлівыя чыноўнікі.

Пяціхвілінны «Дзяркач» (дворніцкая мятла дадаецца) нагадвае нядаўна адноўлены расейскі «Фитиль».

У беларускім «Дзеркачы» рэй вядзе дэпутат палаты прадстаўнікоў, былы генэральны дырэктар Купалаўскага тэатру Генадзь Давыдзька. Зь нязмушанай лёгкасьцю есьць старонкі, высоўвае язык, застрашвае й абяцае. Абрамляе Давыдзьку музыка «Лепрыконсаў». Нягледзячы на беларускую шыльду, «Дзяркач» гучыць па-расейску.

«Дзяркач» зрабіў бы фурор на БТ гадоў 25 таму.

**Андрэй Расінскі**



**Дэпутат палаты прадстаўнікоў Генадзь Давыдзька стварыў сатырычны кіначасопіс.**

# Златка, луста і хадун

Сетка бістро «Хутка–смачна» беларусізавала назвы сваіх прадуктаў.

Як чароўныя агеньчыкі на балоце, то тут, то там узьнікаюць у нашым жыцьці астравы беларускасьці. І не бяды, калі каторы раптам згасьне — тут жа ўспыхне яшчэ колькі. Палітыку, музыку, Інтэрнэт, юрыспрудэнцыю ахоплівае беларусізацыя. Цяпер вось і пад'есьці на хапка можна па-наску.

У сетцы грамадзкага харчаваньня звыклыя сучаснаму беларусу стравы цяпер можна набыць пад беларускімі назвамі. У прыватнасьці, шапікі «Хутка-смачна» ў сваім мэню прапануюць *златку*, *лусту* і *хадун*, а таксама кілбасу «Вясковую» і «Гаспадар». Намесьнік генэральнага дырэктара кампаніі «Экспрэс-сэрвіс 91», уладальніка сеткі крамаў «Сялянскія прысмакі» і бістро «Хутка-смачна», Канстанцін Туровіч наступным чынам тлумачыць назвы страваў: «Луста — той самы бутэрброд, толькі ў нас гэта луста хлеба з салам ці паляндвіцай. Проста і па-наску. Хадун, ці хот-дог, назвалі так, бо есьці яго можна ідучы. Зьеў — і хадзі цэлы дзень!» Златка — луста белай булкі з сырам і вяндлінай, палітая маянэзам ці кетчупам. «Сялянскія прысмакі — кілбасы «Вясковая», «Гаспадар» — робяцца так, як яшчэ бабулі нашыя гатавалі, — дадае сп.Туровіч. — Усё робіцца з натуральных прадуктаў, без дамешкаў і штучных смакавых узмацняльнікаў».

Падзяліўся намесьнік дырэктара і сакрэтам высокіх смакавых якасьцяў мясных страваў: «Робім толькі са сьвежага мяса, не замарожанага, а толькі ахаладжанага. Прыгатаваная з такога мяса кілбаса ці нешта іншае доўгі час не псуецца, нават у гарачыню. Ведаю людзей, якія нашыя кілбаскі адмыслова набывалі перад ад'ездам на курорт». Апроч мяснога можна пакаштаваць салатак з буракоў, морквы і капусты.

Нядаўна з Гішпаніі прыйшло запрашэньне ад тамтэйшай асацыяцыі бістро паўдзельнічаць у ганараваньні найлепшых страўняў гэтай клясы. Бістро «Хутка-смачна» атрымала залаты прыз за найлепшыя напоі і прадукты харчаваньня.

Сёньня ў Менску дзейнічае сем крамаў «Сялянскія прысмакі». Намесьнік старшыні ТБМ Сяржук Кручкоў у гутарцы пра беларускае мэню сталічнага бістро зазначыў: «Вельмі прыемны факт. Яго нельга пакідаць без увагі і падзякі».

**Сямён Печанко**

# Lingva-by: макарона бяз плушчу

Высілкамі сяброў ТБМ пачало працу бюро перакладаў «LINGVA–BY». Яно ажыцьцяўляе пераклад на беларускую, расейскую, ангельскую, нямецкую, польскую, літоўскую мовы, а таксама са швэдзкай і францускай моў. Неўзабаве сьпіс папоўніцца чэскай мовай.

Каардынатар Сяржук Кручкоў называе прычынай стварэньня бюро частыя звароты да грамадзкага аб'яднаньня з боку айчынных і замежных вытворцаў з просьбамі перакласьці дакумэнтацыю на беларускую мову. Бюро мае шэраг асаблівасьцяў, якія адрозьніваюць яго ад іншых перакладчыцкіх кантораў. Адна зь іх — усе перакладчыкі ня толькі на прафэсійным узроўні валодаюць замежнымі мовамі, але ёсьць актыўнымі носьбітамі беларускай, што дазваляе ім рабіць прамы пераклад з/на беларускую. Гэта эканоміць час ды пазбаўляе кліентаў ад дадатковых выдаткаў.

Прыём замоваў, аплата і атрыманьне падрыхтаванага перакладу можа зьдзяйсьняцца праз Інтэрнэт. Пры гэтым стваральнікі сэрвісу падкрэсьліваюць некамэрцыйнасьць сваёй дзейнасьці. «Галоўная задача ў тым, каб максымальна пашырыць выкарыстаньне беларускай мовы сярод айчынных вытворцаў», — кажа С.Кручкоў. У праекце задзейнічаныя выпускнікі Лінгвістычнага ўнівэрсытэту, Інстытуту мовазнаўства НАН Беларусі, беларусы замежжа.

Бюро ўжо мае ў актыве сталых кліентаў. Гэта ТАА «Аквасан» — вытворца бытавой хіміі, прадстаўніцтва фірмы «Бош» у Беларусі, Беларуская чыгунка, Менскі мэтрапалітэн, францускае пасольства, фабрыка кандытарскіх вырабаў «Слодыч», Дзяржстандарт. Таксама гатовыя пераклады: праект новых беларускіх правілаў дарожнага руху, пераклад сайту *BELSYS GROUP* (міжнародныя грузаперавозкі), паштовай службы «Тэлеграф», лякалізацыя праграмы Інтэрнэт-тэлефаніі *Skype*, лякалізацыя комплексу дыстанцыйнага навучаньня Moodle, Дзяржстандарт «Тавары нехарчовыя».

Больш падрабязна пазнаёміцца зь дзейнасьцю сэрвісу можна па адрасе www.lingva-by.com. Тамсама можна знайсьці расцэнкі на паслугі.

Дзейнасьць бюро мае дысцыплінаваць як сваіх, так і замежных вытворцаў, чыя прадукцыя афармляецца па-беларуску. Застаецца чакаць, што беларускі спажывец ня будзе больш ламаць галаву над дзіўнымі інгрэдыентамі расейскай макароны «Макфа», сярод якіх ёсьць і загадкавы плушч.

**СП**

# Народны блог 19

**1 лютага ў Сеціве створаная новая ініцыятыва, прысьвечаная сакавіцкім выбарам, — Народны блог 19.**

Адміністрацыя новага рэсурсу заклікае ўсіх актыўных выбаршчыкаў прыняць удзел у абмеркаваньні перадвыбарчай сытуацыі. У рамках блогу плянуецца сутыкнуць самыя розныя меркаваньні — ад афіцыйных да радыкальна-апазыцыйных, а таксама наладзіць завочныя дэбаты паміж прэтэндэнтамі на прэзыдэнцкую пасаду. Робіцца гэта з улікам таго, што сапраўдных публічных дэбатаў ня будзе. Праект скіраваны ў першую чаргу на тых, хто прыйдзе галасаваць на выбарчыя ўчасткі.

У якасьці базы Народны блог 19 выкарыстоўвае мэханізм *Blogger* ад *Google*. На блогу магчыма разьмяшчаць аналітычныя артыкулы, развагі, жаньні на тэму выбараў, уласныя назіраньні за іх ходам, цікавыя лінкі ды навіны зь іншых рэсурсаў.

**Сямён Печанка**

**Адрас блогу ў Сеціве: www.19-03.blogspot.com.**

# Магілёўцы адзначылі ўгодкі паўстаньня

**1 лютага гарадзкая моладзь ушанавала памяць пра паўстаньне 1661 г.**

Тузін чалавек сабраліся на месцы, дзе стаяла ратуша. Паводле летапісу, паўстаньне пачалося адсюль: бурмістар Левановіч з крыкам «Пара!» выхапіў шаблю й кінуўся на маскоўскіх стральцоў. За некалькі гадзінаў сямітысячны расейскі гарнізон быў зьнішчаны, а горад вызвалены.

Кароль Рэчы Паспалітай Ян Казімер нават выдаў прывілей, паводле якога горад зраўняўся ў правах зь Вільняй. У гонар паўстаньня Магілёву быў дадзены новы герб: тры вежы на блакітным тле і збройны рыцар у браме пад выяваю «Пагоні». Гэта сучасны герб гораду.

**Тумаш Марцыбылін, Магілёў**

# Унівэрсытэт важнейшы за музэй

Леташні пераезд гісторыка-філялягічнага факультэту Полацкага дзяржаўнага ўнівэрсытэту ў адрэстаўраваныя карпусы былога езуіцкага калегіюму стаў пачаткам вяртаньня ўнівэрсытэту ў Полацак. Як вядома, ПДУ ўзьнік на базе Наваполацкага політэхнічнага інстытуту ў нафтагорадзе.

Новы ўнівэрсытэт абвесьціў пра пераемнасьць зь першай вышэйшай навучальнай установай на тэрыторыі Беларусі — Полацкай езуіцкай акадэміяй. На пачатку году ПДУ аддалі яшчэ адзін, пяты, корпус калегіюму, які раней хацелі аддаць гісторыка-культурнаму музэю-запаведніку пад археалягічны музэй. Але ўлады палічылі, што ўнівэрсытэту будынак больш неабходны. Трэба меркаваць, што пасьля канчатковай рэстаўрацыі комплексу будынкаў калегіюму ў Полацак пераедуць і іншыя гуманітарныя факультэты. Аддадуць унівэрсытэту і будынак былога Дому афіцэраў.

З наступнага году на базе СШ №6 пачне працу гісторыка-філялягічная ліцэйская кляса для дзесяцікласьнікаў. «Кадры» для ўнівэрсытэту пачнуць рыхтаваць зь сярэдняй школы.

**Васіль Кроква, Полацак**

# Аршанскія нявольнікі ў Расеі

**Неўладкаванасьць жыцьця на радзіме вымушае шмат якіх аршанцаў скіроўвацца на працу ў замежжа.** Большасьць зь іх становяцца «остарбайтэрамі». І, на жаль, не заўсёды ўдала. Так, нядаўна ў Аршанскі ГАУС зьвярнуўся чалавек, які шэсьць гадоў лічыўся зьніклым бязь вестак. На самай справе ўвесь гэты час ён дармова рабіў на нейкага хана ў Калмыкіі.

Але найбольш распаўсюджаным відам гандлю людзьмі ёсьць прастытуцыя. Не сакрэт, што асобныя маладзіцы засвойваюць самую старажытную прафэсію па ўласнай волі і ахвоце. Але ж большасьць жанчын накіроўваюцца ў замежжа ў надзеі на легальныя заробкі. Праўда, не заўсягды тыя надзеі спраўджваюцца. Так, 10 аршанак пад выглядам працы ў Таварыстве Чырвонага Крыжа (?!) вымушаныя былі займацца прастытуцыяй у польскіх рэстарацыях. Яшчэ 9 аршанак, якія зьбіраліся працаваць у Маскве афіцыянткамі, займаліся там прастытуцыяй. Замест прапанаванага нейкай фірмай гандлю кавунамі аршанка Т. гандлявала сваім целам у адным з расейскіх бардэляў. І гэткія прыклады можна шчэ' доўжыць.

Пакуль кардынальна не палепшыцца сацыяльна-эканамічнае становішча ў краіне, заганныя праявы гандлю людзьмі ня скончацца. Колькі б з гэтым ні змагаліся.

# Ворша – горад тэатральны

**Летась Аршанскі гарвыканкам прыняў рашэньне аб стварэньні ўласнага драматычнага тэатру.** Не зважаючы на багатыя тэатральныя традыцыі (першыя пастаноўкі ладзіліся тут ужо ў XVII стагодзьдзі ў езуіцкай калегіі), прафэсійнага тэатру адно з найбуйнейшых месТаў краіны да сёньня ня мела. Тэатральны калектыў сфармаваны на базе Аршанскага гарадзкога цэнтру культуры. Узначаліў яго Васіль Мігаль, былы рэжысэр славутага народнага тэатру Палацу культуры чыгуначнікаў. Гэты самадзейны тэатар адзначыў нядаўна 100-гадовы юбілей.

Яшчэ да апошняе вайны ў Воршы мелася невялікая тэатральная трупа ды draўляны будынак тэатру, які згарэў у 1941 годзе. Сучасная трупа ладзіць першыя спэктаклі на сцэне ГЦК. Генплян разьвіцьця Воршы да 2020 году будаўніцтва будынку тэатру, на жаль, не прадугледжвае.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

# Каб гарантавана чытаць газэту, дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні

Каб гарантавана чытаць «Нашу Ніву» цяпер, калі «Саюздрукам» і «Белпошце» забаронена распаўсюджваць газэту:

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць па тэлефоне, факсам, праз пошту ці электронную пошту.**
Тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84
e-mail: dastauka@tut.by
паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям’ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 6 000 рублёў на месяц. Гэтага будзе досыць для выхаду і дастаўкі газэты. **У блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу, калі ласка, дакладна і разборліва пазначайце ваш адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад’езду.** Тыя, хто перакажа 18 000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад газэты на тры месяцы. Хто ж мае магчымасьць пераказаць 36 000 рублёў адразу, забясьпечаць публікацыю «НН» адразу на паўгоду.

0402280179
**ИЗВЕЩЕНИЕ**

**Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521**
получатель платежа
**МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764**
наименование банка

Счет получателя: **3015 212 000 012** — Лицевой счет:

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| **Ахвяраваньне** | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

Кассир — Плательщик

**Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521**
получатель платежа
**МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764**
наименование банка

Счет получателя: **3015 212 000 012** — Лицевой счет:

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| **Ахвяраваньне** | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

**КВИТАНЦИЯ**

Кассир — М.П. — Плательщик

лицензия № 02330/0056637 от 27.03.2004 УП «УСЛУГА» Зак. 3504 тир 50 000

## На які рахунак пералічаць грошы?

Ахвяраваньне можна перавесьці ў любым аддзяленьні банку, на любой пошце. Улічыце, што пры пераказваньні грошай паштовым пераводам пошта спаганяе дадаткова 3%, а пры пераводзе грошай праз «Беларусбанк» працэнту не бяруць.
На банкаўскай квітанцыі ў графе «Від плацяжа» трэба пазначыць: «Ахвяраваньне». У графе: «Атрымальнік плацяжа» трэба пісаць: «Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521». У графе «Найменаваньне банку» трэба пісаць: «МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764». У графе «Рахунак атрымальніка» 3015 212 000 012. Пры перасылцы грошай па пошце тое самае трэба пісаць у рубрыках «Каму» і «Куды».

## Ці трэба паўторна дасылаць адрасы ў Рэдакцыю?

Не, аднойчы даслаўшы, больш ня трэба (калі вы рэгулярна атрымліваеце газэту). Тады досыць не забывацца рэгулярна пералічаць ахвяраваньні.

## Хто дасылаў ахвяраваньні, але не паведаміў адрасу

Прабачце, што газэта прыйшла вам запозьнена. Рэч у тым, што вы пераказалі ахвяраваньне, але не паведамілі Рэдакцыі адрасу адразу. Квіток ахвяраваньня трапляе да нас праз 5—10, а часам і болей дзён.

# Шукаем чытачоў!!!

Калі хто ведае наступных чытачоў «НН», просьба падказаць ім скантактавацца з газэтай.

**Чытач з Зарніцы Спасава**, дашліце свой дакладны адрас і прозьвішча.

**Чытачы Мацко,** адрас, які Вы падалі, няслушны. Падайце, калі ласка, правільны адрас.

**Леанід Мікалаевіч Н.** з вул.Калініна, удакладніце свой адрас.

**М. Белячэўская,** і Ваш новы адрас таксама «не існуе». Скантактуйцеся з Рэдакцыяй яшчэ раз.

**Калі вы не атрымалі газэты**

да панядзелка, а ў Менску — да суботы, абавязкова тэлефануйце ў Рэдакцыю. Пытацца Аляксандру.

Тэлефоны:

(017) 284–73–29,
(029) 613–32–32,
(029) 707–73–29

dastauka@tut.by

## Правілы падачы адрасоў:

Абавязкова падавайце індэкс, бо зь індэксам газэта дойдзе хутчэй.

Калі вы жывяце ў вёсцы ці ў мястэчку, пазначайце раён і вобласьць.

Ня трэба дасылаць квіток, пакіньце яго ў сябе, гэта вашае пацьверджаньне таго, што вы зрабілі ахвяраваньне.

Разборліва падавайце свае зьвесткі.

Атрымліваць газэту можна зь любога нумару, толькі паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас.

Газэта «Наша Ніва» шукае кур'ераў–распаўсюднікаў у Віцебску, Берасьці, Полацку й Наваполацку.

**Вельмі просім чытачоў, якія ад Новага году чытаюць «НН» у Інтэрнэце, а не на паперы, таксама дасылаць прыватныя ахвяраваньні з разьліку 6000 на месяц з пазнакай: «за Інтэрнэт». Бяз збору грошай газэце не захаваць якасьці.**

## Дзякуй за ахвяраваньні!

Дзякуем Ёсіфу Д. зь Сьвіслацкага раёну, які ахвяраваў на выданьне газэты 38 тыс. рублёў, Ігару М. зь Менску, які ахвяраваў 100 тыс. рублёў, Міхаілу З. — 30 тыс.

Мікалаю Т. з Асіповіцкага раёну.

Эдуарду М., Васілю К., Алене Ф., Кастусю З. зь Віцебску.

Алесю К. з Клімавічаў.

Я.Ш., Анатолю Б. з Маладэчна.

Мікалаю К. з Лунінецкага раёну.

А.Н. з Гомельскага раёну.

Генадзю Л., З. П., Барысу Ф., Аляксандру С., Марыі Б., В.З., Алене П., Канстанціну П. з Гомелю.

А.Д., Аўгену С., Пятру П., Вользе А., М.П., Н.К., Івану Р. з Горадні.

Сяргею Ч., Аксане В., Адальфіне В. зь Ліды.

Андрэю Л. з Жлобіна.

М.Ж. з Баранавіч.

Сяргею Н., Анатолю П. з Жодзіна.

Міколе Ж. з Мазыра.

Андрэю Л., Н.Т., Р.А. з Салігорску.

С.Р. зь Бярозы.

Івану В., З. Ш., Ігару Дз., Уладзімеру В. зь Берасьця.

Ларысе Я. з Полацку.

Андрэю Г., М.К. з Наваполацку.

Г.К. зь Ляхавіцкага раёну.

Аляксандру Ш. зь Лельчыцкага раёну.

Уладзімеру Ц. з Лагойскага раёну.

П.Г. з Мастоў.

А.М., Сяргею К., Аляксандры Г., Ю.Б., Марыі Г., Алене М., М.Б., Л.К., А.З., Аляксандру К., Івану Б., Генадзю К., В.П., А.Л., З. К., Алесю Р., Максіму К., Інэсе Б., Віктару П., Станіславу Г., Алене В., А.П., В.Д., Аксане С., Юр'ю М., Інэсе Б., Максіму К., Тацяне Г., Ігару Л., Івану К., Аляксею Г., Тацяне Р., Леаніду Т., Аляксандру Т., Міхаілу З., Уладзімеру Г., Сьвятлане К., М.А., З. К., Вользе К., Сержуку Л., Т.П., Алене Л., Ю.Ш., Уладзімеру С., Наталі Б., М.Г., Альберту С., Ігару М., Ірыне М., Генадзю Б., А.Л., А.С., К.С., Але Б., Міхаілу Ж., Барысу К., Уладзімеру К., Валянціну В., Віктару К., Р.Н., У.Г., Уладзімеру С., Аляксандру Л., Марыі Г., М.А. зь Менску.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# У турму за графіці

**1 лютага ў Менску падчас напісаньня графіці «Мы хочам новага» і «Дастаў» затрыманыя маладыя актывісты Артур Фінькевіч і Аляксей Янушэўскі. На хлопцаў завялі крымінальную справу паводле арт.339 ч.2 (злоснае хуліганства), што пагражае ім максымальнай карай — да 6 гадоў турмы. А.Янушэўскага выпусьцілі пад падпіску аб нявыезьдзе 3 лютага, А.Фінькевіч сядзіць у СІЗА. Для А.Янушэўскага гэта быў першы арышт. А.Фінькевіча затрымлівалі й раней, але ўпершыню за палітычную дзейнасьць пачынаюць караць па крымінальных артыкулах. На фота: Артура Фінькевіча затрымліваюць пасьля пэрформансу «Пахаваньне Канстытуцыі» у сакавіку 2005 году.**



**Павал Севярынец** — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны.

ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

# Лёгіка з

Каля алёшчынскае канторы на беразе вялікае лужыны, што ўвесь час паглыбляецца лесавозамі, стаіць надмагільны помнік з чырвонай зорачкай. Імя, імя па бацьку, прозьвішча. Дата: 1938—1994.

Я калісьці чуў гісторыю пра лётчыка, які разьбіўся ў наваколльі падчас вучэньняў на палігоне. Але вырашыў спраўдзіць — запытаўся ў рабочых.

— Лётчык?! — выбухнула рогатам брыгада, — Герой Савецкага Саюзу! Як ён тут у штопар увайшоў!..

Калі рогат сьцішыўся, мне патлумачылі. Помнік тут пастаўлены дзеячу, прысланаму сюды ў леспрамгас з Полацку. Якраз па прэзыдэнцкіх выбарах, увосень, п’яны, засунуўшы рукі ў кішэні плашча, ён ішоў да канторы, але заваліўся тварам у лужыну ды захлынуўся. Ня здолеўшы дастаць рукі, патануў там, дзе вады на паўбота. Чырвоная зорка — таму што камуніст быў.

Яшчэ адзін помнік з чырвонай зоркай — над брацкай магілай часоў Другой сусьветнай — стаіць у цэнтры Малога Сітна, там, дзе раней была царква. Царкву ў 1941-м разабралі на бліндажы, а магілу выкапалі ўжо ў 1970-х, калі кампанія ўшанаваньня подзьвігу савецкага народу дакацілася да апошніх сельсаветаў. Прыяжджаў пошукавы атрад, накапалі ў лесе касьцей («А дзе ўгадаеш, якія чые, столькі часу мінула: мо нашы, мо нямецкія, мо наагул сабачыя», — кажуць у вёсцы). Ссыпалі ў кучу. Карэспандэнт раёнкі, салдаты з салютам, «ніхто не забыты» — усё як належыць. Сабралі паўвёскі далакопаў, тыя рыдлёўкамі лясь ды лясь — ага, царкоўны падмурак. Узарвалі. Хрысьціянства тут выдалялі грунтоўна, дарэшты, з коранем. Знайшоўся ж нейкі

## СЬЦІСЛА

**Агітаваць супраць Лукашэнкі — крымінал**

У Ваўкавыску 5 лютага міліцыянты затрымалі **Віктара Вайцюка** і **Віталя Гуляка**, зьбіральнікаў подпісаў за Мілінкевіча. Іх дапыталі як сьведкаў у крымінальнай справе за «хуліганства» — графіці «Просім сысьці» і «Сыходзь», якія зьявіліся ў горадзе напярэдадні. Дома ў актывістаў адбылісяператрусы. Канфіскавалі друкаваную прадукцыю, плякаты з выявай Мілінкевіча, у Вайцюка — кампутар і справаздачу ААН аб правах чалавека.

**Правакацыя супраць Крука**

На кіраўніка штабу Мілінкевіча ў Ашмяне **Івана Крука** 6 лютага завялі крымінальную справу: яго вінавацяць у супраціве супрацоўнікам міліцыі (арт.364 КК). Цымус у тым, што Крук сам — адстаўнік-міліцыянт. Крук кажа, што мае сьведкаў, якія абвергнуць заявы міліцыі.

**Нагнятаньне тэрору**

30 студзеня каля Жлобіна затрымалі **Ўладзімера Кацору**, кіраўніка гомельскага штабу адзінага, канфіскаваўшы 282 асобнікі газэты «Народная воля» і 694 асобнікі газэты «Таварыш».

Зьбіральніка подпісаў у Сьвіслачы (Гарадзеншчына) **Генадзя Радзецкага** 3 лютага аштрафавалі на 5 базавых велічыняў (145 тыс. руб.). Суд палічыў плякат з матэрыяламі Кангрэсу дэмсілаў датэрміновай агітацыяй.

Настаўніка сярэдняй школы пас. Праўдзінскі (Пухавіцкі р-н) **Віктара Царкевіча**, актывіста групаў Мілінкевіча й Казуліна, 21 студзеня кіраўніцтва РайАНА намаўляла сысьці з уласнага жаданьня. У выніку стрэсу актывіст атрымаў бальнічны ліст.

Студэнта Беларускага аграрна-тэхнічнага ўнівэрсытэту **Вэнэдыкта Кляўзэ** выключаюць з БРСМ, бо ён уваходзіў у ініцыятыўную групу Мілінкевіча. У БРСМ Кляўзэ быў сакратаром факультэцкай арганізацыі.

На кіраўніка віцебскага штабу адзінага **Хрыстафора Жаляпава** 2 лютага завялі адміністрацыйную справу: наяўнасьць у ягонай машыне каляндарыкаў і плякатаў з выявай Мілінкевіча (выяўленых падчас дагляду ўначы з 30 на 31 сьнежня) кваліфікуюць як датэрміновую агітацыю і распаўсюд друкаванай прадукцыі без выходных зьвестак.

У Ашмянах 2 лютага суд прысудзіў **Пятра Явідовіча** да штрафу, зьвінаваціўшы яго ў датэрміновай агітацыі за бюлетэнь «Час адзінага» і ўлёткі, якія той распаўсюджваў у Ашмянах на пачатку студзеня. У бюлетэні і ўлётках была інфармацыя пра прыезд у Ашмяны А.Мілінкевіча і запрашэньне на сустрэчу зь ім. П.Явідовіч мае падаваць апэляцыю ў абласны суд.

Адміністрацыйная камісія Бялыніцкага райвыканкаму 3 лютага аштрафавала пэнсіянэрку **Ірыну Капыткову** на 1 б.в. (29 000 ) за «распаўсюд незарэгістраванай друкаванай прадукцыі» — каляндарыкаў з выявай адзінага кандыдата.

4 лютага на ўезьдзе ў Берасьце міліцыянты затрымалі кіраўніка ініцыятыўнай групы адзінага **Аляксандра Бухвостава**.

**Пісальнік у пракуратуры**

Галоўнага рэдактара газэты «Głos znad Niemna na uchodztwie» **Анджэя Пісальніка** 31 студзеня выклікалі ў гарадзенскую абласную пракуратуру: чыноўнікаў цікавілі ягоныя публікацыі ў газэце, а таксама часопісе «Magazyn Polski». Пісальнік адмовіўся даваць паказаньні.

**У Кобрыне**

27 студзеня ў Кобрыні маёр міліцыі Анатоль Кананчук, начальнік інспэкцыі па справах няпоўнагадовых, наведаў кватэру **сям’і Кучынскіх**: ён цікавіўся **сынам Кучынскіх Станіславам**, структурай незарэгістраванай моладзевай арганізацыі «Зубр», запісаў зьвесткі пра бацькоў. Міліцыянт запрасіў **Станіслава Кучынскага** наведаць райаддзел міліцыі 28 студзеня. Калі той прыйшоў у міліцыю, у яго зьнялі адбіткі пальцаў, сфатаграфавалі ў фас і профіль, зьнялі на відэакамэру. Бацькі Станіслава маюць абскардзіць дзеяньні міліцыі.

**У Барысаве**

У Барысаве 30 студзеня затрымалі моладзевага актывіста **Максіма Апялінскага**. Міліцыянты заявілі, што ён нібыта расклейваў улёткі.

**У Пінску**

Актывісту **Сяргею Касьцюковічу** 1 лютага Пінскі гарвыканкам адмовіў у правядзеньні

# чырвонай пэнтаграмай

раённы ідэоляг, які распарадзіўся ўтнуць тую чырвоную пэнтаграму менавіта на месцы храму. Каб сьвятое месца не пуставала. Так і стаіць, глядзіць у вокны закінутага сьвятарскага дому сатанінскі сымбаль. Маўляў, перамога за намі.

А ўвогуле бляшаныя чырвоныя зоркі панапрыбіваныя ў Сітне на палове хатаў. Калі на пачатку маёй «хіміі» адна мясцовая жыхарка, вычарпаўшы ўсе аргумэнты ў спрэчцы, выпаліла ў твар: «Нацыяналіст! Ты нават у хаце паліцая жывеш!» — я шчыра зьдзівіўся: «Як гэта? Там жа зорка!» Яна адмахнулася: «Вядома, зорка... Ён жа *ўчасьнік вайны*!»

Колькі іх было — адзначаных зоркамі на пагонах, на хатах, на могілках «учасьнікаў вайны»... Вайны зь нядаўнім саюзьнікам, з клясавым ворагам, з уласным народам... Вайны з Богам... Дзіва што, ад усёй эпохі камунізму, ад агромністай савецкай імпэрыі, апроч паламаных лёсаў і зьнявечанае зямлі, у Малым Сітне ды Алёшчы засталіся толькі вось гэтыя нязгасныя чырвоныя зоркі. Як крамлёўскае таўро. Па-над дзьвярыма. Па-над абэліскамі. Па-над гербам з каласкамі, што на ганку сельсавету.

Глядзіш на гэтыя злыя крывыя значкі, быццам у вочы д'яблу. Глядзіш і думаеш: цікава, а што ж, акрамя магілкі з чырвонай пэнтаграмай 1994 г., застанецца ў Малым Сітне ды Алёшчы ад эпохі Лукашэнкі, калі 19 сакавіка мы пераможам?

*в.Малое Сітна*

«Нацыяналіст! Ты нават у хаце паліцая жывеш!»

## СЬЦІСЛА

пікетаў пад назвай «Дзе сумленныя, празрыстыя і справядлівыя выбары?», прызначаных на 3 і 7 лютага. Намесьнік старшыні гарвыканкаму А.Канеўскі ў адказе палічыў, што гэта будзе перадвыбарчай агітацыяй.

### Камуністаў папярэдзілі двойчы

Партыя камуністаў Беларуская 1 лютага атрымала папярэджаньне ад Мін'юсту. Ліст **Сяргея Калякіна** да кіраўнікоў выканкамаў з патрабаваньнем выконваць Выбарчы кодэкс расцэнены як умяшальніцтва ў дзейнасьць дзяржаўных органаў. ПКБ мае абскардзіць папярэджаньне ў Вярхоўным судзе.

### У Жабінцы

У Жабінцы 1 лютага міліцыянты спрабавалі затрымаць берасьцейскіх актывістаў **Ірыну Лаўроўскую** і **Ўладзімера Вялічкіна**, якія зьбіралі подпісы за вылучэньне ў абласную выбарчую камісію. Падставай сталі два асобнікі «Народнай Волі» ў руках Вялічкіна: яго спрабавалі зьвінаваціць у распаўсюдзе прэсы. Прайсьці зь міліцыянтам у выканкам ці пастарунак актывісты адмовіліся.

Адміністрацыйная камісія райвыканкаму 1 лютага разгледзела справу **Васіля Андрасюка**, зьвінавачанага ў распаўсюдзе выданьняў: 17 студзеня ў яго забралі 447 асобнікаў «Дакладу Спэцыяльнага дакладчыка па пытаньні аб становішчы ў галіне правоў чалавека ў Беларусі Адрыяна Сэвэрына». Паколькі з прадстаўніцтва ААН у Беларусі прыйшоў факс, што гэта афіцыйныя дакумэнты ААН, раённая камісія не ўзяла на сябе адказнасьць і накіравала дакумэнты ў Ленінскі РУУС Берасьця, чые супрацоўнікі затрымлівалі актывіста.

### Палітвязьні

2 лютага палітвязень **Міхаіл Марыніч** патрапіў у рэспубліканскі турэмны шпіталь на курс абсьледаваньня.

**Паўлу Севярынцу** адміністрацыя Ветрынскай камэндатуры 4 лютага вынесла папярэджаньне: для паездкі да яго журналісты павінны атрымаць дазвол спэцкамэндатуры, замежныя грамадзяне — МУС. 3 лютага да Севярынца не пусьцілі супрацоўніка швэдзкай амбасады Стэфана Эрыксана.

На судовым паседжаньні 6 лютага пракурор запатрабаваў пакараць **Сяргея Скрабца** пазбаўленьнем волі на 5,5 гадоў. Прысуд будзе абвешчаны 14 лютага. Ад 1 студзеня С.Скрабец трымае галадоўку.

### У Гомелі

Калегія Гомельскага абласнога суду 2 лютага адхіліла скаргу чарнобыльскага ліквідатара **Васіля Сіліверста** з Калінкавічаў: ён абскарджваў адмову Калінкавіцкага райсуду прызнаць, што ягоныя захворваньні пачаліся праз удзел у ліквідацыі наступстваў Чарнобылю.

### Ліквідуюцца грамадзкія арганізацыі

У Смургонях 3 лютага праз адсутнасьць юрадрасоў ліквідаваны апошнія дэмструктуры ў раёне — **раённая суполка БНФ «Адраджэньне»** і **Свабодны прафсаюз прадпрымальнікаў**.

6 лютага Вярхоўны суд ліквідаваў **Беларускі саюз моладзевых і дзіцячых грамадзкіх аб'яднаньняў «Рада»**. Арганізацыі закідалі ўмяшальніцтва ў палітыку і ўнутраныя справы дзяржструктураў, выкарыстаньне незарэгістраванай сымболікі.

Агулам за 2005 г. Мін'юст ліквідаваў 68 ГА (17 — рэспубліканскага й міжнароднага статусу, 51 — мясцовага), яшчэ 43 ГА прынялі рашэньне пра самаліквідацыю. Летась органы юстыцыі вынесьлі 425 папярэджаньняў NGO — на 161 больш, чым у 2004 г.

### У Салігорску

2 лютага ў кватэры актывіста ПБНФ **Паўла Батуева** адбыўсяператрус. Сам хлопец тым часам быў у Менску на акадэмічнай сэсіі.

3 лютага за распаўсюд улётак былі затрыманыя моладзевыя актывісты **Іван Шыла** і **Яўген Мядзьведзеў**. На Мядзьведзева складзены адміністрацыйны пратакол.

### Яшчэ адну газэту прыхлопнулі

Наваполацкай газэце **«Хімік»** раённая пошта адмовіла ў распаўсюдзе.

3 лютага за распаўсюд недзяржаўнай прэсы ў Наваполацку затрыманы **Аляксей Трубкін**. У менскага палітоляга **Юр'я Чавусава** пры перасячэньні мяжы 3 лютага беларускія мытнікі канфіскавалі часопіс «ARCHE» для «праверкі».

**АШ**

# Маці палітвязьняў

Адпраўляючы за краты маладых хлопцаў, пракуроры й судзьдзі нібы выносяць прысуды іхным маці. Сёньня сваіх сыноў чакаюць Тацяна Севярынец, Тацяна Касьпяровіч, Марыя Фінькевіч.

## Марыя Фінькевіч

Спадарыня Фінькевіч да заняткаў Артура палітыкай прызвычаілася, хоць і не падтрымлівае мэтады: «Яны не дасягнуць мэты».

Сына затрымалі 1 лютага з фарбай у руках. Разам з Аляксеем Янушэўскім ён пісаў на плоце графіці «Хочам новага» і «Дастаў» (гэтая акцыя не прадугледжвае крымінальнае адказнасьці за псаваньне дзяржмаёмасьці, плот — не сьцяна будынку). 3 лютага Аляксея адпусьцілі пад падпіску аб нявыезьдзе, Артура пакінулі ў СІЗА на Валадарскага. Адыгралі ролю шматразовыя затрыманьні падчас маладафронтаўскіх акцыяў. Сябры як могуць падтрымліваюць Артура: у 21-шы дзень нараджэнаў, 8 лютага, зладзілі ля сьценаў турмы пікет.

Пра свае пачуцьці спн. Марыя кажа неахвотна. З абурэньнем толькі згадваеператрус у кватэры, наладжаны 1 лютага. Вобыск трываў гадзіну. «Перапаролі бялізну. Маёй маме пагражалі: калі вы нам усё не пакажаце, яшчэ раз прыйдзем. Я ім кажу: куды вы прыйдзеце? Я вас проста не пушчу! Што, дзьверы ламаць будзеце?» — наракае жанчына на хамскія паводзіны міліцыянтаў. «Імкнуліся запісаць на Артура як мага больш. Казалі: «Вось гэты тэлевізар запісваем на яго». А потым прыйдуць і забяруць маю маёмасьць?» Праўда, у гэтым швондэраўскім памкненьні хапануць як мага больш Марыя Фінькевіч бачыць і надзею: магчыма, усё абыдзецца толькі штрафам.

## Тацяна Касьпяровіч

Спн.Касьпяровіч скардзіцца, што не даходзяць лісты да сына: «Сьпярша казалі, што цэнзараў мала, цяпер заяўляюць — цэнзары хварэюць. Таму, мауляў, ліст дойдзе да Зьмітра праз тры тыдні». Першы ліст ад сына, напісаны 1 лютага, яна атрымала на шосты дзень. Сама спн. Касьпяровіч за ўвесь час Зьмітровага зьняволеньня напісала дзесяць лістоў. У адзіным атрыманым лісьце Зьміцер напісаў, што ў камэры дужа холадна. Маці перадала яму два цёплыя швэдры, некалькі параў шкарпэтак.

1 лютага перадала сыну вялікі пакунак, які дазваляюць перадаваць раз у паўмесяца: прадукты, кнігі («Гісторыю Беларусі», «Новы Запавет», раман В.Іпатавай «Альгердава дзіда»). У камэры, кажа, ёсьць тэлевізар.

Зьміцер вызвалены ад войска: у самотнай маці ён адзіны сын. І адзіны кармілец у сям’і: Тацяна Касьпяровіч — пэнсіянэрка. Адгукнуліся добрыя людзі. «Мне шмат тэлефанавалі людзі, якім Зьміцер арганізоўваў паездкі. Я ім кажу: пакуль стаяць маразы, паездкі адмяняюцца. Але людзі кажуць: мы чытаем «Нашу Ніву», усё ведаем, авансавыя грошы за паездкі вяртаць ня трэба».

Маці спадзяецца, што Зьміцер пасьля выхаду на волю працягне адукацыю: «Ён вельмі добра вучыўся. Пойдзе ў асьпірантуру ці магістратуру».

Тацяна наракае на адваката Паўла Сапелку, які рэдка сустракаецца з сынам. На сёньня адвакат — адзіны чалавек, які можа бачыцца з хлопцам штодня і прыносіць ад яго весткі. Адвакат кажа маці, што ня можа дамагчыся сустрэчы з пракурорам і мае абмежаваныя магчымасьці да перадачы справы з пракуратуры ў суд.

## Тацяна Севярынец

Тацяна Севярынец пра сына кажа з гонарам. Згадвае адчуваньні ў момант, калі даведалася пра прысуд Паўлу: «Мы ня тое, што зьмірыліся... Гэта было абурэньне!» І параўноўвае працэс з трагедыяй на Нямізе ў 1999 годзе. «Статкевіч і Паша зрабілі ўсё, каб ніводзін чалавек не атрымаў драпіны ці гузака. І іх засудзілі. А за сьмерць людзей на Нямізе нікога не пакаралі, вінаватых не знайшлі — нібы яны самі туды кінуліся паміраць».

Нядаўна, у моцныя маразы, Павал прыяжджаў «у адпачынак». «Бадзёра выглядаў. Схуднеў, праўда. Ня рай жа там, а цяжкая фізычная праца». Дзейнасьць Паўла на «хіміі» ўжо прыносіць плён: «Да сына ідуць, калі адчуваюць несправядлівасьць. Калі стаялі маразы, дык людзі ўжо самі, бяз Паўла, сказалі, што ня будуць працаваць у лесе».

Як і кожная маці, Тацяна Севярынец перажывае: «Бегаю па рынку, куплю валёнкі, рукавіцы. Але Паша сьціпла да ўсяго ставіцца, кажа, што яму нічога ня трэба. Ён ведае, якія выдаткі ідуць на ўсе гэтыя закупкі, таму адмаўляецца». Ад аднае згадкі пра сына на твары зьяўляецца ўсьмешка: «Прывёз Паша штаны, каб зашыла. Ён і сам умее трымаць іголку ў руках, але тут прывёз: зашый так, каб ня дралася».

Маці згадвае, што падчас «адседкі» ў ізалятары на Акрэсьціна ў Менску Павал дзяліўся вопраткай і ежай з сукамэрнікамі. Гэткі ж ён і ў ссылцы. Праўда, не абыходзіцца бяз прыкрых выпадкаў. «Паша будзе сварыцца, што я гэта распавядаю, але... Паша прыехаў дадому ў тонкім швэдры, тонкіх штанах. Я пытаюся: «Мы ж табе купілі цёплую вопратку, чаму ня носіш?» А ён кажа, што пасялілі да яго хлопца з Новалукомлю, той голы прыехаў. Дык Паша яму ўсё і аддаў. А той хлопец яго і абабраў: пакуль Пашы не было, зьеў ягоныя прыпасы, забраў рэчы...»

Маці суцяшаецца тым, што да Паўла езьдзяць сябры й знаёмыя: «Ён прыклад для многіх, для тых, хто яшчэ не наважваецца выказаць свае думкі ўголас». Кажа, што на працы да «маці палітвязьня» ставяцца з разуменьнем: «Усе ведаюць, што я здатная на рашучыя крокі і ў настаўніцкім жыцьці заўжды крытычна стаўлюся да рашэньняў начальства. Таму паважаюць».

**Аркадзь Шанскі**

**Напішы палітвязьням:**

220050 Менск, вул.Валадарскага, 2, СІЗА №1, камэра 146.
**Касьпяровічу Зьмітру**.

220050 Менск, вул.Валадарскага, 2, СІЗА №1.
**Фінькевічу Артуру**.

211652 Полацкі раён. п.а. Малое Сітна, Да запатрабаваньня
**Севярынцу Паўлу**.

225416 Баранавічы, вул.Жукава 12а, кв.5,
**Статкевічу Мікалаю**.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**У Тацяны Касьяровіч Зьміцер — адзіны сын.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# БРСМ — гэта БЛСМ

**Студэнта Беларускага аграрна-тэхнічнага ўнівэрсытэту Вэнэдыкта Кляўзэ выключаюць з БРСМ, бо ён уваходзіў у ініцыятыўную групу Мілінкевіча. У БРСМ Кляўзэ быў сакратаром факультэцкай арганізацыі. За што, здавалася б, выключаць? Мілінкевіч такі ж грамадзянін Рэспублікі, як і Лукашэнка. Выходзіць, дзяржава разам з усімі паддзяржаўнымі арганізацыямі ў нас прыватызаваныя адным чалавекам.**

# Свабодная Беларусь займела твар і голас

Дыпляматычны наступ беларускай апазыцыі: водгукі эўрапейскай прэсы на паездкі Мілінкевіча аглядае **Алесь Кудрыцкі**.

Апазыцыя прарвалася-такі на Захад — у поўным сэнсе гэтага слова. Сустрэча Аляксандра Мілінкевіча з кіраўніком Эўракамісіі, канцлерам Нямеччыны, прэзыдэнтамі Літвы, Польшчы, міністрамі замежных справаў Францыі, Украіны — Лукашэнку такія паездкі нават і ня сьніліся. Між тым, заходнія журналісты выкарысталі момант, каб пазнаёміць сваіх чытачоў, слухачоў і гледачоў зь беларускім палітыкам ды падрыхтаваць іх да беларускага інфармацыйнага цунамі, прызначанага на сакавік. Сярод матэрыялаў пераважалі інтэрвію. Што казаў адзіны кандыдат?

## «Палацавая рэвалюцыя выключаная»

Кансэрватыўная «Франкфуртэр альгемайнэ цайтунг» адвяла інтэрвію з Аляксандрам Мілінкевічам амаль цэлую паласу пад шапкай «палітыка». У сярэдзіне старонкі — фота з Кангрэсу дэмакратычных сілаў: толькі што абраны адзіны кандыдат высока трымае сьціснуты кулак. Праўда, журналіст ФАЦ назвае Мілінкевіча «апазыцыйным беларускім палітыкам», пабойваючыся гучнага эпітэту «лідэр апазыцыі», ды ўпарта падае яго імя ў расейскай транскрыпцыі. Пра тое, што нашую краіну называюць «Weißrusland», казаць залішне — нямецкая прэса аніяк не жадае ўспрыняць міжнародны назоў «Belarus». Аднак, нягледзячы на дробныя недарэчнасьці, інтэрвію выйшла прыязным.

Характэрна, што першы адказ Мілінкевіч пачынае са слова «мы». «Вы самі казалі, што шанцаў на перамогу ў вас няма. Чаму вы ўсё-такі выступаеце супраць Аляксандра Лукашэнкі?» — праракуе першым пытаньнем журналіст. «Мы ў апазыцыі доўга выратшалі, ці варта нам увогуле ўдзельнічаць у выбрарах, — адказвае Мілінкевіч. — Бо вынік ужо вядомы... Але з дапамогай выбараў мы зможам усталяваць кантакт з насельніцтвам». Карэспандэнт: «У кастрычніку самыя розныя палітычныя сілы абралі вас адзіным кандыдатам у прэзыдэнты. Як доўга можа існаваць такі саюз?» Адказ Мілінкевіча: «Да перамогі». На пытаньне «Што зьяўляецца галоўнымі недахопамі і памылкамі Лукашэнкі?» Мілінкевіч адказвае так: «Самая галоўная правіна Лукашэнкі ў тым, што ён стварыў сыстэму татальнага прыніжэньня людзей».

Што да намэнклятуры, Мілінкевіч ня лічыць яе маналітам, але і не глядзіць на яе праз ружовыя акуляры: «Сярод «намэнклятуры» ёсьць людзі, нязгодныя з тым, што адбываецца ў краіне. Я ведаю гэтых людзей, размаўляў зь імі. Але нельга разьлічваць на тое, што незадаволеныя ў шэрагах «намэнклятуры» самі па сабе праявяць палітычную актыўнасьць. Гэта адбудзецца, калі мы выйдзем на вуліцу перамогі. Палацавая рэвалюцыя, спроба путчу ў асяродку кіруючай эліты выключаная».

Мілінкевіч ня марыць пра паўтарэньне ўкраінскага сцэнара. «Ці можаце вы ўявіць у Беларусі рэвалюцыю накшталт украінскай?» — пытаецца карэспандэнт. «Кааліцыя дэмакратычных сілаў супраць рэвалюцыі, — адказвае Мілінкевіч, аднак дадае: — Але мы патрабуем чэсных і адкрытых выбараў. Улада на гэта ніколі ня пойдзе, і гэта прыніжае людзей. Таму ня выключана, што людзі выйдуць на вуліцу, каб, як украінцы, сказаць: «мы ня быдла».

## «Мы зможам перамагчы»

«Людзі сытыя па горла хлусьнёй», — такі загаловак мае інтэрвію, які Аляксандар Мілінкевіч даў журналістцы нямецкай карэспандэнцкай сеткі n-ost. У адрозьненьне ад «ФАЦ», першае пытаньне датычыцца асабістага жыцьця Мілінкевіча: «Як успрыняла вашая сям'я рашэньне Кангрэсу абраць вас адзіным каныдыдатам у прэзыдэнты?» «Яны пажадалі мне перамогі і папрасілі быць асьцярожным», — адказвае Мілінкевіч. «Барацьба будзе цяжкай», — прызнае ён. «Людзі ў краіне ня ведаюць вас. Ці ўдасца вам сьцвердзіцца ў якасьці альтэрнатывы дзейнаму прэзыдэнту?» — пытаецца журналістка. «Так, я здолею гэта зрабіць, — упэўнена адказвае Мілінкевіч. — У краіне пашыраныя пратэстныя настроі. Ад 50 да 70% людзей жадаюць зьменаў». На пытаньне, ці будзе яго каманда карыстацца парадамі ўкраінскіх экспэртаў, Мілінкевіч адказаў станоўча: «Яны разумеюць сытуацыю лепш за заходніх дарадцаў». Журналістка спрабуе даведацца, ці не жадае Мілінкевіч выкарыстаць зброю суперніка, але атрымлівае такі адказ: «У мэтадах Лукашэнкі няма нічога, што мне б падыходзіла. Людзі сытыя па горла хлусьнёй».

Аўстрыйская «Вінэр цайтунг» зьмяшчае інтэрвію «Атмасфэра абсалютнага страху». Першае пытаньне журналіста датычыць словаў Пуціна пра тое, што «ў Беларусі магчымыя свабодныя выбары». Мілінкевіч такой думкі не падзяляе: «Гэта ня так. Але мы былі б больш чым удзячныя прэзыдэнту Пуціну, каб ён дапамог дэмакратыі замацавацца ў Беларусі».

«Ці верыце вы ў тое, што можаце перамагчы?» — запытваецца журналіст. «Мы абсалютна ўпэўненыя, што зможам перамагчы, калі выбары будуць сумленныя, — адказвае Мілінкевіч. — Але я не магу прыгадаць, каб у нядаўнім мінулым дыктатарскія рэжымы прайгравалі выбары».

На пытаньне «Якую думку вы хацелі б данесьці да прэзыдэнта Пуціна?» Мілінкевіч адказвае: «У шэрагах беларускай апазыцыі няма антырасейскіх палітыкаў. Калі мы пераможам, дачыненьні з Расеяй нават будуць лепшыя,

Працяг на старонцы 18.

# Свабодная Беларусь займела твар і голас




**Жазэ Мануэл Барозу — Аляксандру Мілінкевічу: запрашаем у Эўразьвяз!**

**Працяг са старонкі 17.**

чым цяпер. Мы гатовыя ўлічваць расейскія інтарэсы, калі яны не супярэчаць інтарэсам Беларусі».

Падобныя думкі адзіны кандыдат выказваў і ў іншых інтэрвію. «Мы жадаем быць сапраўдным мостам паміж Усходам і Захадам, а не прахадным двором», — заявіў Аляксандар Мілінкевіч выданьню *EU Observer*. Але Захаду таксама ёсьць, над чым працаваць.

«Эўропа развучылася даваць рады дыктатурам», — рэзка адзначыў Мілінкевіч у інтэрвію радыёстанцыі «Нямецкая хваля».

## Агульныя ўражаньні

Сэнс звароту Мілінкевіча да Захаду такі: не чакайце дакладнага паўтору ўкраінскага сцэнара, беларускі рэжым куды больш жорсткі. Калі палітык і праводзіць паралелі, дык з Польшчай часоў «Салідарнасьці». На думку Мілінкевіча, спадзявацца на намэнклятуру таксама не выпадае.

Ад Захаду патрабуецца найперш інфармацыйная дапамога. Найчасьцей Мілінкевіч кажа пра патрэбу мець тэлебачаньне, аднак канкрэтных парадаў не дае. Ён апэруе лічбай 24%, калі кажа пра сваю падтрымку сярод насельніцтва. Найгоршымі рысамі жыцьця ў Беларусі Мілінкевіч лічыць страх і прыніжэньне, а патэнцыял перамогі — у людзях, якім абрыдла гэта цярпець.

Упершыню Беларусь займела твар і голас у Эўропе. У параўнаньні зь Мілінкевічам, Лукашэнка блякне, бо ў сьвядомасьці эўрапейцаў ён прысутны як фантом, як цень над краінай. А Мілінкевіч — жывы чалавек.

Да Мілінкевіча лідэраў апазыцыі на Захадзе так не прымалі. Ня факт, што так будуць прымаць і надалей — калі Мілінкевіч адыдзе ці будзе адсунуты ўбок інтрыганамі пасьля магчымай часовай няўдачы ў сакавіку. Адзіны кандыдат атрымаў вялікі аванс даверу, і, каб яго апраўдаць, яму давядзецца заставацца лідэрам да перамогі, калі б яна ні прыйшла.

Гісторыя з дацкімі карыкатурамі настолькі заблытаная, што, каб не заблытацца яшчэ больш, трэба адшукаць пачатак ніткі. Пачалося ўсё зь дзіцячай кніжкі. З Бэрліна піша Алесь Кудрыцкі.

# Аловак запаволенага дзеяньня

Корэ Блютген — самы пасьпяховы дзіцячы пісьменьнік Даніі. Народы так званага «трэцяга сьвету» — ягоная слабасьць. Корэ прынцыпова жыве ў мультыкультурным раёне Капэнгагену Норэбро, а ягоныя дзеці ходзяць у мясцовую школу, дзе сядзяць за аднымі партамі зь дзецьмі эмігрантаў. Неяк Корэ прыйшла ў галаву ідэя выдаць кніжку, у якой дацкім дзецям распавядалася б пра гісторыю ісламу. А які малы будзе чытаць кніжку без карцінак? Пісьменьнік пачаў шукаць ілюстратара, аднак беспасьпяхова: ніводзін мастак не згаджаўся маляваць прарока Мухамада. Нікому не хацелася паўтарыць сумны лёс галяндзкага рэжысэра Тэа ван Гога, якога зарэзаў рэлігійны фанатык за крытыку ісламскага фундамэнталізму.

Дачуўшыся пра гэта, Флемінг Розэ, рэдактар аддзелу культуры вядучай дацкай штодзённай газэты «Юландс-Постэн», вырашыў праверыць, наколькі моцна ўкараніліся страх і самацэнзура ў дацкім грамадстве. Ён папрасіў 40 вядучых карыкатурыстаў даслаць у газэту малюнкі з выявай прарока Мухамада. Адгукнуліся дванаццаць. 30 верасьня іх творы былі зьмешчаныя ў газэце пад загалоўкам «Твар Мухамада».

Тыдзень ніякай рэакцыі на публікацыю не было. І толькі калі дацкія журналісты самі зьвярнуліся па камэнтар да мясцовых імамаў, карыкатуры былі прызнаныя «абразьлівымі для мусульманаў усяго сьвету». Рэй перахапіў лідэр адной з найбуйнейшых мусульманскіх рэлігійных грамадаў Даніі імам Ахмэд Абу Лабан. Ён арганізаваў дэманстрацыю пратэсту ў Капэнгагене ды зрабіў турнэ па ісламскіх краінах, каб зьвярнуць іх увагу да дацкіх «антыісламістаў».



AP

**Карыкатуры на прарока абурылі мусульманаў ва ўсіх краінах сьвету . На фота: Мітынг пратэсту ў Ярданіі.**

Папулісцкая крайне правая Дацкая народная партыя выкарыстала зручны момант, каб агулам запісаць дацкіх мусульманаў у «здраднікаў краіны». Канфлікт пачаў граць на руку тым, хто не жадае бачыць мусульманаў паўнавартаснымі датчанамі. Гэта адносіцца і да самога Абу Лабана, які сьцьвярджае, што мусульманін ніколі ня можа быць сапраўдным грамадзянінам сьвецкай заходнеэўрапейскай краіны. Далей скандал пакаціўся як воз з гары. Прадмет спрэчкі, самі карыкатуры, пачалі адыходзіць на другі плян.

## Бязглуздая сатыра

«Карыкатуры — дрэнь», — піша «Франкфуртэр альгемайнэ цайтунг». Тут можна пагадзіцца часткова. Карыкатуры розныя. Ёсьць сярод іх і банальныя карцінкі-памфлеты накшталт барадача з бомбай замест турбана, ёсьць і карыкатуры не бяз гумару накшталт прарока, які не пускае ў неба тэрарыстаў-сьмяротнікаў са словамі: «У нас цнатлівак на ўсіх вас ужо не хапае!» Але абʼядноўвае малюнкі адно: сэнсавая памылка.

Чаму карыкатурысты скіравалі свае алоўкі супраць прарока Мухамада? Няўжо яны, прагрэсіўныя эўрапейцы, лічаць, што тэрарызм сыходзіць з самой прыроды ісламу? Хто дае бомбы сьмяротнікам — Мухамад ці тыя, хто выкарыстоўваюць яго імя і ідэі ў сваіх пачварных мэтах? Дык чаму тады бомбу замест чалмы апранулі прароку, а ня бэн Ладэну? Памяняй рэдактар загаловак з «твар Мухамада» на «твар ісламскага фундамэнталізму», не палалі б цяпер дацкія пасольствы.

Публікацыя малюнкаў мела на мэце паказаць свабоду эўрапейскага грамадства ад забабонаў, а насамрэч выявіла, наколькі гэтае грамадства павязанае стэрэатыпамі. Што ні карыкатура — то чалма, барада ды крывая шабля. Дык вось як інтэлектуалы ўяўляюць сабе твар сучаснага ісламу! Няшмат зьмянілася з часоў сярэднявечча… Не карыкатуры — а лубкі для вэтэранаў крыжовых паходаў. Праўда, карыкатуры на габрэяў у арабскіх газэтах мала чым розьняцца ад «штурмэраўскіх» улётак-агітак гітлераўскіх часоў — тыя ж крывыя

**Працяг на старонцы 20.**

# Аловак запаволенага дзеяньня

Працяг са старонкі 19.

насы ды золата, што сыплецца з кішэняў.

А можа, малюнкі надрукавалі, проста каб давесьці сваю сьмеласьць, здатнасьць казаць, што заўгодна, у тым ліку пра іслам? Але такая свабода слова падобная да свабоды спраўляць малую патрэбу на вуліцы. Гэта эгаістычная, пустая свабода слова. Такая свабода не ўзвышае эўрапейскую ідэю — яна робіць яе пасьмешышчам. Гэта свабода без мазгоў і сэрца — таму яна мала чаго вартая. Высьмейваць таго, хто выкарыстоўвае імя Мухамада ў злачынных мэтах — адзнака сьмеласьці. Высьмейваць Мухамада — нізасьць.

## Фундамэнталісты, але не мусульмане

Самае дзіўнае, што самі мусульмане (прынамсі тыя, хто бяруцца прамаўляць на ўвесь сьвет ад іх імя) гэтай хібы карыкатураў не заўважаюць. Яны не шукаюць схаваных сэнсаў, а б'юць у лоб: вы стварылі выяву прарока! «Чаму вы ўспрымаеце карыкатуры менавіта ў такім вузкім сэнсе? — спытаецца эўрапеец. — Ці не прымітыўны такі літаральны падыход? Чаму вы лічыце, што гэта канкрэтныя выявы самога прарока, а не абстрактныя сымбалі радыкалізму?» Але эўрапейская культура прадукуе найперш пытаньні, усходняя — найперш адказы. Простыя і адназначныя. Напісана «твар Мухамада» — значыцца гэта і ёсьць твар прарока. Намаляваў — расплачвайся.

17 міністраў унутраных справаў краінаў, дзе іслам ёсьць галоўнай рэлігіяй, склалі калектыўнае патрабаваньне да дацкага ўраду і каралеўскай сям'і перапрасіць і пакараць рэдактара газэты (хочацца верыць, што мелася на ўвазе звольніць, а не закідаць каменьнямі). Гэтым яны выявілі сваё глыбіннае неразуменьне дачыненьняў паміж дзяржавай і прэсай у Заходняй Эўропе. Яны зьмерылі Данію сваёй меркай. Гэта ў Ярданіі (якая, дарэчы, лічыцца прагрэсіўнай у пытаньнях свабоды прэсы) саджаюць журналістаў на некалькі месяцаў у турму толькі за тое, што яны крытыкуюць урад. Дый самі газэты там належаць асобам, блізкім да каралеўскай сям'і.



Дзіцячы пісьменьнік Корэ Блютген. Яго экспэрымэнт з дацкай свабодай слова перарастае ў гандлёвую вайну.

Гэта, дарэчы, не выключае надзвычайных здарэньняў: Джыгад Мамані, галоўны рэдактар штотыднёвай ярданскай газэты «Шыхан», асьмеліўся перадрукаваць сумнавядомыя дацкія карыкатуры. Ягоны камэнтар: «Хто ганьбіць іслам больш? Замежнік, які стварае выяву прарока, ці мусульманін, які апранае пояс шагіда ды ўзрывае сябе на вясельлі ў Ярданіі?» Рэдактара звольнілі. А варта было б задумацца над ягонымі словамі.

Зрэшты, звольнены рэдактар папрасіў даравацца. Але не ў людзей — у Алага. А яшчэ выказаў зьдзіўленьне, чаму мусульманскі сьвет дагэтуль ня можа пачуць таго, што дацкі ўрад ды газэтчыкі ўрэшце перапрасілі-такі.

Ня можа ці ня хоча? Ад наведніка мячэту ў бэрлінскім раёне Тэмпэльхоф неяк давялося чуць такую гісторыю. Малады турак, які эміграваў у Нямеччыну, задумаў ажаніцца з маладой немкай. Але запатрабаваў ад жонкі, каб тая прыняла іслам. Яна згадзілася, але ня проста прыняла веру, а пачала ўнікаць у яе сутнасьць. Праз год яна падала на развод. Чаму? Бо, паглядзеўшы на мужа, яна зразумела, што жыве ён зусім не па прынцыпах ісламу. Выйшла, што яна — мусульманка — грашыць, бо жыве ў шлюбе зь няверным. Такім чынам, тое, што ты паводзіш сябе як фундамэнталіст, яшчэ ня значыць, што ты добры мусульманін. А калі ты пагражаеш сьмерцю іншаму, хутчэй за ўсё, ты не мусульманін зусім.

## Хрысьціянскі погляд

Дыспут з ісламам вядзецца найперш са сьвецкіх пазыцыяў. А як мусіць рэагаваць на карыкатуры хрысьціянін? Думаецца, што адмоўна. Па першае, «не судзіце». У тым ліку і іншаверцаў. Па другое, «ня ўводзь у спакусу», а менавіта гэта і зрабілі карыкатурысты, спраўкаваўшы выхад на паверхню найгоршага, што ёсьць у ісламскім сьвеце. Па-трэцяе, «па справах іх пазнаеце іх». Надта ўжо горкі плён прынесла праца дацкіх карыкатурыстаў. На пацьвярджэньне гэтаму, Ватыкан ужо асудзіў зьяўленьне карыкатураў як абразу пачуцьцяў вернікаў.

Эўрапейца ня зьдзівіш «жанатым Ісусам» ад Дэна Браўна, экранізаванай «Апошняй спакусай Хрыста» ды ўкрыжаванай лялькай Барбі. Абураюцца многія, вось толькі рэагуюць яны на гэта па-іншаму. Найчасьцей — словам на слова. Ці ігнараваньнем. Хрысьціянская (як, зрэшты, і

эўрапейская) культура — культура свабоды выбару. Не падабаецца — не глядзі, не чытай, ня слухай. У пэўным сэнсе менавіта такія правакацыйна-спакусьлівыя зьявы і робяць магчымым выбар, які надае веры сапраўдную вартасьць. У ісламскіх краінах усё па-іншаму. Вось толькі што на гэта больш уплывае — іслам ці традыцыі ўсходняй дэспатыі?

## Карыкатуры памерлі

Пратэсты ды падпалы амбасадаў у арабскіх краінах ня дужа падобныя да цалкам спантаннага народнага рушэньня. Кіраваць натоўпам немагчыма, але яго можна накіроўваць — што, з усяго відаць, умела робяць радыкальныя духоўныя лідэры. Антыдацкія дэманстрацыі ў Іране праходзяць пад дзяжурнымі лёзунгамі «сьмерць Амэрыцы» ды «сьмерць Ізраілю», распаўсюджваюцца дзікія чуткі пра тое, што дацкі ўрад патаемна рыхтуе выданьне «фальшывага Карану». Эўрапейцам нават немагчыма са спакойным сэрцам перапрасіць — надта ўжо падобна гэта да ўкленчваньня перад тымі, для каго вера — найперш улада. Голасу памяркоўных мусульманаў проста ня чутна — яны зрабіліся закладнікамі гарлапанаў-радыкалаў.

Бясспрэчна, карыкатурысты зрабілі глупства. Але за яго ім пагражаюць сьмерцю. Каб ясьней адчуць гэтае пячорнае дзікунства, перанясём сытуацыю на беларускую глебу. Уявіце сабе, што «НН» вырашыла перадрукаваць дацкія карыкатуры. Што далей? Андрэй Дынько ў сьпісе сьмяротнікаў? Думаеце, нерэальна? Глябалізацыя, не забываймася. Усе адной вяроўкай зьвязаныя. Тым больш дзівіць пазыцыя нямецкай асацыяцыі журналістаў, якая пасьпяшалася асудзіць газэтчыкаў у той момант, калі яны пачалі атрымліваць лісты з пагрозамі ды фота, на якіх выяўленыя абгарэлыя трупы.

Аднак друкаваць карыкатуры на знак салідарнасьці ўжо занадта позна. Калі малюнкі зьмясьціла на сваіх старонках дацкая газэта, гэта была спроба паказаць: мы не баімся. Нягеглая спроба, калі казаць шчыра. Калі ў студзені карыкатуры перадрукавалі іншыя эўрапейскія газэты, гэта была ўжо праява журналісцкай салідарнасьці — і зьмест карыкатураў тут адышоў на другі плян. Цяпер жа на другі плян адышла і сама салідарнасьць — уперад выступіла палітыка. А мэдыі не павінны рабіць палітыку. Яны павінны несьці слова. Таму карыкатуры нельга друкаваць, бо іх папросту больш не існуе — яны ператварыліся ў палітычны сымбаль. Але прынцыпова салідарызавацца з тымі, хто іх зьмясьціў, трэба, бо журналіст мае права на памылку, а яшчэ ён мае права не расплачвацца за гэтую памылку сваім жыцьцём.

Галоўная выснова: даўні канфлікт паміж дзьвюма культурамі выразіўся ў канфлікце паміж дзьвюма бескультур'ямі, увасобленымі ў недалёкіх карыкатурыстах і сьляпых рэлігійных фанатыках. Мы напісалі брыдкае слова на дзьвярах суседа, а ён пагнаўся за намі зь сякерай. Камунікацыя паміж Захадам ды Ўсходам дагэтуль знаходзіцца на ўзроўні камуналкі.

Дарэчы, кніжку сваю Корэ Блютген усё-такі выдаў. Выданьне шыкоўнае. Вось толькі імя мастакаілюстратара ў ім вырашылі не пазначаць.

> Даўні канфлікт паміж дзьвюма культурамі выразіўся ў канфлікце паміж дзьвюма бескультур'ямі



МАЛЮНАК СЯРГЕЯ ХАРЭЎСКАГА

# Муфтый Абубакір Шабановіч: Безумоўна, мы абражаныя

**Рэакцыя беларускіх мусульманаў на публікацыю эўрапэйскімі СМІ карыкатураў:**

Муфтый Абубакір Шабановіч: «Безумоўна, мы абражаныя цынічным выкарыстаньнем самаго панятку «свабода слова» ў такіх мэтах. Муфтыят Беларусі мае правесьці сход, які з улікам меркаваньняў вернікаў агучыць афіцыйны зварот, у тым ліку і да кіраўніцтва тых краінаў, СМІ якіх дазволілі сабе такі выпад у бок мусульманаў».

## Катавіцы пасьля катастрофы

2 лютага апоўначы ў Польшчы скончылася 3-дзённая нацыянальная жалоба ў сувязі з будаўнічай катастрофай у Катавіцах, дзе абваліўся дах выставачнага павільёну. Загінулі 63 асобы, а 141 была паранена.

Нягледзячы на заканчэньне аб'яўленай прэзыдэнтам агульнапольскай жалобы, ваявода Сылезіі заклікаў жыхароў рэгіёну хаця б да канца тыдня стрымацца ад ладжаньня гучных забаваў.

На месцы суботняй катастрофы ў Катавіцах ужо пачынаюцца ўступныя працы па дэмантажы разваленага будынку. Перашапачаткова дэмантаж будуць праводзіць вельмі асьцярожна, бо пад развалінамі ўсё яшчэ знаходзіцца шмат рэчаў загінулых. Пад кантролем пракурораў і паліцыі ўсе знойдзеныя рэчы будуць перавезены ў спэцыяльна падрыхтаваны склад. Асабістыя рэчы пацярпелых трапляюць у дэпазыт гарадзкой паліцыі ў Гожаве.

## Супраць крыптарэклямы

11 арганізацыяў і фірмаў падпісалі Дэклярацыю пра супрацьдзеяньні схаванай рэкляме. Адным з падпісантаў дакумэнту зьяўляецца Польскае радыё.

У дэклярацыі сыгнітарыі абавязаліся супрацьдзейнічаць зьяве схаванай рэклямы, карупцыі й дэзынфармацыі ў мэдыях. Яны плянуюць таксама апрацаваць этычны кодэкс і правесьці адпаведныя курсы для працаўнікоў.

Усе будуць дзяліцца між сабою інфармацыяй. Калі выдавец апублікуе рэклямны тэкст пад выглядам журналісцкай працы, то пра гэта будуць паведамляць у Палату прэсавых выдаўцоў.

З дасьледаваньняў вынікае, што больш за палову палякаў маюць уражаньне, быццам зьмест польскіх мэдыяў зьяўляецца схаванай рэклямай. Кожны другі, зьвязаны са сьветам мэдыяў, уважае, што часта СМІ падаюць матэрыялы пра фірму альбо прадукт узамен за платную рэкляму. Усе згодныя: у Польшчы крыптарэкляма становіцца ўсё больш заўважнай праблемай.

Дэклярацыя — гэта адзін з вынікаў пачатай паўтара году таму акцыі «Чыстая інфармацыя», якая праводзіцца з мэтай абмежаваць крыптарэкляму ў польскіх СМІ.

## Асьцярожна на падляскіх дарогах!

Усё горшыя ўмовы на падляскіх дарогах. Ва ўсходнім рэгіёне — галалёд і вельмі сьлізка. Асабліва неспрыяльныя ўмовы на поўдні Падляскага ваяводзтва. Абледзянелыя дарогі ў ваколіцах Гайнаўкі, Бельску Падляскага й Сямятыч. Асьцярожнасьць варта захаваць таксама пешаходам з увагі на сьлізкія тратуары і ўзбочыны. Дайшло да здарэньня на трасе Граева—Райгарад. Сутыкнуліся 2 аўтамабілі й сані. 1 асоба загінула, а тры параненыя.

**Паводле беларускай службы радыё «Палёнія»**

НАВІНЫ ЭЎРАЗЬВЯЗУ

## ЭЗ і ЗША заклікаюць беларускія ўлады дзейнічаць у інтарэсах сваёй краіны

Эўразьвяз і ЗША нагадваюць аб сваім жаданьні палепшыць і зблізіць стасункі зь Беларусьсю, але па-ранейшаму выказваюць рашучасьць падтрымліваць дэмакратыю і грамадзянскую супольнасьць у Беларусі.

Беручы пад увагу занепакоенасьць будучымі прэзыдэнцкімі выбарамі, ЭЗ і ЗША дамовіліся аб наведваньні Менску для сустрэчы на высокім узроўні з прадстаўнікамі ўраду. Але беларускія ўлады адмовіліся выдаць візы гендырэктару замежных і палітычна-ваенных справаў Рады ЭЗ Робэрту Купэру і памочніку дзяржсакратара ЗША па Эўропе Дэніелу Фрыду. У адказ чыноўнікі ЭЗ і ЗША вырашылі скасаваць супольны візыт на высокім узроўні. «Мы расчараваныя тым, што беларускія ўлады адмовіліся ад магчымасьці правядзеньня адкрытага дыялёгу зь міжнароднай супольнасьцю. Мы спадзяёмся, што выбары 19 сакавіка будуць свабодныя і пройдуць у рамках міжнародных стандартаў і ў адпаведнасьці з забавязаньнямі перад АБСЭ і ААН. Калі будуць аказаныя спробы ўплыву на вынікі прэзыдэнцкіх выбараў, ЭЗ і ЗША (...) прымуць адпаведныя захады. Мы настойваем на тым, што палітыка ЭЗ і ЗША — гэта не ізаляцыя Беларусі. Мы жадаем бачыць дэмакратычную, стабільную і заможную краіну з моцнымі лучывамі зь міжнароднай супольнасьцю. (...) Пасьлядоўны й бесьперапынны рух у правільным кірунку дазволіць Беларусі як найлепей скарыстаць з ініцыятывы «Эўрапейская суседзкая палітыка». Мы гатовыя даць руку Беларусі і яе народу. І настойваем на тым, каб беларускія ўлады дзейнічалі ў інтарэсах свае краіны і яе народу», — гаворыцца ў адпаведнай заяве.

## Аптыміст Саляна

Камісар ЭЗ па пытаньнях замежнай палітыкі й пытаньнях бясьпекі Хаўер Саляна выказаў упэўненасьць у дынамічным разьвіцьці Эўразьвязу. Выступаючы ў Зальцбургу (Аўстрыя) на канфэрэнцыі «Гучаньне Эўропы», прысьвечанай праблемам эўрапейскай ідэнтычнасьці, ён заявіў: «Я бачу Эўропу сілай дабра ва ўсім сьвеце. Пэсымізм ў дачыненьні да яе моцна перабольшаны». Гэты выраз стаў адказам Саляны ў межах дыскусіі па праблеме «канстытуцыйнага крызісу» пасьля няўдалых рэфэрэндумаў у Францыі й Нідэрляндах. Пры канцы студзеня Х.Саляна сустрэўся з адзіным кандыдатам на пасаду прэзыдэнта ад дэмсілаў Аляксандрам Мілінкевічам. На сустрэчы была абмеркаваная новая палітыка Эўразьвязу ў дачыненьні да краінаў, дзе дэмакратыя й правы чалавека знаходзяцца пад пагрозай, а менавіта: дапамога ў атрыманьні вышэйшай адукацыі студэнтам, што былі выключаныя зь беларускіх ВНУ па палітычных матывах, пошук працы для спэцыялістаў, што пазбавіліся працы з гэтай жа прычыны.

## 60 мільёнаў для Балканаў

Эўразьвяз у найбліжэйшы час выдаткуе 60 млн эўра дапамогі балканскім краінам — не сябрам ЭЗ для іх прыцягненьня ў агульнаэўрапейскі рух. Інвэстыцыі мусяць спрыяць стварэньню зоны вольнага гандлю паміж краінамі рэгіёну.

## Новы плян

Пачаў дзейнічаць новы, разьлічаны на сем гадоў, плян Эўракамісіі. Ягоныя галоўныя прыярытэты — забесьпячэньне занятасьці й росту дабрабыту грамадзянаў ЭЗ. У фінансаваньні лякальных праграмаў возьмуць удзел Эўрапейскі фонд рэгіянальнага разьвіцьця, Сацыяльны фонд і Фонд супрацы.

## Пошук альтэрнатыўнай энэргіі

Да 2030 г. 90% нафты й 80% газу Эўразьвяз будзе імпартаваць з Расеі й Блізкага Ўсходу. Чыноўнік ЭЗ Андрыс Пібалгс на сустрэчы з прадстаўнікамі нацыянальных парлямэнтаў краінаў ЭЗ заявіў: «Кожны дзень, калі мы марудзім з укараненьнем энэргазьберажэньня — гэта страчаны для нас дзень. Чым хутчэй — тым лепей».

**Падрыхтавана пры падтрымцы Прадстаўніцтва Эўрапейскай камісіі ва Ўкраіне і Беларусі**
**http://www.delblr.cec.eu.int**

# Іваноў заўжды гатоў



Расея лічыць, што мае права ўмешвацца ва ўнутраныя справы Беларусі. Піша **Аляксандар Класкоўскі**.

Сусьветную прэсу абляцела зробленая ў Мюнхэне заява расейскага віцэ-прэм’ера і міністра абароны Сяргея Іванова: калі ў часе выбараў у Беларусі пачнуцца забурэньні, Масква будзе *«рэагаваць адмоўна»*. А ўвогуле — *«мусім зрабіць усё»*, каб такога ня здарылася.

Натуральна, гэта найперш рыторыка. Цяжка ўявіць, каб вакол Карла Маркса, 38 натапырыліся рулямі танкі Таманскай дывізіі ці пскоўскія дэсантнікі.

Мэсыдж болей скіраваны на заходнікаў, якія апошнімі тыднямі дэманстрацыйна прылашчылі Мілінкевіча. Бо паралельна Брусэль ды Страсбург раз-пораз рытуальна заклінаюць, каб Крэмль паспрыяў дэмакратычным зьменам у Беларусі. Вось Іваноў і адказаў: ага, зараз!

Глыбейшы падтэкст такі: лепей ня лезьце ў беларускі гарод са сваім дэмакратычным рылам, бо гэта наша зямля!

Скажаце, згушчаю фарбы? Тады паглядзеце інтэрвію Іванова «Frankfurter Allgemeine Zeitung» (дадзенае, трэба думаць, акурат падчас гэтага візыту ў Нямеччыну). Там расейскі дзеяч яшчэ болей шчыры. Танны газ для лепшага хаўрусьніка ён, напрыклад, патлумачыў тым, што «Расея ёсьць уласьніцай транспартнай сыстэмы ў Беларусі».

Для Лукашэнкі, які заяўляе, што за сьпінай народу нікому нічога не аддаў і не аддасьць, гэта, пэўна, вялікая навіна. Бо расейцы валодаюць у нас толькі адрэзкам «Ямала—Эўропы», але ж не «Белтрансгазам». Ці мы чагосьці ня ведаем?

А вось вам яшчэ адна пэрліна ад Іванова: «Беларусы і расейцы ў прынцыпе адзіны народ. І мы ствараем саюзную дзяржаву, ня надта хутка, але мэта застаецца».

Якая мэта, здагадацца няцяжка. Іваноў зь ягоным эўрапейскім глянцам ды добрай ангельскай мовай фактычна праклямуе замшэлыя тэзы вялікадзяржаўнага шавінізму. Кажуць — «інтэграцыя», а маюць на ўвазе — «інкарпарацыя».

Падкрэсьлім: нашу краіну разглядае як вотчыну не якісьці маргінал-радыкал, а імаверны пераемнік Пуціна, будучы гаспадар Крамля.

І гэта не экспромт. У студзені той самы Іваноў выступіў у «The Wall Street Journal» з праграмным артыкулам «Расея павінна быць моцнай». Ён наўпрост заявіў: «Сытуацыя ў пэўных краінах СНД і рэгіёнах побач зь імі — галоўнае, што выклікае ў нас заклапочанасьць». Зброяй

жа забесп
імпэрскіх
іржавых р
газ. Не вы
мюнхэнс
Іванова п
надта пер
газавымі.
канцэпцы
Маскоўск
адзначаю
выступ у
выходзяш
кампэтэн
міністра,
толькі пас
Пуціна.
Натураль
беспардо
абурылі а
незалежн



ыпячэньня
к інтарэсаў замест
ракет становіцца
ыпадкова і ў
ікіх выказваньнях
раблемы бясьпекі
раплеценыя з
. Гэта новая
ыя «вялікай Расеі».
кія аглядальнікі
ць: праграмны
пытаньнях, што
ь за межы
цыі сілавога
мог адбыцца
сьля адмашкі

на, што
нныя пасажы
пазыцыянэраў-
ікаў. Але ці

**Марозам павеяла ад мюнхэнскай заявы расейскага міністра абароны Сяргея Іванова. Колькі нам яшчэ глядзець на сьвет праз заледзянелае шкло саюзнай дзяржавы?**

даспадобы заявы Іванова дзейнаму беларускаму кіраўніку — таксама вялікае пытаньне. Бо падтэкст можа быць і такі: мы цябе, вядома, падтрымаем, але ж глядзі — па рахунках трэба разьлічвацца... Ці выпадкова ў апошніх Лукашэнкавых прамовах гучыць прадчуваньне газавай вайны?

Нават цяперашняй уладзе івановы на танках тут не патрэбныя. Наша незалежнасьць ужо адбылася. А ўжо калі да яе дадасца дэмакратыя, то кошты на газ неяк перагрываем. Дай бог, каб гэта была адзіная плата.



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Бінга. Бінга. Бінга



Назіраючы на аўтобусным прыпынку, як натоўп узяў у аблогу лятарэйшчыкаў, я падумаў: рана ці позна ахвярай захапленьня азартнымі гульнямі абавязкова стане адзін зь вядоўцаў шматлікіх «лята». Фэльетон **Лёліка Ушкіна.**

Гісторыя пачалася з таго, што сяброў ФПБ прымусілі набыць білеты лятарэі «Дажынкі». Не адкруціўся і Андрэй Кастра, які вёў на БТ шоў «Чэснае лято».

Білет выйграў. Кіпяцільнік фірмы «Экран». Кіпяцільнік Кастра падараваў суседу-алькашу Францавічу з умовай, што той будзе выносіць ягонае сьмецьце.

Прайшоў месяц, і пабачыўшы старшыню прафкаму, Кастра, прыгадаўшы пацешны выпадак, сам папрасіў дзьве лятарэі. Зноў фарт! Кожны білет прынёс па кіпяцільніку. Андрэй набыў яшчэ тры. Аднак цяпер ніводзін ня выйграў. Фіяска супала зь нейкімі праблемамі, і артыст заключыў, што шчасьце яго пакінула. Каб праверыць вэрсію, набыў жменю білетаў — зноў невязуха. Увесь на нэрвах кінуўся набываць усё болей: 14, 34, 78, 134… Францавіч ўжо не пасьпяваў выносіць макулятуру.

Раптам Кастра прыгадаў, што калі выйграў упершыню, едучы на працу, спрытна падрэзаў нейкі мэрс. Парушэньне правілаў ДТР стала для яго чымсьці кшталту рытуалу. Гэтым разам скончылася ўсё амаль трагічна: Андрэй падрэзаў картэж бацькі… Ледзь абышлося.

Ад гэтага часу герой закінуў лятарэі. Спачатку думаў стаць кліентам букмэйкераў, аднак яго «кінулі». «Шукаеш вярняк? — спытаў нейкі тып. — заўтра «Менская лыжня». Там бяжыць міністар культуры. Я бачыў яго алюр! Стопудовы шанец. У чорным таталізатары на яго прымаюць 1 супраць 34». Ашалелы Кастра заклаў кватэру, але прайграў. Самі ж ведаеце, хто перамагае на той лыжні.

Тут Кастра вырашыў падмануць Фартуну: адфільтраваўшы асыстэнтку па перадачы, якая выцягвае зь меху бочачкі лято, наехаў, каб тая выцягнула спэцыяльную камбінацыю.

Пачаўся розыгрыш тыражу. Адпаведна з дамовай з Кастра дзяўчынка выцягвала бочачкі з патрэбнымі нумарамі, а той голасна ў стылі шоўмэна іх абвяшчаў: «11» — барабанныя палкі», «8 — воўк і сямёра казьлят» і нарэшце апошняя бочачка… (Кастра ўжо бачыў тыя мільярды). «Тры» — «трэці нелегітымны тэрмін»… Адразу ж тэлекарцінка прапала. Вынікі розыгрышу абвесьцілі несапраўднымі.

Пасьля гэтага доўга пра Кастра не было чутно. Пакуль не знайшлі труп Францавіча. Суседзі прыгадалі, што чулі зь яго пакою енкі: «Аддай шчасьлівы кіпяцільнік!» «Я яго прапіў». — «Брэшаш, вось табе, вось…»

Сёньня Кастра ў пошуку. Апошні раз яго бачылі на Кульмана, дзе, набыўшы школьны праязны, паабяцаў кіяскёрцы, што вернецца за сваім прызам. Як вядома, усе уладальнікі абанэмэнтаў аўтаматычна становяцца ўдзельнікамі лятарэі Менскгартрансу. МУС ужо арганізаваў у тым кіёску засаду.

# Карані і мэта праекту “Казулін”

Працяг са старонкі 2.

Шляхецкая анархія, якая ў XVII—XVIII стагодзьдзях прывяла да заняпаду Рэчы Паспалітай, рэдка бывала спантаннаю. Шляхцюкоў падкупалі, каб яны сваім вэта зрывалі соймы, што паралізавала ўладу. Гэты мэханізм асвоілі магнаты, з часам гэтую тактыку перанялі суседнія дзяржавы, Прусія і Расея, якія квапіліся на землі Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў.

Сучасныя расейскія паліттэхнолягі на чале з Паўлоўскім запазычылі некаторыя старыя мэтады з імпэрскага арсэналу.

Нікому ў штабе Мілінкевіча не прыходзіла да галавы ісьці на перамовы з Гайдукевічам. Між тым ад моманту, калі Казулін бяз дай прычыны ўхіліўся ад удзелу ў Кангрэсе дэмакратычных сілаў, нічога яго ня розьніла ад Гайдукевіча тыпалягічна.

Так, штаб Мілінкевіча зрабіў памылку, пайшоўшы на перамовы з Казуліным на роўных. Застаецца зрабіць высновы.

Чаму так позна раскусілі?

Таму што праект прасоўваўся як псэўданезалежнымі мэдыямі, так і часткаю нацыянальнай інтэлігенцыі. Людзьмі самаўпэўненымі, амбітнымі, але палітычна нізкавокімі, якія спыніліся ў сваім палітычным разьвіцьці на сярэдзіне 90-х гадоў.

Што з гэтага будзе?

Магчыма, расейскія кансультанты падрыхтавалі праект “Казулін” для атрыманьня другога месца “па выніках падліку галасоў”. Таму мы ўжо бачым **(старонкі 4—5)** і неўзабаве яшчэ пабачым, як уся агнявая моц лукашэнкаўскае прапаганды, а таксама тандэму Казулін-Гайдукевіч будзе скіравана на дэмакратычнага кандыдата.

Тры магчымыя тлумачэньні дзеяньняў самога Казуліна — інстынкт самазахаваньня на палітычным полі, інсьпірацыя з лукашэнкаўскай адміністрацыі, інсьпірацыя з Масквы. Ніводнага з гэтых варыянтаў няможна выключаць.

Калі найлепшыя нашы юнакі гніюць у турмах за свае перакананьні, калі беларуская культура перажывае пякельна цяжкія часы, спробу дэзарыентаваць незалежнае грамадзтва нельга разглядаць як нявінную гульню дзеля самазахаваньня **(старонка 5)**, яна мае на мэце захаваць цяперашні стан рэчаў. І гатоўнасьць аўтараў праекту спэкуляваць дзеля дасягненьня сваіх мэтаў нават на нацыянальнай сымболіцы і імені Быкава, інакш як цынічнай не назавеш.

Горка, што ў праект “Казулін” уцягнулася частка нацыянальнай інтэлігенцыі, кіраваная ўласнымі догмамі, апантаная амбіцыямі або матэрыяльным бокам жыцьця. Паўтараецца нядаўняе савецкае мінулае, калі белінтэлігенцыю падкупалі машынамі і кватэрамі. Хіба што маштаб зьмяльчаў. А хто непадкупны, тымі па-старому маніпулююць з упорам на перакананьні.

Тое самае аказалася датычным і незалежных СМІ. Як паказаў маніторынг Беларускай асацыяцыі журналістаў, у «Народной волі» з 16 да 27 студзеня Казуліну адводзілася 18,7% плошчы ад усіх публікацый, прысьвечаных суб’ектам выбарчай кампаніі. Для параўнаньня, Мілінкевічу — 2,4%. Пры чытаньні на папулярным сайце загалоўкаў кшталту “Мілінкевіч і Казулін: хто зь іх Ганчарык”, застаецца разьвесьці рукамі: наколькі нізкая рэзыстэнтнасьць нашага незалежнага грамадзтва. А яшчэ пра перамены марым…

Што й гаварыць пра шараговага выбарца. Вось што піша нам Сяргей зь Менску: “Мілінкевіч, Казулін і Гайдукевіч павінны сесьці за стол і вызначыцца, хто зь іх павінен працягваць барацьбу. Навошта дэмакратычным сілам ажно тры кандыдаты? Гэта ж толькі блытае людзей”.

Сяргею, мусіце ясна зразумець: няма трох кандыдатаў. Наш кандыдат адзін. Незалежнае грамадзтва выбрала яго на Кангрэсе дэмакратычных сілаў.

Падводзячы рысу: нацыянальная салідарнасьць нізкая, незалежнае грамадзтва слабае, Мілінкевіч вымушаны ісьці адзін супраць трох, і няма юшчанкаўскіх Кінаха і Мароза, якія б сталі зь ім поплеч. У той жа час апаніраваць Мілінкевічу за Лукашэнку будуць іншыя.

Галоўнае зараз — вучыцца на памылках, каб не наступаць двойчы на адныя граблі. Задачай наступнай пяцігодкі хай стане ўзмацненьне нацыянальнага брацтва.

# Дзякуй, фраў Мэркель

Працяг са старонкі 2.

**Сустрэчы Мілінкевіча мелі яшчэ адзін важны вынік, пра які сам лідэр зразумела змоўчвае, але які пераважвае аргумэнты крытыкаў, што выступаюць супраць паездак па замежжы. Сустрэчы на такім высокім узроўні далі лідэру Свабоднай Беларусі своеасаблівыя гарантыі асабістай бясьпекі. Сцэнар раптоўнага «зьнікненьня Мілінкевіча» цяпер падаецца нерэальным. Гэта таксама немалаважны плён дыпляматычнага прарыву, ажыцьцёўленага Мілінкевічам.**

**Водгукі эўрапейскай прэсы на паездкі Мілінкевіча агледае Алесь Кудрыцкі — старонка 14.**

## ПЕРАПІСКА З АЎТАРАМІ

Я быў непрыемна зьдзіўлены, калі ўбачыў у №3, што ад маёй зацемкі пра С.Домаша пакінулі толькі пачатак, дапісаўшы тое, да чаго я ня маю дачыненьня. Да гэтага чалавека я па-ранейшаму стаўлюся нармальна, з павагай.

**Сяргей Максімовіч, Горадня**

**Ад Рэдакцыі:** Да тэксту Сяргея Максімовіча, дасланага з Горадні, рэдакцыйны суаўтар дапісаў: «Улады гэтым скарысталіся. Каб пазбавіць Мілінкевіча патэнцыйнага дарадцы, яго паслалі шкуры вычыняць. І ён пагадзіўся». Адпаведна пад артыкулам было два подпісы: Сяргей Максімовіч і Мікола Бугай.

# Ар’ергард Імпэрыі

Лукашэнкаўскі прапагандыст асучасьніў і творча ўзбагаціў «Пратаколы сіёнскіх мудрацоў».

Увечары 3 лютага айчынная грамадзкасьць паглядзела першую частку тэлепраекту Юр’я Азаронка «Духоўная вайна». Фільм прынёс асабіста мне масу станоўчых эмоцыяў ды даў матэрыял для роздуму. Сюжэт фільму просты. У сьвеце здаўна ідзе барацьба сьвятла і цемры. Цемру прадстаўляюць таямнічыя «фарысэі», якія ўкрыжавалі Ісуса Хрыста і стагодзьдзямі змагаюцца зь сіламі дабрыні. У XIX ст. фарысэі зьвярнулі ўвагу на пабудаваную на пачатках «праваслаўя, самадзяржаўя і народнасьці» Расейскую Імпэрыю — сапраўдную райскую краіну, дзе мірна ўжываліся дзясяткі народнасьцяў. Фарысэі зьнішчылі Імпэрыю (галоўны — Троцкі), забілі «найдабрэйшага» цара Мікалая II і яго дзетак і бязьлітасна выкарыстоўвалі Расею для ажыцьцяўленьня плянаў па сусьветнай рэвалюцыі. Ад разбуральнай дзейнасьці фарысэяў выратаваў краіну Ёсіф Сталін, «аб’яднаўшы народ і вярнуўшы краіне былую магутнасьць». Ад цытаваньня «Пратаколаў сіёнскіх мудрацоў» і «Тэстамэнту Сталіна» Азаронак адмовіўся, але фільм прасякнуты духам адыёзных твораў расейскіх чарнасоценцаў. Пасьля Сталіна таксама фарысэй Гарбачоў разваліў СССР. Мясцовыя беларускія фарысэі, на чале, вядома ж, зь Зянонам Пазьняком, хацелі разваліць Беларусь, аднак прыйшоў Ён і выратаваў краіну (Ён у кадры ў простай ільняной кашулі абдымае каласы пшаніцы). Асобны пункт — пастаянныя паралелі паміж ЗША і гітлераўскай Нямеччынай. Пры гэтым выходзіць так, што менавіта амэрыканцы і раскруцілі Гітлера і фінансавалі ўсю яго дзейнасьць. Напрыклад, нямецкія танкі ў 1941 г. запраўляліся бэнзінам фірмы «Стандард Ойл», фірма IBM выпускала апараты для падліку зьнішчаных у Асьвенціме габрэяў, а «Кока-Кола» забясьпечвала Вэрмахт напоем пад назвай «Фанта». У сваю чаргу дзядуля цяперашняга прэзыдэнта ЗША праз сваю банкаўскую сыстэму перапраўляў грошы для НСДАП. Не магу назваць сябе вялікім прыхільнікам мэтадаў распаўсюджаньня дэмакратыі амэрыканцамі, аднак нашто займацца непрыхаванай хлусьнёй? Ну хто ня ведае зараз, што нямецкія танкі, якія рванулі ў 1941-м да Масквы, былі запраўленыя не амэрыканскай, а бакінскай нафтай, якой Сталін амаль два гады забясьпечваў Гітлера і што Дж.Буш-старэйшы, зьбіты нямецкім зьнішчальнікам, некалькі дзён плаваў у Паўночным моры. Пра Курапаты і гаварыць ня хочацца. Дзесяць гадоў таму Ю.Азаронак пабудаваў фільм «Дети лжи» выключна на нэгатыве, не спрабуючы стварыць нейкай «нацыянальнай ідэалёгіі». У «Духоўнай вайне» ідэалягічны падтэкст адчуваецца вельмі моцна, Ю.Азаронак паспрабаваў зрабіць вельмі няўдзячную справу — уціснуць у сорак хвілінаў этэру «национальную идеологию белорусского государства» — і... скаціўся ў банальны папулізм. Нельга аб’яднаць сьвяткаваньне Дня Кастрычніцкай рэвалюцыі з байкамі пра найдабрэйшага расейскага цара Мікалая II, нельга аб’яднаць сьвяткаваньне дня Перамогі ў 1945-м з пэрманэнтнай хлусьнёй аб тым, якім коштам далася нам гэтая Перамога, нельга зноў і зноў падымаць на шчыт Сталіна, глумячыся над касьцямі тысячаў хрысьціянаў у Курапатах. Сыстэма кідае кожнаму па кавалачку ідэалёгіі, які каму больш спадабаецца. Старым — крышачку памяці пра савецкую мінуўшчыну, маладзейшым — адкрытую чарнасоценшчыну накшталт той, зь якою змагалася «Наша Ніва» сто гадоў таму, зусім маладым — вельмі проста: «Уступай у БРСМ, атрымаеш бясплатны праход на дыскатэку». Усё гэта ня склейваецца, патыхае містыкай і перанасычана сымбалямі, усім, што азначае пачатак крызісу любой папулісцкай сыстэмы. Сп.Азаронка зразумець можна, яму сьніцца Імпэрыя, а ва ўмовах маленькай Беларусі выходзяць у найлепшым выпадку нейкія «трагічна-сьмяшлівыя абразкі». Што такое ваша Імпэрыя, спадар Азаронак? Можа, гэта саслужыўцы таго няшчаснага салдата, якому адбілі ногі пад Новы 2006 год; можа, гэта супрацоўнікі таго згарэлага банку ва Ўладзівастоку, якія выскоквалі зь дзясятага паверху, калі іх начальства ратавалася па адзінай спэцыяльнай лесьвіцы, а можа, гэта Газманаў, які скача перад натоўпам моладзі зь песьняй аб тым, што яго зрабілі ў СССР? Азірніцеся, спадар Азаронак, паглядзіце на нашу цяперашнюю пабрацімку-Расею. Агромністая, ад Смаленску да Сахаліна, пустэча, зь якой высмоктваюць апошнюю кроў пухліны шматмільённых касмапалітычнах мэгаполісаў, ды нафтавыя вышкі пасярод гэтай пустэчы, што забясьпечваюць усім неабходным Захад і завальваюць грашыма кучку ўладароў гэтай няшчаснай краіны. Мы ж, беларусы, замест таго, каб вырашаць свае праблемы, ізноў высоўваем бязглуздыя мэсіянскія ідэі аб тым, што Белая Русь аб’яднае Русь Вялікую і Русь Малую, і ў выніку рызыкуем застацца без уласнага дабрабыту, культуры і нават дзяржаўнасьці. Імпэрыі ня будзе, і гэта спадар Азаронак выдатна ведае, нашто ж тады гэта ўсё робіцца? Можа, каб змагацца зь беларускай нацыянальнай культурай і каштоўнасьцямі, бо выходзіць, што ўсё беларускае — ад сатаны, усё, што толькі і можа павярнуць наш народ да памяці, продкаў, Бога і маральных каштоўнасьцяў, аказваецца найбольш небясьпечным. А можа, тут старая як сьвет справа — грошы? У такім выпадку вы, спадар Азаронак, павінны разумець, якую адказнасьць бераце на сябе перад гісторыяй і беларускай нацыяй.

**Андрэй Павач, Горадня**




PHOTO.BYMEDIA.NET

**Юры Азаронак з плякатам «Сэксуальнага маньяка Клінтана — за краты» падчас пікету супраць бамбаваньня Югаславіі. Менск, 1999.**

# Унукі XX зьезду

Партыйны даклад, зроблены паўстагодзьдзя таму ў Маскве, парадаксальным чынам ня страціў сваёй актуальнасьці ў сёньняшняй Беларусі. Піша **Віталь Тарас**.

Успамін дзяцінства. Цудоўным летнім днём дзядуля вядзе мяне на менскі вакзал. Там агромністы натоўп чакае прыбыцьця нейкага цягніка. Мне нічога не відаць з-за сьпінаў людзей, і ў момант, калі цягнік прыбывае на пэрон, дзядуля падхоплівае мяне й саджае на свае плечы. «Глядзі!» — кажа ён. І я бачу, як у тамбуры аднаго з вагонаў зьяўляецца чалавек у сінім, як мне падалося, гарнітуры. Ён усьміхаецца, лысіна блішчыць на сонейку. «Гэта Хрушчоў!» — кажа дзядуля...

Я тады яшчэ ня ведаў, хто такі Хрушчоў. Аднак, калі праўда, што лёс чалавека у чымсьці залежыць ад ягонага ўласнага імя, дык першы сакратар ЦК КПСС адыграў пэўную ролю ў маім жыцьці. Рэч у тым, што бацькі хацелі назваць мяне Мікітам. Але сябры іх адгаварылі. Людзі ж падумаюць, што гэта ў гонар «дарагога Мікіты Сяргеевіча». Сьмеху варта!

### Бомба запаволенага дзеяньня

50 гадоў таму, калі мае бацькі вырашалі пытаньне зь імем свайго нашчадка, разгортваліся рэвалюцыйныя падзеі ў Вугоршчыне. Улетку 1956-га сталініста Ракашы на чале краіны зьмяніў лібэральны камуніст Імрэ Надзь. Ён заявіў пра выхад Вугоршчыны з Варшаўскага пакту. Пры канцы кастрычніка савецкія войскі былі выведзеныя з Будапэшту, але празь некалькі дзён вярнуліся на вуліцы сталіцы. Антыкамуністычнае паўстаньне было патопленае ў крыві, нягледзячы на адчайны супраціў вугорцаў.



Які час — такія й дысыдэнты.

Адзін з радыёжурналістаў да апошняга вёў рэпартаж аб штурме радыёстанцыі, паралельна страляючы ў акно з аўтамата.

За некалькі тыдняў да гэтага былі жорстка задушаныя рэвалюцыйныя выступы апазыцыі ў Польшчы. А пачатак рэвалюцыйным працэсам ва Ўсходняй Эўропе паклаў даклад «лібэрала» Мікіты Хрушчова на XX-м зьезьдзе КПСС.

Тэкст таго дакладу быў апублікаваны ў савецкім друку толькі праз трыццаць гадоў! Аднак зь яго зьместам камуністаў пачалі знаёміць адразу пасьля зьезду на зачыненых партыйных сходах. Інфармацыя не магла доўга заставацца сакрэтнай, і ў чэрвені 1956-га даклад быў апублікаваны на Захадзе, выклікаўшы эфэкт выбуху бомбы — найперш у заходніх, а потым і ў «братніх» кампартыях. Ня толькі маладзёнам, але й людзям старэйшага пакаленьня сёньня цяжка зразумець, у чым рэвалюцыйная сіла дакладу Хрушчова. У падручніках з гісторыі КПСС даклад фігураваў пад невыразнай сухой фармулёўкай «пераадоленьне наступстваў культу асобы». Імя Сталіна пры гэтым, як правіла, не называлася. Альбо называлася неахвотна — як быццам «культ» тае самае асобы ня меў ніякага дачыненьня да геніяльнага генэралісымуса й «арганізатара ўсіх нашых перамог», якім Сталін дагэтуль застаецца для афіцыйнай беларускай прапаганды. Размова вялася пра некаторыя «памылкі» ў будаўніцтве сацыялізму, выкліканыя аб'ектыўнымі абставінамі: цяжкасьцямі росту, варожым атачэньнем, вайной (да разьвязаньня якой камуністы са сваёй тэорыяй сусьветнай рэвалюцыі ня мелі ніякага дачыненьня). Выходзіла, што кампартыя заўсёды паводзіла сябе правільна, толькі на адным этапе правільным было бяссудна расстрэльваць «ворагаў народу», а на іншым — асуджаць асобныя адступленьні ад «сацыялістычнай законнасьці».

Галоўным абвінавачаньнем з боку Хрушчова ў бок Сталіна, як выявілася, былі нават не злачынствы правадыра супраць партыі (партыі, а не народаў!), а тое, што ён, нібыта... ня быў марксістам. Зь іншага боку, большага злачынства на той час цяжка было ўявіць у камуністычнай краіне, дзе афіцыйнай дактрынай паноўнай эліты служыў марксізм-ленінізм. Імя правадыра аддзялялася ад імя Леніна, ідэйную спадчыну якога нібыта аднаасобна прысабечыў і сказіў Сталін. Тым самым ён як бы адлучаўся ад сынкліту «сьвятых» і пераводзіўся ў разрад «нячыстых» рэвізіяністаў — Троцкага, Бухарына ды іншых ворагаў савецкай улады. Сьледзтвам «адлучэньня» стаў вынас цела Сталіна з маўзалею — праўда, гэта адбылося ўжо пасьля XXII зьезду. Унёскам жа Хрушчова ў марксісцка-ленінскую тэорыю было абяцаньне пабудовы камунізму ў бліжэйшай пэрспэктыве. Пры гэтым адной зь неабходных умоваў блізкага шчасьця абвяшчалася зьліцьцё ўсіх моваў у адну — вялікую й магутную...

### Дэманстрацыя пустых сталоў

Паколькі разьвянчаньне «культу асобы» пры Хрушчову не прывяло да заўважнага паляпшэньня ўзроўню жыцьця грамадзянаў, грамадзяне вырашылі, што ўлада крытыкуе Сталіна дзеля таго, каб схаваць ад народу праўду: пры Сталіне было лепей, было весялей!

Тым ня менш, рэабілітацыя мільёнаў ахвяраў сталінскіх рэпрэсіяў (для многіх — пасьмяротная), якая сталася галоўным вынікам XX зьезду, мела станоўчы эфэкт. Найперш для тых, хто вярнуўся зь Сібіру дамоў... Учорашнія палітзэкі нярэдка сустракалі ў сябе на радзіме тых, хто некалі пісаў на іх даносы. Так рэпрэсаваныя беларускія літаратары маглі бачыць пасьля свайго вяртаньня ў родную пісьменьніцкую арганізацыю такую асобу, як Айзік Кучар, намаганьнямі якога некалі патрапілі ў лягер. Што датычыць сьледчых, пракурораў і судзьдзяў, якія вызначыліся, у прыватнасьці, на ніве змаганьня з «буржуазным нацыяналізмам», толькі лічаныя асобы зь іх былі асуджаныя ці хоць бы адпраўленыя на пэнсію. Так што

большасьці ацалелых у лягерах хапіла розуму й абачлівасьці, каб не крытыкаваць адкрыта савецкую ўладу і не казаць усю праўду аб сталінскім ГУЛАГу — прынамсі, да лепшых часоў.
Трэба зазначыць, што калі «лепшы час», недзе пры канцы 1980-х, прыйшоў, высьветлілася, што ў беларускіх пісьменьнікаў амаль нічога няма ў сталох такога, што можна было б паказаць сьвету ў апраўданьне сябе й свайго часу. «Пісаньне ў стол» ва ўмовах БССР выявілася такім самым мітам, як і наіўная вера ў тое, што сапраўдная літаратура пры таталітарызьме можа выжыць дзякуючы «эзопавай мове».
Таталітарнае грамадзтва вымушае літаратуру й мастацтва жыць альбо выжываць пад велізарным, бязьмежным ціскам, які непазьбежна скажае саму прыроду мастацтва, робіць яго сэрвільным.
Калі вяртацца да тэмы ХХ зьезду, дык ён меў і непрадбачаныя вынікі. Нават пры захаваньні «вядучай і накіроўваючай ролі партыі» ў адсутнасьці свабоды слова на старонках некаторых літаратурных выданьняў — у першую чаргу трэба згадаць часопіс «Новый мир» пад рэдакцыяй Аляксандра Твардоўскага — пачалася дыскусія. Праўда, гэта было крыху пазьней, у 1960-я гады. Дыскусія мела, на наш сёньняшні погляд, вельмі абмежаваны характар. Размова вялася пра тое, каб «ачысьціць» сапраўдны сацыялізм ад позьніх «наслаеньняў», вярнуцца да «ленінскіх вытокаў», да правільнага сацыялізму (тагачаснае захапленьне «лёніяннай» не абмінула й Беларусь). А для гэтага, на думку некаторых літаратараў-франтавікоў, была патрэбная ўсяго толькі адна простая ўмова: пісаць праўду. Сярод тых пісьменьнікаў, што спавядалі гэты прынцып, былі Алесь Адамовіч і Васіль Быкаў. Тагачасная цэнзура адразу адчула ў так званай «акопнай праўдзе» падкоп пад падмурак савецкага ладу, а літаратурныя вартаўнікі пачалі цкаваць пісьменьнікаў і публіцыстаў, якія паверылі ў «вецер пераменаў».
Іх называлі «дзецьмі ХХ зьезду», «шасьцідзясятнікамі», і яны гэтым ганарыліся. Многія зь іх засталіся верныя прынцыпам, сфармаваным у 1960-я , да распаду СССР. Самы першы і самы яскравы прыклад — Міхаіл Гарбачоў, які ўсур’ёз зьбіраўся рэфармаваць сацыялізм.

## Лінія Сталіна

Многія «шасьцідзясятнікі» адчулі сябе запатрабаванымі ды кінуліся «плыць у рэвалюцыю далей». Але ілюзіі наконт «сацыялізму з чалавечым тварам» хутка адышлі ў нябыт. Адразу пасьля руйнаваньня камунізму пачалася зусім іншая эпоха — эпоха постмадэрнізму, вызначальнымі рысамі якога можна назваць, бадай, скепсіс і цынізм. Прадстаўнікі новых пакаленьняў, якія прыйшлі на зьмену «шасьцідзясятнікам», самі сябе зьедліва колісь называлі «васьмідзерастамі» й «дзевяностасосамі».
І вось, на пачатку ІІІ тысячагодзьдзя стала зразумела, што ў адной «асобна ўзятай краіне» ўсё вярнулася на кругі свае. Пісьменьнікі-шасьцідзясятнікі, якім дарогу ў літаратуру адкрыў ХХ зьезд, зноў апынуліся ў дысыдэнтах. Што там асобныя літаратары — цэлая пісьменьніцкая арганізацыя перайшла ў разрад апазыцыйных. Раман састарэлага патрыярха расейскай літаратуры Салжаніцына «Ў крузе першым» у яго на радзіме лічыцца ўсяго толькі клясыкай. Экранізацыя раману, дзеяньне якога адбываецца ў сталінскай «шарашцы», на расейскім тэлебачаньні ня сталася значнай грамадзкай падзеяй, хоць і выклікала цікавасьць гледачоў. У Беларусі ж, як гэта ні парадаксальна, раман эпохі ГУЛАГу застаецца актуальным!
Прынамсі, актуальным яго робіць адмова ўладаў ад паказу тэлесэрыялу паводле салжаніцынскага твору. Апраўданьні кіраўніцтва тэлеканалу СТВ наконт недахопу грошай ад рэклямы нікога ня могуць увесьці ў зман, бо прыватных каналаў у Беларусі няма, а грошы на тэлепрапагандзе дзяржава ніколі не эканоміла. Дарэчы, зусім ня даўна гледачам дэманстраваўся іншы фільм — «Генэралісімус», паводле сталініцкага раману Карпава. Гэты паказ цалкам натуральна ўпісваецца, так бы мовіць, у «лінію Сталіна», якая летась афіцыйна ўвайшла ў сьпіс галоўных турыстычных аб’ектаў Беларусі. Акрамя таго, прадусэр яшчэ аднаго дзяржаўнага каналу — АНТ — Хрусталёў даў зразумець у інтэрвію «КП в Беларуси», што глядацкую аўдыторыю каналу хутка чакае чарговы грандыёзны праект, прысьвечаны гісторыі сучаснасьці ды галоўнаму герою нашага часу.
Новае пакаленьне не цікавяць урокі мінулага. Не цікавяць ХХ зьезд, Хрушчоў, Салжаніцын, Быкаў. Абтрасаючы пыл са сваіх ног, яно бярэ ў новую эпоху толькі Сталіна — дый тое ў выглядзе карыкатурнага «генэралісымуса», найлепшага сябра дзяцей і фізкультурнікаў. Што ж, які час — такія й куміры. Ёсьць у новага часу й свае дысыдэнты — не такія, як паўстагодзьдзя таму. У чымсьці яны пераўзыходзяць сваіх папярэднікаў. У іх больш ведаў, менш ілюзіяў. Але ж у «шасьцідзясятнікаў» быў надзейны імунітэт. Яны на дух не выносілі маны й крывадушнасьці. На жаль, маральныя якасьці не перадаюцца ў спадчыну. Вось толькі памяць — упартая рэч. Калі на непрыемныя эпізоды мінулага ўдаецца забыцца, яны вяртаюцца ў выглядзе начных кашмараў.



**Менск, плошча Перамогі. 9 траўня 2005.**

# Падарожжа ў мінуўшчыну

Бедныя–бедныя выставы памяці Караткевіча ў Палацы мастацтва і Музэі беларускай літаратуры... Піша **Сяргей Харэўскі**.

Тыя, хто памятае Ўладзімера Караткевіча, ведаюць, які гэта быў візіянэр, гумарыст і фантазэр. Ідучы ў менскі Палац мастацтваў, на выставу, прысьвечаную 75-годзьдзю пісьменьніка, чакаў калі не фэерыі, то, прынамсі, адэкватнасьці. Адэкватнасьці экспазыцыі маштабу асобы. Чаканьні аказаліся марнымі.

Прайшоўшы кніжны кірмаш, дзе нічым караткевіцкім ня тхнула ніколі, прамінуўшы кірмаш італьянска-тайляндзкага кічу, з амурчыкамі, сьфінксікамі й кабыламі ў натуральную велічыню, патрапіў у маленькую залю... Некалі тут, пад лесьвіцай у вялікую вышнюю залю, выстаўлялі дэкаратыўна-ўжытковае мастацтва. Цяпер выставілі некалькі дзясяткаў твораў графікі й жывапісу з нагоды юбілею Караткевіча.

Аснову выставы ствараюць творы графікаў-клясыкаў *караткевічыяны*: Генадзя Грака, Арлена Кашкурэвіча, Віктара Мікіты, Яўгена Куліка, Івана Пратасені, Міколы Купавы, творы жывапісцаў Гаўрылы Вашчанкі, Анатоля Бараноўскага, Віктара Маркаўца, Ягора Батальёнка. Плякат прадстаўлены клясычнай тэатральнай афішаю «Сівая легенда» Ўладзімера Крукоўскага.

Творчасьць Караткевіча, яго вобраз у беларускім выяўленчым мастацтве мае трывалую традыцыю. Пачалося ўсё з ілюстрацыяў студэнта-графіка Генадзя Грака да раману «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» ў 1966 г. Пасьля быў афармлены А.Кашкурэвічам раман «Каласы пад сярпом тваім». Той экспэрымэнт у 1960-я стаў удалым прыкладам творчае садружнасьці тады яшчэ маладых мастакоў і літаратара. Тады й насамрэч было багата ўдалага ў нашай культуры.

Як і мае быць, на выставе, прысьвечанай пісьменьніцкаму юбілею, большасьць экспанатаў — гэта ілюстрацыі. Пажоўклая папера, старыя, яшчэ савецкія рамы... Зруйнаваныя замкі, суворыя ваяры, моцная акадэмічная школа малюнку. Міжволі адчуваеш сябе ў далёкіх часах. У тых часах, калі зеўралі выбітымі вачніцамі тысячы закінутых храмаў. У тых, калі ўсе зачытваліся Караткевічам і шукалі ягоных дэфіцытных кніжак, калі яшчэ былі жывыя Брэжнеў і Машэраў, а беларускі нацыянальны рамантызм, скіраваны ў кніжнае рэчышча, буяў усімі краскамі.

Нават тузін жывапісных палотнаў, створаных цяпер, выглядаюць рэмінісцэнцыяй тае ўжо бясконца далёкае эпохі «Зямлі пад белымі крыламі».

Партрэт Караткевіча на фоне навагарадзкіх вежаў Гаўрылы Вашчанкі, краявіды Анатоля Бараноўскага, «Руіны Гальшанскага замку» ды «Хата Зоські Верас» Алеся Цыркунова, творы Батальёнка, Белавокай, Вярэніч, Грышука, Драбышэўскага, аршанскія краязнаўчыя сюжэты Аўчыньнікава, Мяжуева, Капузы. Нібы й нямала... Але ўражаньне нішчымнасьці застаецца.

Яшчэ больш сумнае відовішча ўяўляе выстава ў Музэі беларускае літаратуры. Адчуваньне такое, нібы хто змушаў каго рабіць тыя выставы. Нібы ані каліва тае Караткевіцкае вясёлае, насуперак усяму, няўрымсьлівасьці не засталося. Калі сёньняшняя генэрацыя будзе меркаваць пра ролю й месца Ўладзімера Караткевіча ў нашай культуры паводле гэткіх выставаў, гэта будзе супярэчлівае меркаваньне. Бо яно будзе трывала зьвязваць ягоную постаць з эпохаю «разьвітога сацыялізму», у якой дазвалялася кардыячыцца нацыянальным рамантыкам і выдаваць іхныя кнігі ў найлепшай аздобе шматтысячнымі накладамі. З анахранічнаю моваю літаратуры й мастацтва.

## Тузін Гітоў. Вынікі 9 (43) туру

**13—26 студзеня 2006**
**www.music.fromby.net**

1. Кася Камоцкая. Шостае падарожжа — 399
2. IQ–48. Сьвятло ў цемры — 386
3. Сьцяна. Можна быць — 314
4. Tav.Mauzer. Брудная вада — 277
5. Usplesk. Мара — 244
6. Палац. Праваджала маці сына — 222
7. Глюкі. Ападкі — 221
8. Зьмяя. Чукча — 206
9. •ygimont VAZA. ContraБанда — 205
10. Восьмы дзень. Чорныя людзі — 151
11. Зодчие. Дзяўчынка — 91

**Праслухаць песьні можна ў Інтэрнэце на сайце «Тузіну Гітоў» і ў радыёэтэры штопятніцы на хвалях радыё «Мінск» (92,4 FM) а 23.00 у праграме «Тузін Гітоў з Алегам Хаменкам».**




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

РЭПЛІКА

# «За Беларусь!»

без ніводнага беларускага слова.

Тлумнае шоў, што закаціў канал АНТ 5 лютага пасьля чарговае агіткі «Контураў», было цалкам адпаведным. Адпаведным шчымліва-мітусьлівае настальгіі па апухлых ад сну розуму часах маладосьці Лукашэнкі. Слухачы маглі добра наслухацца савецкіх шлягераў 1970-х гадоў, беларускіх зорак кшталту Абасавай ды Абалян. Бліснулі, чым маглі, Паліна Смолава ды Натальля Тамела. Правінцыйныя пясьняркі нават намагаліся пяяць па-ангельску. Не абышлося бяз Ксені Сітнік. Сьпявала яна расейскую народную... Беларушчыне ж месца ў канцэрце «За Беларусь!» не было.

**На фота: Паліна Смолава (зьлева) і Люся Лушчык.**

# Насустрач сонцу



*Фатограф, падобна ўсякаму мастаку, задаецца мэтай узнавіць ня самі рэчы бачнага сьвету, а сваё асабістае ўражаньне, сваё ўспрыманьне іх.*
***Ян Булгак***

Выставу «Фатаграфія Баўгаўзу» ў Музэі сучаснага мастацтва ў Менску наведаў **Сяргей Харэўскі**.

У 1919 г. у нямецкім Ваймары была створана першая мастакоўская вучэльня. Яна рыхтавала штукароў для працы на прамысловасьці. На чале Баўгаўзу стаў слынны дойлід Вальтэр Гропіюс. Хутка цэнтар пераўтварыўся ў галоўную лябараторыю дызайну, мастацтва й архітэктуры Эўропы. Сярод ягоных выкладчыкаў былі Васіль Кандзінскі, Міс ван дэр Роэ, Паўль Клее, Піт Мандрыян. Велізарны ўплыў Баўгаўз зазнаў зь Беларусі. На канцэпцыі й творчае іх крэда непасрэдна наклаўся адбітак Віцебскае школы: Малевіча, Эль Лісіцкага, пазьней — Булгака й Стрэмінскага.

Узоры рэчавага й паліграфічнага дызайну Баўгаўзу вырозьнівае імпэтнасьць і рытмічнасьць, сьведамы мінімалізм. Іх стваральнікі найперш канструявалі рэчы, выяўляючы іхную сутнасьць, а затым яе ўтрывалі. У выніку мэбля, посуд, тэкстыль, створаныя ў Баўгаўзе, сталі шэдэўрамі эстэтычнае думкі й уласна таго, што мы сёньня завём дызайнам. Яны зрабілі рэвалюцыю ня толькі ў прамысловай вытворчасьці, але й у мастацкім мысьленьні ўсяго сьвету. Па пераезьдзе ў Дэсаў пры вучэльні была створаная й адмысловая майстроўня для фатографаў. Яе паўстаньне зьвязанае з імёнамі вугорскіх творцаў Ласла Мохай-Надзем і Лючыі Мохай. У 1929 г. у Баўгаўзе было адкрытае адмысловае навучальнае аддзяленьне фатаграфіі, другое ў сьвеце пасьля Вільні. Тутака працавалі славутыя фотамастакі Эрых Казэнмюльлер, Люкс Файнінгер, Оскар Шлеммэр. Вялізарнымі падзеямі сталі «Выстава фатаграфіяў баўхаўзцаў» 1928 году, а затым выставы Казэнмюльлера й бэрлінская фотавыства расьлінаў «Першасныя формы мастацтва», што паказаў Карл Блёсфэльд. А пасьля ўтварэньня фатаграфічнага аддзяленьня з Вальтарам Пэтэрсхансам на чале, Баўхаўз пераўтварыўся ў вядучы цэнтар тагачаснае эўрапейскае фатаграфіі.

За гады свайго існаваньня ў міжваеннай Нямеччыне Баўгаўз ня толькі запачаткаваў новыя жанры й віды фатаграфіі, але й пераўтварыўся ў сапраўдную інтэрнацыянальную кузьню кадраў тагачаснага фотамастацтва.

Выстава «Фатаграфія Баўгаўзу», што праходзіць у Музэі сучаснага мастацтва ў Менску, дэманструе тую глябальную ролю, што адыграла вучэльня. Такога маштабу й якасьці экспазыцыі ў нашым краі — рэдкасьць. Для выставы былі адабраныя працы максымальнае колькасьці мастакоў. Сярод іх ёсьць і добра вядомыя ў сьвеце рэчы, а ёсьць і малавядомыя нават адмыслоўцам імёны й творы. Шэдэўры мяжуюцца зь нечакана цікавымі нязнанымі ў нас творамі. У выніку мы можам яшчэ раз пераканацца ў тым, якую вялізарную камунікатыўную функцыю выконвае фота й наколькі разнастайнымі й нечаканымі могуць быць сфэры яго ўжытку.

Сёньняшняя выстава — адна з самых важных культурных падзеяў 2006 году. Гэтым разам сьвятло зазьзяла з Захаду. За Менскам настане чарга Магілёва. А затым, насуперак руху Сонца, выстава адправіцца ў Маскву.




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Адкрыцьцё выставы ў Музэі сучаснага мастацтва. Пэрформанс Аляксея Фёдарава і Андрэя Шапарава.**

# «Рок-каранацыя» вяртаецца

28 лютага, пасьля двухгадовага перапынку. Піша **Сяргей Будкін**.


**«Белакрылы анёл» гурту «Zet» прэтэндуе на «Рок-карону».**

У Менску пройдзе «Рок-каранацыя». Беларускіх музыкаў узяўся падтрымаць бровар «Баброў».

Паводле словаў арганізатара Юр'я Цыбіна, «Каранацыя» пасьвяжэе, дзякуючы новым намінацыям ды ўвядзеньню інтэрактыўнага галасаваньня. Прадусэры фэсту спадзяюцца такім чынам ліквідаваць залішнюю суб'ектыўнасьць цырымоніі — раней усе прызы разьмяркоўвала журы. Сёлета журы, у якое ўваходзяць журналісты, музыкі і прадусэры, абірала намінантаў на адзінаццаць «каронаў» па выніках апошніх двух гадоў. Раней «кароны» ўручаліся па сямі-васьмі асноўных намінацыях, таму кола прэтэндэнтаў было такое вузкае. Паказальная ў гэтым пляне «Каранацыя-2000», калі ў намінацыях «Рок-карона», «Альбом году», «Відэакліп году», «Тэксты» перамог гурт «N.R.M.», падзеяй году прызнаны праект «Я нарадзіўся тут», а «Музыкам году» — Лявон Вольскі. Каб пазьбегнуць такой сытуацыі, сёлета будуць узнагароджаны найлепшыя прадстаўнікі па кірунках (рок, блюз, фольк, альтэрнатыва і праект году). Журы адзначыць найлепшых толькі ў гэтых катэгорыях. У астатніх намінацыях (кліп, песьня, альбом, выканаўца, рок-князёўна, дэбют) пераможца будзе абраны па выніках інтэрнэт-(галасуюць на сайце www.music.fromby.net) і SMS-галасаваньня.

Багата сёлета будзе гуртоў з-за Менску «Мы езьдзілі па краіне і слухалі», — кажа Ю.Цыбін. Магілёў прадставяць поп-панкі «Глюкі», Берасьце — «Сьцяна», Гомель — блюзмэны з «Al narrator orhestra», Віцебск — этнічны «Восьмы дзень», Горадню — поп-рокавая «Айша», а Полацак асобна — «Фляўс і Кляйн» (даніна павагі фэсту «Рок-кола»). На мінулых «Каранацыях» несталічныя гурты ня надта былі аблашчаныя ўвагай. Згадваецца толькі гомельская «Rasta» («Дэбют-2002») і аршанская «Пані Хіда», адзначаная ў 1998 г. за «Сьлёзы на соснах» — «Кліп году».

Афішы фэстывалю надрукаваны па-расейску. Ю.Цыбін кажа, што для яго моўнае пытаньне не прынцыповае. Арганізатары канцэрту з «Кляс-клюб ДК» кажуць, што яны не баяцца беларускай мовы: «Мы карыстаемся ранейшымі напрацоўкамі, і частка рэклямнай кампаніі «Рок-каранацыі» заўжды праводзілася па-расейску». Саму цырымонію дырэктар полацкага фэсту «Рок-кола» Сяргей Анішчанка і тэлевядоўца з «Музычнага каналу» Каця Пытлева будуць весьці па-беларуску.

Дагэтуль не вядома, ці будуць дапушчаныя на сцэну музыкі з «чорнага сьпісу». Аляксандар Кулінковіч — лідэр групы «Нейра дзюбэль», чый дыск «Танкі» прэтэндуе на «Альбом году», кажа, што яго на «Рок-каранацыю» пакуль ня клікалі. «Праблемы «забароненых» для нас не існуе, — тлумачыць Ю.Цыбін. — Хто будзе ўзнагароджаны, той і выйдзе на сцэну. Гэта ж не палітычная акцыя». Сьпіс выступоўцаў пакуль трымаецца ў сакрэце, але на афішах у намінантах фігуруюць «Крамбамбуля», «Zet», «Крама». У адной з асноўных намінацыяў — «Гурт году» — маюць шанец быць адзначанымі таксама гурты, якія за гады прастою «Рок-каранацыі» зрабілі сябе: «Indiga» і «IQ-48». Не адну «карону», відаць, атрымае «J_Морс». Вялікая канкурэнцыя ў намінацыях «Блюз-рок выканаўца», «Фольк-выканаўца» і «Альбом году».

У шчыльных радах «дэбютантаў» на першы плян могуць выйсьці дуэт «Саша і Сірожа» і ляўрэаты апошняга «Басовішча» — «Таварыш Маўзэр». Меней прэтэндэнтаў на «Кліп году» і «Рок-князёўну». Апошняе слова — за прыхільнікамі беларускай музыкі: 15 лютага стартуе галасаваньне.

**Сяргей Будкін**

**Сьпіс намінацый фэстывалю «Рок-каранацыя-2005»:**

1. Гурт году.
2. Лепшы альтэрнатыўны гурт.
3. Блюз-рок выканаўца.
4. Фольк-выканаўца (традыцыі і сучаснасьць).
5. Праект году.
6. Выканаўца году.
7. Сьпявачка году (рок-князёўна).
8. Кліп году.
9. Дэбют.
10. Песьня году.
11. Альбом.

**Сьпіс песень, якія прэтэндуюць на тытул «Песьні году»**

«Zet», «Белакрылы анёл»

«J_Mors», «Маё сонца»

«The Stokes», «Пад купалам нябёсаў»

«Безь білета», «Дзьве лодкі»

# Хто першы, той лепшы

«Плянка ў 10 000 прададзеных дыскаў для беларускіх музыкаў пакуль недасягальная», — кажа дырэктар «Містэрыі гуку» Аляксандар Шлык. Пасьпяховым лічыцца той беларускі альбом, які разышоўся цягам году накладам болей за 1000 асобнікаў.

На мінулым тыдні свае ўзнагароды ўручылі прадусэр Адам Старповіч і дырэктар дыскарні «Містэрыя гуку» Аляксандар Шлык. Паказьнікам былі продажы дыскаў цягам году. Заснавальнікі лічаць гэты крытэр найбольш аб'ектыўным.

«Можна слухаць сотні песень на радыё, але на палічку ў пакоі слухач пакладзе той дыск, які яму спадабаўся. Папулярнасьць выяўляецца запатрабаванасьцю», — кажа А.Старповіч. Ён прызнае, што ў Беларусі не існуе адзінай электроннай сеткі маніторынгу продажаў, як у іншых цывілізаваных краінах, высокі ўзровень пірацтва, але мяркуе, што варта пачаць вылучаць лідэраў продажаў ужо цяпер. Для гэтага і была абраная сетка музычных крамаў «Містэрыя гуку» — як адна з самых паказальных у краіне.

У пятніцу ў клюбе «Ізюм» былі названыя пераможцы ў дзевяці намінацыях. У разьлік бралася агульная колькасьць прададзеных дыскаў цягам 2005 году. Але дакладная лічба не называлася. «Магу сказаць толькі, што плянка ў 10 000 прададзеных дыскаў для беларускіх музыкаў пакуль недасягальная», — кажа А.Шлык. Пасьпяховым лічыцца той беларускі альбом, які разышоўся цягам году накладам болей за 1000 асобнікаў.

Сярод фольк-выканаўцаў лідэрам продажаў была абвешчана «Сярэднявечная дыскатэка» ад «Старога Ольсы», «Не як усе» ад «Нестандартнага варыянту» — самым прадавальным хіп-хоп рэлізам.

У альтэрнатыўнай музыкі няма роўных «Куклам» (альбом «Дысцыпліна хаосу»). У рок-музыцы лідэр-дыск «Красавік» ад «J_Mors», у поп — альбом «Атлянтыкі». У дзьвюх намінацыях фігуруе «Крамбамбуля».

Цікавая сытуацыя ў шансоне: 3-е месца — «Старыя сябры» Віктара Каліны, другое — «Дзяўчынка-свавольніца» яго ж, 1-е скарылася альбому «Гарэзьлівы гуляка» Віктара Каліны. Падобная сытуацыя ў намінацыі «Складанка году»: ляўрэатамі сталі дыскі «Песьня году» розных пэрыядаў.

«Альбомы, выдадзеныя на пачатку году, мелі большыя шанцы. Затое дыскі, выдадзеныя пры канцы году, будуць мець большыя шанцы налета», — камэнтуе сытуацыю А.Старповіч.

**Сяргей Будкін**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Музыку «Старога Ольсы» купляюць часьцей за іншы беларускі фольк.**

# Лідэры продажаў–2005 у дыскарнях «Містэрыя гуку»

**сярод артыстаў, выдадзеных West Records**

«J_Морс» — «Апрель»
«Atlantica» — «Heavenly»
«Цягні–Штурхай» — «3000 шагов. Баллады»
«J_Морс» — «Мое Солнце»
«Крамбамбуля» — «Радыё Крамбамбуля 0,33 FM»
«Новы Ерусалім» — «Неба осколки»
Складанка «Золотая двадцатка»
«Крама» — «Будзь разам з намі — The Best»
«N.R.M.» — «Тры чарапахі»
«Аляксей Хлястоў» — «Ворваться в небо»

**сярод артыстаў, выдадзеных «БМА Group»**

Данчык — «Я ад вас далёка»
Кася Камоцкая & «Новае неба» — «Акустыка»
«Тарпач» — «Усё будзе...»
«Partyzone» — «Сьмерці няма»
Трыб'ют Gods Tower «Варта Вежы Багоў» (2 CD)
«Стары Ольса» — «Скарбы ліцьвінаў» (2 CD)
«Postscriptum» — «Вандроўка»
Станіслаў Манюшка — «Песьні з-над Нёмна й Дзьвіны»
«Indiga» — «Дні»
«Zigzag» — «Bionic@»




# Папаўненьне ў Саборы

беларускіх сьвятых — сьвятая Валянціна Койданаўская.

У Саборы беларускіх сьвятых, які налічваў 54 імёны, зьявілася новая сьвятая. Ёй стала сьвятая Валянціна — нябесная заступніца Менску. Урачыстае богаслужэньне з афіцыйным праслаўленьнем новай сьвятой адбылося 6 лютага ў сталічнай катэдры Сьвятога Духу.

Перш чым абвесьціць Валянціну сьвятой, адмысловая камісія па кананізацыі некалькі год зьбірала сьведчаньні аб цудатворным дзеяньні яе малітваў.

Паходзіць беларуская сьвятая з Койданаўшчыны з в. Коскі, дзе нарадзілася ў 1888 г. у сям'і праваслаўнага сьвятара Фёдара Чарняўскага. Жыцьцёвы шлях яе быў няпросты і трагічны: паміраюць бацькі, гіне высланы на Далёкі Ўсход муж Фёдар Сулкоўскі, арыштоўваюць сваякоў, а ў ліпені 1937 г. арыштоўваюць і затым растрэльваюць апошнюю групу менскага праваслаўнага духавенства. Гэтыя выпрабаваньні не прайшлі бясьследна для Валянціны Сулкоўскай: па сьмерці маці яна цяжка захварэла і да скону жыцьця засталася нерухомая.

За надзвычайную дабрыню і спагаду, за шчырае імкненьне дапамагчы ўсім, хто ў гэтым меў неабходнасьць, землякі яшчэ пры жыцьці называлі матушку Валянціну сьвятой. Яе надзвычайная духоўная сіла і прароцтвы прыцягвалі паломнікаў. Па сьведчаньні клірыка Сьвятадухаўскай катэдры Фёдара Крываноса, аўтара «Жыцця сьвятой Валянціны», у дзень сьмерці Сталіна яна сказала: «Над Масквой лятала чорная птушка і ўпала».

Сьцежка да апошняга зямнога прытулку сьвятой не зарастае і па сёньня — пілігрымы прыходзяць на могілкі ў вёсцы Крысава, каб пачуць адказ на нявыказаныя пытаньні.

Муж Валянцінавай сястры сьвятар Сяргей Радакоўскі, расстраляны ў 1933 г. паводле пастановы тройкі НКВД БССР, у 1999 г. быў праслаўлены зь сьвятымі ў ліку навамучанікаў спавядальнікаў Менскай япархіі ў чыне сьвятамучаніка.

**Сямён Печанко**



# Капыткі



Гэтая страва беларускай кухні цікавая ня толькі сваёй поўнай адсутнасьцю на паліцах крамаў і ў рэстарацыйных мэню. Бо тое самае можна сказаць пра большасьць знакавых страваў нашай кухні, якія яшчэ 60 гадоў таму вызначалі побыт продкаў. Але тут маем справу яшчэ і з кур'ёзам, які сказіў назву стравы. Карацей, я пра «капытку». Гэтак у кананічнай беларускай савецкай этнаграфіі завецца від клёцак з таркаванай бульбы.

Тыя дробныя клёцкі сваёй формай сапраўды нагадваюць капыткі якойсьці дробнай жывёліны, ну, напрыклад, казы. Вельмі блізкая па назьве і па сутнасьці страва вядомая ў польскай кухні: *kopytka*. Таксама клёцкі з таркаванай бульбы. Прычым у Польшчы пра іх можна ня толькі прачытаць у энцыкляпэдыях, але і купіць замарожаны паўфабрыкат у любым супэрмаркеце. У іх гэта папулярны гарнір да мясных і іншых страваў, амаль як у нас макарона. Але: *'kopytka'* папольску — форма множнага ліку. І тады ўзьнікае рэзоннае пытаньне: ці не «капыткамі», замест «капыткі», мусіла б называцца гэтая страва па-беларуску? Ці не ўспрыняў нейкі фіксатар-этнограф з расейскага Генштабу польскае 'kopytka' (мн. лік) як беларускі жаночы род? Назвы ўсіх тыпалягічна падобных страваў маюць форму множнага ліку — калдуны, клёцкі, лазанкі, дранікі і г.д. Адкуль узяцца «капыцы»? Спрачаюся з тым, хто рызыкне прапанаваць больш пераканаўчае тлумачэньне, на паўкілё «капыткі», або «капытак» — глядзячы каму пашанцуе.

У суседняй Літве аналяг гэтай стравы таксама існуе (матэрыяльная культура ва ўсіх краінах былой Рэчы Паспалітай на працягу стагодзьдзяў была вельмі блізкай, адрозьніваючыся хутчэй нюансамі). І назва таксама мае форму множнага ліку: швільпікай (švilpikai), або ў перакладзе — «суркі». Не бяруся меркаваць, чым гэтыя бульбяныя клёцкі нагадваюць нашым паўночным суседзям суродзічаў Чыпа і Дэйла. Але добра, што ў іх страва захавалася ў жывым побыце, і яны нават не задумваюцца, ці гэта падарунак лёсу, заслуга або выпадковасьць.

Польскія kopytka звычайна проста гатуюць у падсоленай вадзе; беларускія і літоўскія — спачатку запякаюць на блясе, а потым або тушаць у гаршчку са сьметанай («суркоў»), або ізноў-такі гатуюць у падсоленай вадзе. Прынамсі, калі верыць справаздачы невядомага этнографа-палевіка, мала заклапочанага гістарычнай кампаратывістыкай. Давярай, але правярай — калі ёсьць як. Хаця мне падаецца, традыцыйны літоўскі спосаб наўрад ці быў арганічна чужы беларусам, асабліва тым, хто жыў у палітычна ненадзейнай 100-кілямэтровай паласе ўздоўж 700 км літоўскае мяжы.

**Алесь Белы**

### «Капыткі беларускія»

1,2 кг бульбы, 0,5 шклянкі мукі, 1 ст. лыжка здору, соль, сода.

Абабраную бульбу надраць на тарцы, адціснуць, дадаць муку, соль, соду, перамяшаць. Атрыманае цеста раскачаць, нарэзаць прастакутнікамі 3x5 см і выпекчы іх у духоўцы на блясе, змазанай тлушчам.

Перад падачай на стол апусьціць капыткі ў падсоленую ваду або мясны булён, гатаваць 10 хвілін. Падаць са сьметанай або цыбуляй, падсмажанай на сале.

### «Швільпікай»

Бульба — 1200 г, мука — 1 шклянка, 1 яйка, тлушч сьвіны — 25 г, сьмятана — 50 г, соль.
Для соўсу: сырое сала — 75 г, цыбуля — 75 г, сьмятана — 50 г (ці сьмятана — 100 г і алей — 50 г).

Прыгатаваную ў лупінах начышчаную бульбу прапускаюць праз таркавальную машынку і дадаюць муку, яйкі, соль. З атрыманай масы робяць валікі 2 см у дыяметры, надаюць ім пляскатую форму, наразаюць наўкось цурачкі 7 см удоўжкі, кладуць іх на ліст, пасыпаны мукою, ды выпякаюць у духоўцы. Затым цурачкі кладуць у рондаль, заліваюць тлушчам ды сьмятанай, страсаюць і трохі вытрымліваюць пад крышкай. Перш чым падаць на стол, іх паліваюць соўсам з сала, падсмажанага з цыбуляй ды сьмятанаю альбо алеем ды сьмятанаю.

# Мэлядраматычны сэрыял, шпіёнскі раман і фільм жахаў

Усё гэта — гісторыя менскай Лошыцы. Піша **Сяргей Харэўскі**.

Кніга ў пекнай вокладцы распавядае пра старасьвецкую сядзібу з паркам, дзе некалі балявалі арыстакраты й вырашаліся лёсы цэлага краю. Паводле аўтара, першыя згадкі назвы «Лошыца» ў Літоўскай мэтрыцы датуюцца 1557 г. Праўда, дакладна невядома, ці тычыўся запіс менавіта Падменшчыны. Але вэрсія пра тое, што двор належаў князям Талачынскім, праўдападобная. Далейшымі валадарамі маёнтку былі Тышкевічы, Валадковічы, Друцкія-Горскія… Найбольшага росквіту Лошыца дасягула за Прушынскімі ў XVIII—XIX ст. Ёсьць нават зьвесткі, што ў Прушынскіх гасьцяваў і апошні наш кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. За Прушынскімі Лошыца ператварылася ў шэдэўр садова-паркавага мастацтва з палацавым комплексам, капліцай і дыхтоўнай гаспадаркаю. Станіслаў Прушынскі прымаў тут расейскага імпэратара Паўла I.




**Юры Кур'яновіч. Аповеды старасьвецкай Лошыцы.** — Менск: Бізнэсафсэт, 2005. — 96 с.

Гісторыя апошніх гаспадароў Лошыцы Любанскіх — нагода для мэлядраматычнага сэрыялу. Кажуць, што пані Ядвіга ўтапілася ў Сьвіслачы з-за няшчаснага каханьня да менскага генэрал-губэрнатара Мусін-Пушкіна. А няўцешны ў сваім горы Яўстах Любанскі закінуў гаспадарку.

Памятае Лошыца расейскіх, польскіх, нямецкіх акупантаў. У сядзібе знаходзілася таемная школа КПЗБ і гуманітарная місія ЮНРРА. Недзе тут, у дзікім дзірване, знаходзяцца безыменныя магілы ахвяраў бальшавіцкіх злачынстваў — Лошыцкі Чорны Яр...

Па прачытаньні Кур'яновічавай кнігі дзівісься, якім цудам насуперак савецкаму вандалізму ацалела месца. Бальшавікі, калі перараблялі капліцу пад склад, сьвінцовую труну Ядвігі Любанскай адправілі на акумулятары для мясцовай МТС.

Мала што зьмянілася й цяпер. Таму ведаючы цяперашнія маштабы работ у Лошыцы, не магу падзяліць аптымізму аўтара кнігі. Пра добраўпарадкаваньне й рэстаўрацыю аднаго з самых старажытных палацава-паркавых комплексаў Беларусі гаворыцца з канца 1980-х. З таго часу апроч пабудовы драўлянае вежы пры флігелі й расчысткі сьцяжынаў мала што зьмянілася. Наадварот, сам палац быў даведзены «рэстаўратарамі» да аварыйнага стану, як і бальшыня іншых тутэйшых пабудоваў. Сытуацыя, аналягічная той, што творыцца па ўсёй Беларусі. Помнікі даходзяць да катастрафічнага стану, пасьля чаго іх прасьцей зьнесьці, чым узнаўляць.

Сёньняшнія рэаліі Лошыцы — барбэкю ў засені экзатычнах расьлінаў, горы сьмецця ў выхадныя дні.

Але кніга Кур'яновіча пра іншае. Пра паданьні, што некалі нараджаліся тут, выдуманыя й рэальныя трагедыі. Тыя сюжэты, што прыадкрывае аўтар, вымагаюць далейшага разьвіцьця. І танюткая кніга — выдатны для таго пачатак.

Вялікі недахоп манаграфіі — адсутнасьць пляну сядзібы з ваколіцамі. Ня кожны разьбярэ, што за руіны стаіліся ў шатах вербалозу. І ўжо пэўна, ня кожны чытач самастойна разьбярэ, дзе растуць тыя ці іншыя экзатычныя віды дрэваў, што сакавіта апісаныя ў кнізе. Другі вялізарны недахоп — мізэрны тыраж (180 асобнікаў!). Гэткая захапляльная чытанка мусіць мець куды большыя, у дзесяць разоў, наклады.



WWW.RADZIMA.ORG

## НОВЫЯ КНІГІ

**Залівака, А.С. Сьпіс землеўладальнікаў Менскага павету.** — Менск: НАРБ, 2005. — 100 с.

Першая кніжка А.Залівакі пакідае ўражаньне ляпідарнага канспэкту, дзе бракуе пазыцыі аўтара. Затое зьмест другой кніжкі складае публікацыя новай гістарычнай крыніцы — выяўлены аўтарам сьпіс землеўладальнікаў Менскага павету за 1901 г.

**Казлоў, Л. Р. Старажытная картаграфія Беларусі.** Вып. 1. — Менск: Арты-Фэкс, 2005. — 50 с.: іл.

У альбоме фарматам А3 зьмешчаныя выявы мапаў 1570—1821 г. Укладальнік выданьня мяркуе: «...толькі на старой карце можна знайсьці тое, чаго няма ані ў якіх іншых дакумэнтах». У такім стаўленьні да гістарычнай картаграфіі Леў Казлоў не адзіны. Вось апісаньне гравюры XVII ст. «Натхнёныя картаграфіяй», зь якой распачынаецца альбом: «Муза — алегорыя картаграфічнай навукі, водзіць рукой Герарда Мэркатара (1515—1594). Праз акуляры прыглядаецца Пталямэй (87—150). Над картографамі схіліўся пад цяжарам нябеснай сфэры легендарны Атляс, а зусім здаля цярпліва чакаюць вынікаў картаграфічнай працы розныя ўладары — імпэратары, каралі, князі і герцагі».

**ADz**

# Сяргей Вітушка: Я грамадзянін Вялікага Княства Любові

Страціўшы зрок, былы кіраўнік «Талакі» Сяржук Вітушка вучыцца пісаць другі раз, праз адмысловую кампутарную праграму. Mama myla ramu... Словы сустракаюцца адно з адным, і ён часам заўважае, што гэтыя сустрэчы не выпадковыя. Некалькі такіх словаспалучэньняў ён запісаў.

MORA
A moža, mara mora miera,
A moža, mara — mora miežy?
Čamušci ja ŭ heta nia vieru.
Sa mnoju zhodny vietryk śviežy.

KRAJINA
Na pašparcie załatam — VKL,
I viza ź minuŭščyny ŭ novi.
Čytajcie, zajzdroście — ja hramadzianin
Vialikaha Kniastva Lubovi.

VINO
I nie vina vina, što ja nia pjany,
I bolš nikoli ŭžo nia budu zakachany,
Staŭ razumieć usio dakładna, daskanała.
Kachańnie naradziłasia było. Było. Skanała.

EPITAFIJA
Ležučy pad kvitniejučaj hruškaj,
Razumieju — narešcie ja volny.
Tolki pčołki huduć mnie nad vuškam.
Usie davolny.


АРЦЁМ ЛЯВА



аповесьць

# Шлях дробнай сволачы

*Вось захацелася зайцам стаць,*
*Баяцца, хавацца і галадаць,*
*Арэхавы куст абаронца мой,*
*Гэтай халоднай зімой.*

***З заклёну ўэлскіх чараўніц***

ЕВА ВЕЖНАВЕЦ

**Люба — журналістку радыё «Вольная Беларусь». Яе сястра Віка працуе ў газэце «Савецкая Беларусь». Зрэдзьчас яны сустракаюцца на «нэўтральнай тэрыторыі», у сталоўцы, што ляжыць між рэдакцыямі. Але Новы год ім давядзецца сустракаць разам, у бацькоўскім доме. Раптам высьвятляецца, што выпадковы Любін спадарожнік па маршрутцы — таксама іх госьць...**

**Працяг. Пачатак у № 2—5.**

Мы спыніліся ля дому маіх бацькоў. Яшчэ адзін сябар бацькавай маладосьці, тут да трох не варажы. Мы пасьмяяліся не безь няёмкасьці, расплаціліся й пайшлі ў дом.

— Мама ў суседзяў, бацька пайшоў па елку, табе загадалі паесьці, — зьвесіўшы праз парэнчы чорныя буйныя кудзеры, пракрычала Віка — у цёплым махровым халаце.

У мяне ніколі не было цёплага махровага халату, бо я баюся: заўтра ў ім буду сядзець на галавешках і прыкурваць ад іх.

— Добры вечар! — зьбянтэжыўся Аляксандравіч.

— О, праходзьце, праходзьце, я хутка спушчуся. Тата казаў, што вы прыедзеце. Васіль Андрэевіч ужо тут.

— Які Васіль Андрэевіч? — запыталася я. Мне зусім не ўсьміхалася сьвяткаваць у кампаніі бацькавых прыяцеляў.

— Ну, дзядзька Вася наш, — сказала Віка, са сьмехам разглядаючы мой скіслы твар.

Так заміж сямейнага сьвята з маленькімі падарункамі й сваркамі я патрапіла на збор бацькавых сяброў, адзін зь якіх хаваўся ад жонкі, другі — ад органаў. Ды яшчэ і разьмяшчай іх, забаўляй заміж таго, каб пайсьці ў свой пакой і заваліцца на ложак. Ну, ды аддам іх сястры, як навядзе марафэт.

Я завяла Пятра Аляксандравіча на кухню й запарыла кавы яму й сабе. Кава была паскудная — бацькі самі ня п’юць, дык і не разьбіраюцца. Мы ціха пагаманілі пра тое-сёе. Зьявілася Віка, павіталіся з госьцем і прысела за стол, потым прыехала на ровары маці, прывезла двух дзяцей:

— Вось, у нас будуць. Толя, — (маміна радня), — нагу зламаў у трох месцах. І рэбры паскручваў. Жонка павезла ў Слуцак.

— Дзе ён так?

— Ды ў яго маці памерла, і ён вырашыў анучы яе завезьці ва ўтросыр’ё, здаць на караўкі і грошы атрымаць на Новы год. Наняў каня за тры тысячы, выпіў з брыгадзірам, пагрузіў анучы і едзе. А каня брыгадзір даў наравістага, такі конь п’яных ня любіць, ну і панёс. Толя нагу зламаў, а анучы па полі параскідаліся. Яшчэ добра, што дапоўз да дарогі, падабралі. Во дарога даліся мацерыны анучы.

Дзяцей завялі наверх, дзе яны пасьля хвілі нясьмеласьці ўсчалі гармідар і разбудзілі дзядзьку Васю. Той спусьціўся да нас з прывітальнымі крыкамі. Наша маленькая экіпа была ў зборы. Я ўжо выпіла 50 грамаў і загрызла рыбнай палачкай, а таму не цырымонілася:

— Ну што, дзядзя Вася, зноў у бягах?

Васіль — траюрадны бацькаў брат, вельмі спрытны чалавек. Ён вывучыўся ў Горках, потым скончыў ВПШ, рабіў парторгам у суседнім калгасе. Усе ягоныя прыступкі я памятаю бліскуча, бо мама ніколі не забывала папікнуць



**Ева Вежнавец** — пісьменьніца. Жыве ў Менску.

бацьку посьпехамі брата. Пры Гарбачове дзядзя Вася ўмудрыўся заставацца партыйным пастырам і ганяць зь Фінляндыі ў Піцер новенькія джыпы (уласнаручна!). Пасьля завёў фэрму чарнабурак, прыпадняўся. У сярэдзіне 1990-х сьцяміў, што трэба зноў ісьці ва ўладу, пакуль не абадралі, як тую чарнабурку. Цяпер камандуе рыбакамбінатам і, па чутках, неміласэрна крадзе. Залетась дзядзька Вася пераседжваў у нас два месяцы — на яго наехала пракуратура. Потым справу закрылі, і ён вярнуўся на камбінат. Рабочыя ў яго зарабляюць па сто даляраў, нават страйк рабілі — бяз толку.

— Ты б ужо памаўчала, не псавала людзям сьвята, — сказаў бацька, употай ад маці скормліваючы вінэгрэт мадагаскарскаму прусаку, што сядзеў у яго ў кішэні. Прусак зашыпеў, бацька хуценька пакінуў кухню.

— Думаеш, людзі ня ведаюць, што ў цябе малахітавы рукамыйнік? — налягала я. Акурат сёньня я чула пра гэта ў маршрутцы.

— Які малахітавы рукамыйнік?! — усхадзіўся дзядзя Вася. Што за бздуры! У якой маршрутцы? Калі Кандраценя такое казаў, я ў яго ліцэнзію забяру!

Ягоныя глыбока пасаджаныя вочы ўпіліся ў мой твар. Нос-гурок пачырванеў. Дзядзя Вася — моцны, сымпатычны мужык, кулак, жулік і авантурыст, народжаны быць багатым. Такога падражніць — адно задавальненьне.

— Шоркаесься па маршрутках, зьбіраеш плёткі, а тады цягнеш у дом. Што за натура такая паскудная? — зазлавала Віка.

— Чуткі — сродак масавага пераказу, — сказала я. — «Гоман Арэсы» зачынілі, адзін апазыцыянэр быў — Лапотка, дык і таго ўпяклі за крадзеж матацыкла, твой сябручок, між іншым, упёк, дзядзечка. А сам на канфіскаваных маторках рыбу глушыць у цябе на камбінаце! Што ж нам застаецца — толькі чуткі. Ну і гадасьці ж пра вас гавораць — і пра цябе, і пра галоўурача, і пра пракурора. Крадзяце, п'яце, баб возіце, кумоў паўсюль насадзілі! Ох, дачакаецеся вы хутка!

— Глядзі, сама не дачакайся. Прыкрыюць тваю лавачку, куды ты потым дзенесься?

— А ў яе пляны ёсьць — часнык будзе вырошчваць або сірот з інтэрнату, — наябеднічала Віка, перад якой я неяк разьвівала пражэкты ратунку. — Ды толькі хто табе дзяцей даверыць?

— Тады я буду жыць на бацькаву пэнсію! — сказала я. — А ты, дзядзя Вася, падкінеш мне печкурка-другога?

— А дзе ты падзела футра, што я табе даваў? Віка насіць, а ты што, прапіла?

— Бінокль купіла, паляўнічыя боты, потым каньяку на вясельле. Але ўсё ляснула — і арніталёгія, і вясельле, і чарнабурка.

— А ў мяне такая шапка была — андатравая! — улез Аляксандравіч. — Я тады цэхам камандаваў на «Інтэграле», тэхніку рабілі, такую тэхніку, што Японія не дакажа. Дык прыехаў Лігачоў, пацалаваў мяне. А я праводзіў іх на марозе бяз шапкі. А Лігачоў зьняў сваю шапку і на мяне надзеў. Я па тых часох зарабляў па 1200 рублёў, дзьве кватэры меў, і сынам пабудаваў. І свабодна тады жылося, па-людзку! А гэтая перастройка вось што нарабіла. Якога важдзя сабе на галаву пасадзілі! Ад Японіі на 17 гадоў адстаём! І рабочыя мае тады добра жылі — па 300—400 зараблялі. Ты колькі зарабляў на сваёй базе? — зьвярнуўся ён да майго бацькі, які вярнуўся без прусака.

— Ну, бывала, і па 500.

— У яго 27 тысяч у ашчадкасе ляснула. Я кажу: купі дзеўкам кватэры і па машыне, дык не — «дурная баба, дурная баба»! А потым за тыя грошы купілі канапу й туфлі! — падначыла маці.

— Хадземце да стала, сьцямнела ўжо, — запрасіў бацька.

За чаркаю мы й сварыліся далей. Міла, па-сямейнаму. Я яшчэ пасьпявала посуд мяняць.

— І нашто былі гэтыя перастройкі! Усе людзі жылі роўна, хораша! — завёў Аляксандравіч.

— А чаму мы павінны жыць роўна? — не пагадзіўся дзядзя Вася. — Я сем гадоў вучыўся: у Горках, у Менску, у Маскву езьдзіў на падвышэньне кадраў, машыны ганяў, у мяне лісы два разы выдыхалі, ледзь падняўся, не лайдакаваў у калгасе, не круціў быкам хвасты. Вось і не ламлю цяпер ног за каравкі! Як чалавек разумны, дык ніколі не прападзе, і ў вайну жыць будзе.

— Ды справа ў тым, што ты мог бы добра жыць, не хаваючыся ў нашым цокалі ад пракуратуры, ня ліжучы нікому задніцы. Дый нявучаныя людзі таксама трэба каб жылі. Што гэта за парадкі, калі выжываюць толькі самыя спрытныя? А астатнім што — у шворку лезьці? — я перайшла на ты. — Ды і ў мяне было б сёе-тое. Я б сама сабе чарнабурку купіла, дзядзя Вася!

— Любка, ты пралятаеш пры ўсякай уладзе. Ты думаеш, як апазыцыя прыйдзе, дык ты станеш кім-небудзь? Басячка была, басячка і памрэш! Будзеш, бы тая амяла, вісець паміж небам і зямлёю! Паставяць цябе газэтай кіраваць? Не. Газэтай кіраваць будуць тыя, хто й цяпер кіруе, бо гэта праца заўсёды аднолькавая. Трэба працаваць і ўзьбірацца наверх. Як выходзіць, так і ўзьбірацца. Ну, сыдзе ён, а хто будзе раёнамі кіраваць, міліцыяй, абласьцямі? Ты думаеш, мы толькі гарэлку п'ём і дзевак возім? Мы ўладу трымаем, парадак, пры нас краіна працуе! Газ ідзе, машыны едуць, дарогі латаюцца, гаўнакачкі гаўно качаюць, вуліцы мятуцца, і адмарозкі ў турмах сядзяць. А ты толькі сядзіш і вякаеш.

— Я ня ведаю, відаць, вы і праўда вялікія спэцыялісты, але мяне ад вас ванітуе. Чаго вы душыце ўсіх, ёсьць загад ці не? Чаму агэпэшнік Слава Лук'яненка ня можа нават выратавальнікам уладкавацца і з голаду сям'я пухне? Што за гаўно такое?

— Ды таму што калі я ня буду душыць і ціснуць, дык другі будзе, а мяне скінуць і ўсе гізунды выцягнуць. Я бачу, як мой намесьнік пада мной стараецца — яшчэ большая сьвіньня некалі будзе.

— Цікава, — сказала я. — А чаго гэта вы такія сьмелыя? А раптам хто-небудзь пойдзе і дакладзе пра вашыя настроі? Я пайду і напішу, дапусьцім.

— Уй, ідзі! Бяжы, ляці! Хто гэтага ня ведае? — махнуў рукою дзядзя Вася. І тут на экране ўзьнік Вічын шэф — па ўсіх даступных каналах!

— А гэтае сіплоцьце я трынаццаты раз на Новы год слухаць ня буду, хоць задушыце, — сказала я. — Пайду ў альтанку, а як скончыцца камланьне, паклічце мяне, я прыбягу на шампанскае!

Я ўзяла велікодную сьвечку велічынёю з гарбузок, швэдзкія запалкі й пляшку віна. Дзеці захацелі ісьці са мною — паглядзець, як у кустоўі сьвяткуюць ваўкі. Мы запалілі сьвечку і маленькай працэсіяй абышлі двор. Сьвяточны настрой нарэшце разросься ўва мне так, што на іншае й месца не было. Я ўсё бачыла ў іншым сьвятле. Зоры, зімовы хмель на альтанцы, альховы лес, зарасьці абляпіхі й тысу, чорны плот, які бацька пакрыў адпрацаванай алівай, аддаленыя агні вясковых хатаў, трапятаньне сьвечкі. Зь нічога сканцэнтравалася дзіва: загарлапанілі пеўні. Потым забрахалі сабакі.

І я закрычала:

— Ура! Дзеткі! Чуеце?! Пеўні перажываюць, што скончыўся іхны год, а сабакі радуюцца, што іхны настаў. Цяпер усё зьменіцца!

*Працяг будзе.*

# Роздум інквізытара на руінах Акудовіча

Філёзаф **Пётра Рудкоўскі ОП** на старонках часопісу «Наша Вера» адгукнуўся на самы шумны мэтафізычны трактат 1990-х — «Мяне няма» **Валянціна Акудовіча**. Чаму ён палічыў патрэбным гэта зрабіць? Ён адказвае на пытаньне нашага карэспандэнта.



**Пётра Рудкоўскі (нар. у 1978 у Канвелішках, Воранаўскі раён) — філёзаф, тэоляг. Ляўрэат прэміі часопісу «ARCHE» «За сумленнае слова» за 2005 год.**

**...Адкуль Акудовіч ведае, што Бога па-за тэкстам няма? Адкуль ён ведае, што пасьля сьмерці — сьмерць? Ці ён ужо быў памёршы, даведаўся, што нічога пасля сьмерці няма, і цяпер ласкава нам гэта аб'явіў?**

**— Мяне няма, — кажа жывы Акудовіч.**

**— Быў. Ёсць. Буду. — Кажа памёрлы Караткевіч.**

**— Бог памёр, — кажа Ніцшэ.**

**— Ніцшэ памёр, — кажа Бог.**

Ідэя напісаньня «адказу» ўзьнікла падчас майго лажаньня па ўкраінскіх Карпатах увосень 2004 году. Але яна, гэтая ідэя, мела свой крызіс...

Перад выездам у горы я доўга мучыўся: што ўзяць з сабой пачытаць? Заплечнік быў так напакаваны, што можна было спадзявацца ўпхнуць туды ня больш за адну кніжку. Выбар паў на Акудовічава «Мяне няма». Мне тады вельмі хацелася пачытаць нешта зь беларускай філязофіі.

На першым супынку я ўзяўся чытаць... Першае чытаньне скончылася праз паўгадзіны і то скончылася, здавалася б, канчаткова. Акудовічавы разважаньні пра «Слова», пра «Словабога», пра «хітрыкі Яна Багаслова» здаліся мне такімі плыткімі, што я вырашыў: гэтага досыць. Няма сэнсу цягаць гэту пісаніну на сваіх плячах цэлыя два тыдні. Выдрук кнігі я прымацаваў да дрэва з надпісам: «Беларуская філязофія. Бяры й чытай!» Цалкам магчыма, што дзякуючы гэтаму якісь аматар гор зусім выпадкова набыў Акудовічаў твор.

Неўзабаве я заўважыў, што прачытаныя і недаацэненыя мною радкі зь «Мяне няма» нейк настойліва пульсуюць у маім розуме. Адкінутая мною кніга ўвесь час размаўляла са мной. І я, хоцькі-няхоцькі, увайшоў зь ёю ў дыялёг. Менавіта тады і там, на вяршынях Гаврэлы і Попавай гары, узьнік зарыс майго «адказу»... Вярнуўшыся ў Кракаў, я ў першую чаргу кінуўся да кампутара і пачаў сквапна чытаць «Мяне няма».

Я ня ведаю, ці мой «адказ» трэба называць адказам. Тое, што апублікавана ў «Нашай Веры», — гэта ня столькі *адказ*, колькі *пытаньне*. Пытаньне, скіраванае да самога сябе, да Акудовіча і да Госпада Бога... Мяне ўразіў «экзыстэнцыяльны цяжар» гэтага твору. Так, ён быў «няправільны» ўва ўсіх сэнсах: філязафічным, антрапалягічным, псыхалягічным (ня кажучы ўжо пра багаслоўскі!). Але гэта быў той тып «няправільнасьці», які я заўсёды любіў і які заўсёды натхняў да пошукаў і фармуляваньня новых пытаньняў...

Мой «адказ» Акудовічу ёсьць пытаньнем-выклікам у бок клясычнай тэалёгіі, якая прэтэндуе быць *ведай-аб-Богу*. Гэты «адказ» ёсьць дэструкцыяй *багазнаўства* на карысьць *багаслоўя*. «Багазнаўства» імкнецца даць канчатковы адказ на «межавыя пытаньні» (пра быцьцё, пра сэнс, пра замагільнае жыцьцё) і тым самым «замарожвае» ня толькі дыялёг унутры супольнасьці вернікаў, але і дыялёг з Богам! «Багаслоўе» — гэта слова-аб-Богу, дзе «слова» значыць кволае і нестабільнае быцьцё. Слова — гэта аднначасова неспакойная, імпэтная і энэргічная істота, здольная адкрываць у чалавеку ўсё новыя і новыя глыбіні... «Знаўства» стварае ілюзію пэўнасьці і ёсьць простай дарогай да пыхлівасьці і самаўзвышэньня. «Слова» чыніць чалавека больш пакорным і талерантным. «Знаўства» нараджае спакусу *навяртаць* іншых на праўду, а «слова» пабуджае *любіць* іншых у імя праўды... «Веда напаўняе пыхай, а любоў будуе», — гэта словы сьвятога Паўла.

Я асабіста глыбока перакананы, што Акудовічаў бунт супраць Бога ёсьць насамрэч бунтам супраць *багазнаўства* ў тым сэнсе, у якім я тутака прывёў. І я вырашыў папросту трансфармаваць Акудовічаў бунт у крытычную рэфлексію над хрысьціянскай тэалёгіяй. Рэфлексію, якая ў глябальным маштабе ня ёсьць чымсьці новым, але якая ў беларускай часа-прасторы, магчыма, і трохі нетыповая.

Супольнасьць *вернікаў* павінна ажывіць першапачатковае значэньне і інтэнцыю такіх паняткаў, як «вера», «догма», «ісьціна». *Вернікі* павінны паставіць пытаньне, чаму Бог хацеў, каб мы свой дыскурс аб Ім называлі *верай*, а ня ведай, чаму галоўныя тэзы аб Ім называем *догмамі*, а не навуковымі дадзенымі, і чаму *ісьціна* мае сымбалічную структуру, г.зн. пазбаўленая адназначнасьці... Бог хацеў, каб мы насьледавалі Ягонае прыніжэньне, а не імкнуліся да сьвецкага панаваньня і здабыцьця палітычнага ўплыву. Гісторыя Царквы паказвае, як часта Божая воля ігнаравалася ў гэтым пляне...

...Аднойчы я даведаўся, што Акудовіч — гэта ня толькі філёзаф і літаратар, але таксама альпініст і аматар гор. Ці не сымбалічна, што мой «адказ» яму паўстаў менавіта падчас вандроўкі па гарах? Гэта выпадковасьць — сказаў бы Акудовіч. Гэта Прадбачнасьць — сказаў бы я. І тут зноў адкрываецца *прастора рознасьці*, рознасьці, якая патрабуе шмат добрай волі і інтэлектуальнай мабільнасьці.

Артыкул Пётры Рудкоўскага **«Мяне няма: роздум інквізытара на руінах Акудовіча»** чытайце ў №4 часопіса «Наша вера» за 2005 год. У Інтэрнэце на media.catholic.by/nv.

# Сеў дракончык



Сеў дракончык
на бальковнчык,
зьеў фіранку
і вазончык.

Мы дракона не баімся,
Мы зь ім разам весялімся:
— Залятай да нас у хатку,
Будзем есьці шакалядку!

**З украінскае паводле Івана Малкавіча пераклаў Мікола Бугай**

# «Песьні Свабоды»

## выйдуць за месяц да выбараў

Кіраўнік прадусэрскага цэнтру «VoliaMusic» Puper заявіў, што ўсе дасланыя купоны, у якіх самі слухачы прапаноўвалі свой сьпіс «Песень свабоды», ужо апрацаваныя. Праз звычайную і электронную пошту прыхільнікі беларускай музыкі даслалі каля тысячы купонаў, усяго было названа 317 песень. Тых, якія называлі ня менш за тры разы, аказалася роўна сорак.

Дыск «Песьні Свабоды» будзе скамплектаваны і выдадзены 19 лютага.

Лідэры апытаньня — «Радыё Свабода» («Уліс»), «Белакрылы анёл» («Zet») і «Паветраны шар» («N.R.M.»).

Часта называліся песьні з супольных праектаў — «Народнага альбому» і «Я нарадзіўся тут». Але на дыск увойдуць ня ўсе сорак, кажа Puper. Бо ўлічваліся густы ня толькі слухачоў, але й выдаўцоў. Таму, апроч бальшыні названых у рэйтынгу твораў, уладальнікі дыска пачуюць песьні ліцэйскага праекту «Партызанская школа», рарытэтныя творы зь нявыдадзенага супольнага праекту на вершы Ўладзімера Караткевіча. «Песьняў Свабоды» ня будзе ў вольным продажы — дыск атрымаюць тыя, хто ўзяў удзел у яго стварэньні, даслаўшы купоны з сваімі адрасамі.

Таксама «Песьні Свабоды» можна будзе замовіць, праз e-mail pesni2006@tut.by. Puper абяцае, што «Песьні Свабоды» — не апошні такі праект.

Наступным можа быць зборка караоке найбольш вядомых беларускіх песень. Ці нешта іншае? Сваімі ідэямі слухачы могуць падзяліцца на форуме http://music.fromby.net/sliberty.

**СМ**




### Сорак песень, што набралі найбольш галасоў

«Радыё Свабода» («Уліс»)
«Белакрылы Анёл» («Zet»)
«Паветраны шар» («N.R.M.»)
«Мая краіна» («Новае Неба»)
«Радзіма, свабода» («Zet»)
«Маё сэрца» («Partyzone» + Руся)
«Я нарадзіўся тут» («Я нарадзіўся тут»)
«Партызанская» («N.R.M.»)
«Разьвітаньне з Радзімай» («Я нарадзіўся тут»)
«Выйсьце» («IQ–48» і Памідораў)
«Пагоня» («Я нарадзіўся тут»)
«Край ты мой, край» («Народны альбом»)
«Атлянтыда» («UltraВожык»)
«Маё пакаленьне» («N.R.M.»)
«Сонца нам дапаможа» («Я нарадзіўся тут»)
«Я жыў» («Мясцовы час»)
«Сьвятло ў цемры» («IQ–48»)
«Тры чарапахі» («N.R.M.»)
«Мы выйдзем шчыльнымі радамі» («Я нарадзіўся тут»)
«Будзь разам з намі» («Крама»)
«Свабоды мне дай» («Крама»)
«Вясна.by» («Сьцяна»)
«Можна быць» («Сьцяна»)
«Пляц Францыска» («Уліс»)
«Гадзюшнік» («N.R.M.»)
«Зямля» («Мроя»)
«Твая Айчына» («Zet»)
«Прыйдзе іх дзень» («Бонда»)
«Беларусь uber alles» («Neuro Dubel»)
«Гэта Мы!» («Новае Неба»)
«Мая краіна Беларусь» («Безь Білета»)
«Не жадаю» («Чырвоным па белым»)
«Усё будзе добра» («Тарпач»)
«Я рок–музыкант» («Мроя»)
«Быць беларусам» (Pomidor/off)
«Праваджала маці сына» («Палац»)
«Кідай зброю» («З.Ь.М.Я.Я.»)
«Нефармальны беларус» (Сяржук Сокалаў–Воюш)
«Брудная вада» («Tav.Mauzer»)
«Айчына Vicious» («Crusade»)

# Тройчы гросмайстар

Георгі Пятровіч — знакаміты гулец у шашкі родам зь Цімкавіч, але жыве ў Менску жыцьцём сярэднестатыстычнага пэнсіянэра. Яму 65, фізык-тэарэтык, выкладаў у БДУ побач са Станіславам Шушкевічам.

Сп.Пятровіч — адзін з найбольш тытулаваных шашыстаў краіны. Выйграваў завочнае першынство СССР, ня раз быў чэмпіёнам Беларусі. Цяпер — адзіны ў краіне «тройчы гросмайстар»: паводле вэрсій Міжнароднай асацыяцыі расейскіх шашак, Саюзу аматараў шашачнай гульні і ФМЖД (Сусьветная фэдэрацыя шашак).

У X чэмпіянаце сьвету па перапісцы, што завяршыўся ўлетку, Г.Пятровіч заняў 2-е месца. Гуляў ня дзеля грошай — гучны тытул віцэ-чэмпіёна прынёс каля ста даляраў, — а дзеля творчасьці. Тры дзясяткі ўдзельнікаў з краін СНД, Балтыі і Ізраілю шчыльна разьмясьціліся ў турнірнай табліцы. Дасягненьне беларускага гросмайстра тым больш уражальнае, што ў час чэмпіянату ён перанёс інсульт, браў водпуск, але давёў турнір да канца. Разам зь ім гулялі яшчэ двое беларусаў — Сяргей Ісаенка з Мазыра, які ўвайшоў у «дзясятку», і Віктар Яфіменка з Горадні.

**Вольф Рубінчык**



**Ваш ход**

**Г.Пятровіч — К.Саўчанка (Ізраіль).** Партыя з VII чэмпіянату сьвету па завочных шашках-64, вэрсія ФМЖД. Беларус правёў файную камбінацыю. Знайдзіце яе.

**Адказ:** 1. ef6 ge5 2. ef4 ee1 3. cd4 ae5 4. gf2 eg3 5. hb8X.

# У Турын без «турыстаў»

Беларускія надзеі на мэдаль на XX Зімовай Алімпіядзе — фрыстайл, біятлён і Сяргей Далідовіч у лыжных гонках.

Усяго ў Турын выправілася 28 беларускіх спартоўцаў, што выступяць у шасьці дысцыплінах. У Мінспорту вырашылі «турыстаў» гэтым разам на Алімпіяду ня везьці.

Самая прадстаўнічая каманда — па біятлёне: дзесяць чалавек (Алег Рыжанкоў, Аляксандар Сыман, Рустам Валіулін, Уладзімер Драчоў, Сяргей Новікаў; Алена Зубрылава, Кацярына Іванова, Людміла Ананька, Вольга Назарава, Ксенія Зікункова). Нацыянальная каманда па лыжных гонках складаецца зь сямі чалавек: Сяргей Далідовіч, Вольга Васілёнак, Алена Саньнікава, Людміла Шаблоўская, Вікторыя Лапаціна, Кацярына Булаўка. Па фрыстайле — з шасьці чалавек: Зьміцер Дашчынскі, Аляксей Грышын, Зьміцер Рак, Антон Кушнір, Ала Цупер, Асоль Сьлівец. Скакаць на лыжах з трампліну паехалі Максім Анісімаў і Пётар Чаадаеў. У шорт-трэку, канькабежным спорце, фігурным катаньні Беларусь будуць прадстаўляць па адным чалавеку (Юлія Елсакава, Сьвятлана Радкевіч, Сяргей Давыдаў адпаведна). 117 гадзін этэру абяцаюць беларусам каналы «Лад» і БТ.

**Алег Раявец**

## Расклад трансьляцыяў спартовых спаборніцтваў і ўрачыстасьцяў з удзелам беларусаў

**Пятніца, 10 лютага**
Адкрыцьцё Алімпіяды. Пачатак а 21.00.
**Субота, 11 лютага**
Біятлён. Мужчыны. Індывідуальная гонка. 20 км. 14.00.
**Нядзеля, 12 лютага**
Лыжныя гонкі. Жанчыны. 7,5+7,5 км. 11.00.
Лыжныя гонкі. Мужчыны. 15+15 км. 14.45.
Скачкі на лыжах з трampліна. Сярэдні трамплін. 19.00.
**Панядзелак 13 лютага**
Біятлён. Індывідуальная гонка. Жанчыны. 15 км. 13.00.
**Аўторак, 14 лютага**
Лыжныя гонкі. Камандны спрынт. Жанчыны. 12.20.
Біятлён. Спрынт. 10 км (мужчыны). 14.30.
**Серада, 15 лютага**
Шорт-трэк. Жанчыны. 500 м. Пачатак а 20.30.
**Чацьвер, 16 лютага**
Лыжныя гонкі. Жанчыны. 10 км (клясычны стыль). 11.00.
Біятлён. Жанчыны. Спрынт. 7,5 км. 13.00.
Фігурнае катаньне. Мужчыны. Адвольная праграма. 20.00.
**17 лютага, пятніца**
Лыжныя гонкі. Мужчыны. 15 км (клясычны стыль). 11.00.
**18 лютага, субота**
Лыжныя гонкі. Жанчыны. Эстафэта, 4х5 км. 10.45.
Біятлён. Мужчыны. Гонка пераследу, 12,5 км. 15.30.
Скачкі на лыжах з трampліна. Вялікі трамплін. 19.00.
Шорт-трэк. Жанчыны. 1500 м. 21.15.
**19 лютага, нядзеля**
Канькабежны спорт. Жанчыны. 1000 м. 18.00.
**21 лютага, аўторак**
Біятлён. Мужчыны. Эстафэта 4х7,5 км. 13.00.
**22 лютага, серада**
Лыжныя гонкі. Жанчыны. Спрынт. 15.00.
Лыжныя гонкі. Мужчыны. Спрынт. 15.15.
Фрыстайл. Акрабатыка. Жанчыны. 19.45.
**23 лютага, чацьвер**
Біятлён. Жанчыны. Эстафэта 4х5 км. 13.00.
Фрыстайл. Акрабатыка. Мужчыны. Фінал. 19.30.
**24 лютага, пятніца**
Лыжныя гонкі. Жанчыны. 30 км. 12.30.
**25 лютага, субота**
Біятлён. Гонкі з масавым стартам у мужчын і жанчын. 11.00, 13.30.
Шорт-трэк. Жанчыны, 1000 м. 20.45.
**26 лютага, нядзеля**
Лыжныя гонкі. Мужчыны, 50 км. 11.00.
**Закрыцьцё Алімпіяды. 21.00**




**Для фрыстайлістаў апошняй прыступкай да Турына быў чэмпіянат Беларусі ў Раўбічах.**

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Нонканфармізм жывы

**10 лютага** (пятніца) у сядзібе БНФ (Варвашэні, 8) прэзэнтацыя твору Алеся Мары «За элегантную победу», альбо «Адмарозкі». Пачатак а 18-й. У праграме: сатыра, гумар, выступ бардаў.



## КАНЦЭРТЫ



**Беларуская лютня**

**11 лютага** (субота) у Моладзевым тэатры эстрады (Маскоўская, 18) пройдзе канцэрт лютневай музыкі. Выступаюць найвядомейшыя калектывы: гурты «LITUUS», «Крылы часу», лютністы Ільля Кубліцкі, Тацяна Бяльковіч. Пачатак а 19-й.

## ТЭАТРЫ

**Купалаўскі тэатар**
**10** (пт) — «Кім».
**11** (сб) — «Івона, прынцэса Бургундзкая».
**12** (ндз) — «Таполевая завея».
*Ранішнія спэктаклі*
**12** (ндз) — «Афрыка».
*Малая сцэна*
**11** (сб) — «Беларусь у фантастычных апавяданьнях».
**12** (ндз) — «Дзікае паляваньне караля Стаха».

**Тэатар беларускай драматургіі**
**11** (сб) — «Айбаліт, Бармалей, пра жывёл і Брадвэй».
**11** (сб) — «Жанчыны Бэргмана».
**12** (ндз) — «Чорны квадрат».

## СПОРТ

**Тэніс. Кубак Дэвіса. 1/8 фіналу. Беларусь—Гішпанія**
**10—12 лютага (пятніца—нядзеля)**
Менскі футбольны манэж (пр. Пераможцаў, 20). Макс Мірны і Ўладзімер Ваўчкоў супраць Давіда Фэрэра, Томі Рабрэда, Фэрнанда Вэрдаска й Фэлісіяна Лопэса.
10 лютага. Пачатак а 14-й.
11 лютага. Пачатак а 14-й (парная гульня).
12 лютага. Пачатак а 13-й.
Склад параў стане вядомы ў чацьвер.

**Хакей з шайбай. Кубак Эўравыкліку**
10—12 лютага. Горадня. Лядовы палац.

**10 лютага**
Польшча—Украіна. 15.00.
Беларусь—Эстонія. 18.30.

**11 лютага**
Украіна — Эстонія. 13.30.
Беларусь — Польшча. 17.00.

**12 лютага**
Эстонія—Польшча. 13.30.
Украіна—Беларусь. 17.00.

## КІНО НА DVD

**Master Records**

**Норкі**
Трагікамэдыя, Чэхія, 1999, расейскія субтытры, рэж. **Ян Гжэбэк**. У ролях: **Міраслаў Дануціл, Іржы Кадэт.**
Чэхія 1967—1968 гг. Гісторыі каханьня, амэрыканскае кіно — і «праская вясна» вачыма падлеткаў. Сама папулярны чэскі фільм 1990-х.
**Менск, Кісялёва 12, 643-21-08**

## ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

### Субота, 11 лютага

**БТ, 17.25**
«Маем рэчы».
Беларусь, 2006, рэжысэр і вядоўца Алесь Матафонаў.
Тэлевізійная перадача.
Выпуск прысьвечаны матацыклу «Нёман».

**«Лад», 22.05**
«Пасьля жыцьця».
Францыя—Бэльгія, 2002, рэж. Люка Бэльво.
Крымінальная мэлядрама.
Паліцыянт Паскаль падтрымлівае сваю жонку-марфіністку і вядзе вышук... Прэмія «Сэзар» за найлепшы мантаж. Карціна — апошняя частка з крымінальнай трылёгіі Л.Бэльво. Ролі выконваюць: Дамінік Блян, Жыльбэр Мэлькі, Арнэла Муці.

**СТВ, 00.00**
«Слон».
ЗША, 2003, рэж. Гас ван Сэнт.
Драма.
Мінімалістычны твор Гаса ван Сэнта пра разьню ў школе. Прыз Канскага фэсту.

### Нядзеля, 12 лютага

**АНТ, 11.35**
«Гара самацьветаў».
Расея, 2004, рэж. Рым Шарафутдзінаў, Наталя Беразавая, Канстанцін Бронзіт.
Мультыплікацыйны праект паводле казак народаў Расеі. Прэмія «Залаты арол» за найлепшы анімацыйны фільм.

**СТВ, 20.25**
«Вяртаньне Марціна Гера».
Францыя, 1982, рэж. Даніэль Вінь.
Гістарычная драма.
Пасьля доўгіх гадоў у родную вёску вяртаецца Марцін Гер, які калісьці ўцёк у армію. Але ён моцна зьмяніўся і, хаця жонка прызнала яго, недавер да героя расьце... Ролі выконваюць: Жэрар Дэпард'ё, Натալі Бэй, Дамінік Піньён.

**БТ, 22.20**
«Кватарант».
Францыя, 2002, рэж. Аляксандар Кастаньеці, Карантэн Жуліюс.
Авантурная камэдыя.
Легкадумная гісторыя пра шахрая, які жыве ў кватэрах сяброў і пераўтварае іхняе жыцьцё ў вэрхал. Аднойчы ад героя ўсе адвярнуліся, і ён абяцае пачаць новае жыцьцё. Ролі выконваюць: Цітоф, Фрэдэрык Дыфэнталь, Заі Фэлікс.

**АР**

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Каханьне падчас вайны

**Новая Францыя** (Nouvelle France).
Канада—Францыя—Вялікабрытанія, 2004, каляровы, 142 хв.
**Жанр:** эпічная мэлядрама.
**Адзнака:** 7 (з 10).

Сярэдзіна XVIII ст. Англія і Францыя ваююць за кантроль над Канадай. Сялянка й нашчадак багатага роду закахаліся адно ў аднаго.
Нетаропкі гістарычны эпас зацягвае. Дакладныя касьцюмы, палітычныя інтрыгі, бязладзьдзе — ня проста фон для каханьня. Героі — удзельнікі гісторыі, а лёс Новай Францыі, якая пераходзіла з рук у рукі, нагадвае лёс Беларусі. Мары-Лю і Франсуа — гэта беларускія героі падчас вайны, толькі ў канадзкіх рэаліях.
Карціна Жана Бадэна — гарманічная й выверaная. Жарсьці не набываюць характар гістэрыкі; каханьне стрыманае, кожны гістарычны прадмет не крычыць аб раскошы, а проста ёсьць. Гісторыя каханьня ўскладнена ня толькі палітычнымі пэрыпэтыямі: перашкоды чыняць юрлівы інтэндант, нястрыманы лепшы сябра, кюрэ, які разрываецца паміж пабожнасьцю й закаханасьцю (бліскучая роля Жэрара Дэпард'ё).
Акторская гульня Наэмі Гадэн-Віньё (Мары) і Давіда Ля Э (Франсуа) разаб'е не адно глядацкае сэрца, а маленькая Жульет Жасьлен у ролі дачкі Мары дэманструе ўсе прыкметы будучай зоркі.
Можна толькі пашкадаваць, што карціна «Новая Францыя» амаль нікім ня ўбачаная. Але глядач можа выправіць сытуацыю.

**Андрэй Расінскі**

## калі б...




**...улады сапраўды змагаліся зь бюракратызмам.**

«Два мільёны подпісаў! Ён што, хоча каб мы патанулі ў папяровай багне?! Адпаведна з загадам прэзыдэнта аб барацьбе зь бюракратызмам, мы здымаем кандыдатуру Аляксандра Лукашэнкі з удзелу ў выбарах.

**...паглыбленьне беларуска-расейскай інтэграцыі было прызнана алімпійскім відам спорту.**




— Працягваем наш камэнтар. Амэрыканец заглыбіўся ўжо на тры мэтры і хутка дасягне кропкі «пачатак перамоваў аб адзінай валюце». Японскі спартовец — на 2,5 м. Але якую незвычайную тактыку абраў прадстаўнік Беларусі!

**...беларуская апазыцыя вырашыла пазбавіць рэжым хаўрусьнікаў на Блізкім Усходзе.**



Рэдактар: Заходзьце, Лёлік. Вам заданьне: намалюйце нам прарока Мухамада.

## У НУМАРЫ

### Алімпіяда-2006



Хто, што і калі. **Старонка 45.**

### Сяргей Вітушка



«Я грамадзянін Вялікага Княства Любові». **Старонка 39.**

### Златка, луста і хадун




Сетка бістро «Хутка-смачна» беларусізавала назвы сваіх прадуктаў. **Старонка 7.**

### Насустрач сонцу



Выстава фатаграфій Баўгаўзу ў Музэі сучаснага мастацтва. **Старонка 33.**

### Папаўненьне ў саборы



беларускіх сьвятых. **Старонка 36.**

## ЖАРТЫ

— Чаму па артыкуле Крымінальнага кодэксу Беларусі за абразу прэзыдэнта пакарана так мала людзей?

— Таму што ніхто не жадае асабіста адказваць за тое, што і так усе ведаюць.

* * *

Беларускія рок-фэстывалі:

«Рок за баброў у Бабруйску».

«Рок за ракаў у Ракаве».

«Рок за Барысоў у Барысаве».

«Рок за бараноў у Баранавічах».

«Рок за сланоў у Слоніме».

«Рок за жабаў у Жабінцы».

«Рок за кобраў у Кобрыне».

І галоўная падзея году — «Рок за жлабоў у Жлобіне».

## «НН» 100 ГАДОЎ З ВАМІ

**У Думе і каля Думы**

*Засяданьне 5 лютага.* Прыступаюць ізноў да чытаньня закону аб змаганьні з п'янствам. Дэпутатаў сабралося мала; у Думе сонная атмасфэра.

**Вільня.** 7-га лютага раніцай неспадзеўкі памёр дэпутат Госдумы ад Вільні Язэп Монтвіл. Нябожчык быў добра вядомы віленчукам як чалавек, каторы шчыра працаваў для тутэйшага грамадзянства, заводзячы школы, прытулкі для бедных дзяцей.

**«НН». №6. 10 лютага 1911 г.**

Прыватныя абвесткі ў «НН» (ня больш за 15 словаў) дасылайце поштай (а/с 537, 220050 Менск), праз e-mail (nn@promedia.by) або разьмяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Алесю Х. з Краснага.** Ваш запыт перадалі А.Сідарэвічу. Праўда, ён больш да краязнаўцы, чым да гісторыка.

**Зьмітру К. зь Менску.** «Тры аблічча аднэй панны» — нармальны этуд-стылізацыя. Не для «НН». Аддайце ў «Паміж» ці т.п. Калі далей пісаць, раім цьвёрда трымацца пэўнага клясычнага фармату — навэля, раман і г.д. Гэта дысцыплінуе і спрыяе.

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ПАКОЙ

**Тэрмінова здыму** пакой ці аднапакаёвую кватэру прынамсі на 5—6 месяцаў. Студэнтка МДЛУ. Т.: 666-88-09

**Сьціплы хлопец** бяз шкодных звычак здыме пакой. З усімі прапановамі зьвяртацца па тэл.: 8-029-251-25-31

### ПРАЦА

**Прапаную** свае паслугі як знаўца беларускае мовы (рэпэтытарства, выкладаньне, рэдагаваньне і інш.). Т.: 294-13-38. Сьвятлана

### КНІГІ

**Прапаную кнігі**: «Беларуска-польскі размоўнік», К.Акула «Змагарныя дарогі», Насовіч «Слоўнік беларускай мовы» 1870 г., «Беларуска-расійскі слоўнік» Байкова і Некрашэвіча, Беларускі кнігазбор: «Летапісы і кронікі», Ластоўскі, Баршчэўскі, Каліноўскі, Багдановіч, «Філяматы і філярэты», энцыкляпэдыя «Беларуская міталёгія» ды інш. Т.: 753-70-05

**Распаўсюд. Абмен**. Гісторыя, фальклёр, постмадэрнізм, літаратура, псыхалёгія, канфэрэнцыі, круглыя сталы, кнігі, аўдыё, пошта, Інтэрнэт. Зьвяртайцеся на e-mail: alesknigi@mail.ru, 220030, Менск, а/с 195

**Прапаную**: «Беларускі клясычны правапіс», «Нашу Ніву» (факс. выд.), «Матэматычную энцыкляпэдыю», дзіцячыя кніжкі, пісаныя клясычным правапісам, камплект падручнікаў па старабеларускай, старарускай мовах і іншае. Т.: 753-91-96

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914),
Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч,
У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**
© **НАША НІВА**.
Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 112. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

**Наклад 2421.** **Газэта выдаецца 48 разоў на год.**

Нумар падпісаны ў друк 23.00 08.02.2006.

Замова № 758.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а